ЛіМ ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

2 ліпеня 2004 г. №27/4264

АНОНС!

Да 60-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 60-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ўстанова «Літаратура і Мастацтва» выдала кнігу «Наша Перамога». Заказы на яе прымаюцца па тэлефоне: 284-66-71

"Залаты век" працягваецца

Два дні ў Наваградку святкавалі месцічы 960-годдзе свайго легендарнага горада. З гэтай нагоды тут упершыню прайшоў Беларускі фестываль мастацтваў, якому далі назву «Наваградак: «залаты век» працягваецца". Арганізавалі яго Гродзенскі аблвыканкам, Наваградскі райвыканкам і Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі на чале з маэстра Міхалам Фінбергам.

СТАР. 10

Як дзень нараджэння

У гэтага дня — свае суровыя сімвалы. Руіны ды шрамы гераічнай крэпасці над Бугам. Журботныя званы Хатыні. Брацкія магілы ды безыменныя адзінотнікі-абеліскі — горкі ваенны пасеў на мірнай зямлі хлебаробаў. Вечны агонь у сэрцы сталіцы — ля гранітнай стэлы, увянчанай ордэнам Перамогі. Савецкія танкі на п'едэсталах як знакі вызвалення гарадоў. Нескароная моц штыхоў, узнесеных над рукатворным Курганом Славы...

У гэтага дня — свае сімвалы радасці. Кінахроніка доўгачаканага Вызвалення. Чорны герб акупантаў, абрынуты з партала Дома ўрада. Партызанскі парад. Усмешкі, кветкі, танцы пад гармонік. Дакументальныя кадры вяртання ў мірныя будні; пафас творчага і стваральнага жыцця; аднаўленне гаспадаркі, асветы, культуры. Адраджэнне, ці новае нараджэнне спапялёнай вайною сталіцы, а разам з ёю — усёй тагачаснай Беларускай ССР...

І дзень гэты — 3 ліпеня — у агульным і адзіным нашым Беларускім Доме святкуецца ўсенародна. Як гістарычнае свята Вызвалення ад гітлераўскай агрэсіі — яго 60-годдзе мы асабліва ўрачыста, на дзяржаўным узроўні, адзначым заўтра. Як афіцыйнае свята суверэннай Беларусі — Дзень Незалежнасці. Як Дзень Рэспублікі.

Са святам!

У фотакалажы В. Калініна выкарыстаны здымкі П. Кастрамы

КАЛОНКА ГАЛОЎНАГА РЭДАКТАРА

УСЕ ЯНЫ — ГЕНЕРАЛ-ПАЛКОЎНІКІ!..

Заўтра родная Беларусь святкуе шасцідзесяцігоддзе свайго вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. З кожным годам на вуліцах гарадоў, у вёсках і мястэчках усё менш і менш людзей, хто са зброяй у руках абараняў нашу свабоду ад бязлітасных агрэсараў. Ветэраны, параненыя і надломленыя з маладосці, незаўважна, паціху сыходзяць у нябыт. Восеньскім зжоўклым лісцем асыпаюцца яны долу з жыццядайнага беларускага дрэва. А разам з іх адыходам, як ні балюча гэта ўсведамляюць, менее ў нашым агульным асяродку дабрыні, спагады, сардэчнасці, чалавекалюбства... Менее Людзей, як пісаў рускі класік, — з вялікай літары.

Няёмка прызнацца, але неяк раптоўна ў галаву закралася крамольная думка, што надыдзе той дзень, калі апошні з ветэранаў ціхутка адляціць у лепшы свет і... раптам журналісцкая брацця, якая да чарговай гадавіны захоча напісаць пра чалавека з той, Вялікай Айчыннай вайны, кінецца ў адзін-другі бок, каб адшукаць Таго, хто быў абаронцам зямлі бацькоў, — і абяссілена, роспачна спыніцца. Пуста. Жывыя сведкі бязмоўна пакінулі нас... Ці не будзе гэта агульнай трагедыяй? Мне здаецца, што так. Хоць некаторыя запярэчаць: маўляў, нішто не вечнае... Заспакоена прамовяць, што шмат засталося напісаных успамінаў, апавяданняў, аповесцей ды раманаў, вершаў і паэм, багата знята мастацкіх і дакументальных стужак пра Вялікую Айчынную... Усё, здавалася б, правільна. Ды справа ў тым, як мне падаецца, што бальшыня адчуе асабістую віну перад воінамі-абаронцамі, зразумее свой нясплачаны доўг перад імі... Так, шмат у чым мы недадаём ім сёння. І самае галоўнае — звычайнай чалавечай цеплыні, увагі, спачування, у рэшце рэшт. Не ўмеем мы выслухаць ветэрана. Калі хочаце — паслухаць. Здавалася б, што ўжо прасцей! Дык не! Спяшаемся, бяжым, гонімся за прывідным асабістым дабрабытам, заспакаеннем, не хочам прыслухацца да слоў салдата саракавых-ракавых. А калі больш шчыра, то не жадаем турбаваць сваіх сэрцаў перажываннямі ветэрана Вялікай вайны. Мы навучыліся берагчы сябе, ашчаджаць. Ці гэта ўжо такая сутнасць людская?

Я з вялікай радасцю, адкінуўшы ўсе рэдакцыйныя клопаты, слухаў і слухаю паэтаў-франтавікоў Пятра Прыходзьку, Паўлюка Пранузу. Вялікіх людзей, якія і па сённяшні дзень жывуць з водгуллем Той вайны ў сваёй збалелай душы. А яшчэ 26 беларускіх пісьменнікаў загінулі на франтах другой сусветнай. Каля трох дзесяткаў магутных талентаў не вярнуліся дамоў. Апусцелі назаўсёды іх рабочыя сталы.

Пішучы гэтыя радкі, адчуваю віну перад адным чалавекам з баявых палёў, якому недадаў належнай увагі, на якога, як і ў многіх з нас зараз, не хапала часу. Гэта Іван Якаўлевіч Громаў. Радавы салдат Вялікай Айчыннай. Ён ад першых да апошніх дзён служыў народу, прайшоў незлічонымі франтавымі дарогамі, і яму, як нешматлікім шчасліўцам, выпала распісацца на рэйхстагу. Год таму яго не стала. Вялікага воіна, аратая, хлебароба. А ён жа, Іван Якаўлевіч, вярнуўшыся дамоў, змог яшчэ выхаваць васьмярых сыноў і трох дачок. Даць нашаму не такому і шматлікаму народу адзінаццаць воджылкаў. А яны ўжо ў сваю чаргу парасткамі разрасліся па ўсёй Беларусі. Крый Божа, каб нейкая сшалелая куля чыркнула па сэрцы гэтага чалавека, то колькі б абарвалася назаўсёды нітак-жыццяў. Ажно страшна і ўявіць.

Дык вось, быў Іван Якаўлевіч мужам сястры маёй маці. І кожны раз, калі наязджаў я дамоў, то заходзіў у госці, і кожны раз дзядзька Іван парываўся распавесці пра Тую вайну. Але мне, недасведчанаму і неразумнаму, здавалася: што, маўляў, новага ён раскажа, калі я прачытаў столькі кніжак, паглядзеў безліч стужак!.. Самаўлюбёны бядак.

Каюся перад табою, генерал-палкоўнік Громаў (так пад чаркай называў сябе Іван Якаўлевіч). Менавіта зараз да мяне дайшло значэнне гэтых слоў. Бо ўсе яны, хто загінуў і хто вярнуўся дамоў, незалежна ад званняў і роду войскаў — былі генерал-палкоўнікамі Той вайны. І не менш!

І сёння я ўпэўнены, што ўсім нам разам і кожнаму паасобку трэба перагледзець свае адносіны да франтавікоў, увогуле да ўсіх ветэранаў. Абагрэць іх душэўна, навучыцца слухаць іх знямоглыя галасы, запісаць успаміны, знайсці для іх у сваіх сэрцах месца, дзе б захаваліся шчырыя, балючыя словы і былога пехацінца, і вогненнага танкіста, і палявога радыста...

Мо тады дарэшты не ачарсцвеем, не будзем праходзіць міма абяздоленага дзіцяці, не адвернемся перад жабраком, не панурымся ў акно грамадскага транспарту, каб толькі не саступіць нагрэтага месца Чалавеку пенсіённага ўзросту. Давайце, пакуль яшчэ магчыма і ёсць час, вучыцца (ці, калі хочаце, — давучвацца) на іх прыкладзе людскім адносінам адзін да аднаго, любові да бліжніх сваіх. Не на словах, а справамі і ўчынкамі даказваць штодня: мы любім Вас, нашы ветэраны, і Вы для нас прыклад чалавечнасці, мужнасці, стойкасці ў абароне ідэалаў і каштоўнасцей грамадства. Няхай Вы не толькі заўтра, а і кожны дзень адчуваеце сябе Генерал-палкоўнікамі ва ўсім.

І каб роспачны дзень Апошняга ветэрана не абрынуўся на нас нечакана і вельмі ж запозна...

Дабрабыту і здароўя Вам, нашы шаноўныя абаронцы.

Анатоль КАЗЛОЎ

Шлях да Вызвалення

21 чэрвеня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося ўрачыстае адкрыццё кніжна-ілюстрацыйнай выстаўкі "Шлях да Перамогі". Яна прымеркавана да 60-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Выстаўка зладжана сумесна Міністэрствам культуры РБ, Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, Камітэтам па архівах і справаводстве пры Савеце Міністраў РБ, Нацыянальным архівам Рэспублікі Беларусь, Беларускім дзяржаўным архівам кінафотафонадакументаў, Цэнтральным дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва, а таксама архівам навукова-тэхнічнай дакументацыі.

Вёў урачыстасць дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Р.Матульскі. Ён даў слова віцэ-прэм'еру РБ У. Дражыну, які сказаў:

— Галоўнай тэмай усіх сёлетніх мерапрыемстваў у рэспубліцы з'явілася 60-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Па яго святкаванні створаны Аргкамітэт, які ўзначальвае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка. Асноўныя мерапрыемствы пройдуць з 30 чэрвеня па 3 ліпеня. Сённяшняе адкрыццё выстаўкі — з'ява запамінальная. Яна паказвае, які гераічны шлях прайшоў наш народ за чатыры гады вайны, пакуль здабыў Перамогу.

Міністр культуры РБ Л. Гуляка адзначыў, што юбілеем вызвалення Беларусі сёлета жылі ўсе культурныя ўстановы: тэатры, кінастудыя, музеі, бібліятэкі, выстаўкі. Яны кожны пасвойму ўвасаблялі гераічны подзвіг беларускага народа. Гэты год — год культуры Рэспублікі Беларусь у Расіі, наступны — Расійскай Федэрацыі ў Беларусі. Яны азнаменаваны нашай агульнай Перамогай.

Старшыня Камітэта па архівах і справаводстве У. Адамушка гаварыў пра тое, як шмат зроблена гэтым ведамствам да юбілею вызвалення Беларусі — сістэматызаваны дакументы, выдадзены кнігі. Адна з іх — "Вызваленая Беларусь", прэзентацыя якой адбылася тут жа, на выстаўцы.

Выступілі пасол ФРГ у Рэспубліцы Беларусь доктар Хельмут Фрык, кіраўнік дакументацыі цэнтра Аб'яднання Саксонскіх мемарыялаў у памяць ахвяраў палітычнага тэрору К. -Д. Мюлер, які перадаў нашай дзяржаве базу дадзеных на электронных носьбітах аб загінуўшых у канцлагерах савецкіх ваеннапалонных. А іх — 60 тысяч.

Ветэранам вайны, якія прысутнічалі на ўрачыстасці, былі ўручаны кветкі і музычныя кампакт-дыскі на гераічную тэматыку з фонду Нацыянальнай бібліятэкі.

Затым пачаўся агляд выстаўкі. На ёй — больш за 300 кніг і іншых дакументаў: лісты з фронту, падпольныя газеты, публіцыстыка, мемуары, агітплакаты, фотаздымкі, ваенныя карты. Ёсць і арыгіналы вершаў беларускіх паэтаў. З мемарыяльных рэчаў — кавалкі абпаленай цэглы з Брэсцкай крэпасці, каскі, біклагі, палявыя сумкі, кабура, пішучая машынка, друкарскі станок. Усе яны прадстаўлены ў раздзелах "З верай у Перамогу", "Супраць агрэсараў: гады акупацыі", "У фонд Перамогі: антыфашысцкае падполле", "Фронт у тыле ворага: гады партызанскія", "Яны прынеслі вызваленне", "Беларускія пісьменнікі на вайне", "Будзем помніць — будзем жыць!"

Калекцыя фотадакументаў і музейныя экспанаты яскрава адлюстроўваюць рэальнасць ваеннай пары.

Выстаўка будзе працаваць да 21 ліпеня.

Алесь КРУШЫНА

НАПЯРЭДАДНІ ПАДЗЕІ

"Плошча Перамогі"

Грандыёзны творчы праект пад такой назвай прысвячаюць святу вызвалення нашай Айчыны Мінскі гарвыканкам і Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Беларусі. Заўтра ўвечары самая знакамітая і знакавая плошча сталіцы будзе нагадваць вялізную сцэну, вакол якой (так мяркуюць рэжысёры імпрэзы Н.Гаркунова ды У.Ісат) збярэцца 10 тыс. запрошаных гасцей ды 800 VIP-персон.

Гала-прадстаўленне, якое разгорнецца на плошчы Перамогі, будзе складацца з дзвюх частак. Напачатку ў вобразнай тэатралізаванай форме ажывуць драматычныя і радасныя эпізоды Вялікага Вызвалення — праз успаміны ветэрана мінулай вайны, праз яго аповед, звернуты да ўнучкі: адмовіўшыся ад традыцыйных вядучых, арганізатары імпрэзы выводзяць гэтых абагульненых персанажаў на першы план, даверыўшы іх ролі народнаму артысту Беларусі Генадзю Гарбуку і сямігадовай артыстцы Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Кіры Кірычэнцы. Другая частка прадстаўлення паяднае лепшыя творчыя калектывы, майстроў мастацтваў, маладых салістаў краіны. А 23-й гадзіне вечаровае неба над Мінскам расквеціць святочны феерверк. А канцэрт працягнецца, можна сказаць, да надыходу новага дня — амаль да першай гадзіны...

Тэлевізійная версія праекта "Плошча Перамогі" будзе трансліравацца падчас прадстаўлення на спецыяльныя шырокафарматныя экраны, размешчаныя на фасадах прылеглых дамоў. І практычна кожны жыхар нашай краіны зможа спрычыніцца да падзеі на святочнай плошчы, паглядзеўшы імпрэзу ў "жывым" эфіры а 22-й гадзіне заўтра, 3-га ліпеня.

С.Б.

Пад ліпеньскім небам

Заўтра Беларускі дзяржаўны музычны тэатр парадуе сваіх шматлікіх прыхільнікаў вялікай — з 14 да 20 гадзін! — імпрэзай, што разгорнецца пад адкрытым небам. У імправізаваную сцэнічную пляцоўку ператворацца тэатральныя прыступкі. Будзе прадстаўлена новая праграма «Песні Перамогі» з удзелам лепшых салістаў, пад жывое гучанне аркестра (галоўны дырыжор Аляксандр Сасноўскі). Затым рэй павядуць героі аперэт — у папулярных тэатралізаваных фрагментах. А завершыцца вечар эстрадным шоу. Дарэчы, гэта не першая творчая акцыя самага папулярнага сталічнага тэатра, якую ён прысвяціў юбілею Вызвалення. «Песні Перамогі» ўжо неаднойчы гучалі ў тэатральнай зале для шаноўных нашых ветэранаў — напрыклад, і ў першы ліпеньскі дзень. А вось 2 ліпеня, г.зн. сённяшнім вечарам, на сцэне Дзяржаўнага музычнага адбудзецца паказ класічнай савецкай аперэты «Севастопальскі вальс» на музыку К.Лістова. Аб'ектыў фотарэпарцёра зафіксаваў адзін з эпізодаў гэтага спектакля...

С.Б.

Фота В.Стралкоўскага

Гэта — было...

Новая работа беларускіх кінематаграфістаў «Яшчэ пра вайну» рыхтуецца да шырокага паказу. А вось сталічныя журналісты нядаўна пазнаёміліся ўжо з гэтай камернай маламетражнай стужкай, знятай рэжысёрам-дэбютантам Пятром Крывастаненкам (сцэнарый Ізольды Кавелашвілі паводле твораў Віктара Канецкага, аператар-пастаноўшчык Таццяна Логінава, мастак-пастаноўшчык Ігар Хруцкі, касцюмы — Ірына Пуцяціна, кампазітар Алег Елісеенкаў). У галоўных ролях — Святлана Кажамякіна, Вера Палякова, Анатоль Кот.

Да назвы фільма можна дадаць: «... І яшчэ пра каханне». Таму што ўвасоблены ў ім эпізод ваеннага жыцця маладых людзей, чые пачуцці выпрабоўваюцца чаканнем і рэўнасцю ў даволі недарэчных акалічнасцях. Пэўна, гэта было ў гады вайны, і неаднойчы. Было гэта і ў кіно. Але якое тут магло атрымацца сваё памастацку пераканальнае слова, скажам, на фоне класікі сусветнага кінематографа «Ляцяць жураўлі»? Ці загучала ўрэшце з экрана «новая песня пра галоўнае»? З часам на гэтыя пытанні адкажуць нашы самыя дасведчаныя і спанатраныя прыхільнікі дзесятай музы...

С.ВЕТКА

Фота А. Дзмітрыева

Кіно для ўсіх

Кінатэатры Мінска падрыхтавалі святочную праграму да 60-годдзя вызвалення Беларусі і Дня незалежнасці краіны. Лепшыя мастацкія і дакументальныя фільмы пра вайну будуць дэманстравацца ў сталічных кінатэатрах. Адбудуцца прэм'ерныя паказы работ айчынных кінематаграфістаў: мастацкага фільма "Яшчэ пра вайну" ў кінатэатры "Кастрычнік" і хроніка-дакументальнай ленты "Прарыў" — у "Міры".

Падарункам для ветэранаў і мінчан 3-га ліпеня стане бясплатны паказ у кінатэатры "Кастрычнік" стужкі "Яшчэ пра вайну". А кінатэатр "Цэнтральны" ў гэты святочны дзень запросіць ветэранаў на прэм'еру хранікальна-дакументальнай кінастужкі Анатоля Алая "У двух кроках ад гільятыны". Уваход таксама будзе вольны.

В.К.

РОССЫП НАВІН

•

Гарадская мастацкая галерэя твораў Леаніда Шчамялёва запрашае на выставу "Памяць". Галоўным акцэнтам у раскрыцці тэмы вайны мастаком Л. Шчамялёвым з'яўляецца, як ні дзіўна, любоў: любоў да жыцця, да чалавека. Вайна раскрываецца праз усё, што для яе супрацьлеглае, што не з'яўляецца ёю і, на думку мастака, мацнейшае за яе.

Уся серыя работ Леаніда Шчамялёва, якая складае экспазіцыю выставы "Памяць" — апасродкаванае, непрамое раскрыццё ваеннай тэмы. Мастак адштурхоўваецца ад суб'ектыўнай асацыяцыі, імгненнага ўражання, у якім асабіста для яго нечакана адлюстравалася трагічная прыгажосць і драматычная напружанасць моманту ваеннай гісторыі.

Выстава будзе працаваць да 15 верасня.

Таццяна БЕМБЕЛЬ

•

Не так даўно па ініцыятыве кафедры ўзроставай і педагагічнай псіхалогіі факультэта сацыяльна-педагагічных тэхналогій у педуніверсітэце імя Максіма Танка адбыўся міжнародны навукова-практычны семінар "Праблемы развіваючай і карэкцыйнай работы з дзецьмі і падлеткамі".

Падчас семінара, які прайшоў пад дэвізам "Дзеці — нашы сябры і настаўнікі!", падкрэслівалася важнасць ранняга выяўлення адхіленняў у фізічным і псіхічным развіцці дзяцей, гаварылася пра магчымасці і перспектывы іх выхавання, навучання і рэабілітацыі ва ўмовах спецыяльнай дашкольнай установы. Адбыўся жывы, цікавы абмен думкамі і вопытам па праблеме развіваючай працы з дзецьмі паміж удзельнікамі і гасцямі семінара — дзеячамі навукі і спецыялістамі-практыкамі.

Завяршыўся семінар публічнай лекцыяй доктара псіхалагічных навук, прэзідэнта Міжнароднай асацыяцыі прэ- і перынатальнай псіхалогіі Людвіга Януса (Германія).

Н.Д.

•

Выдавецтва Логвінаў прапануе кнігу герменеўтычнай драматургіі Сяргея Кавалёва "Стомлены д'ябал", куды ўвайшлі аднайменная п'еса, а таксама драматычныя творы "Легенда пра Машэку", "Звар'яцелы Альберт", "Тарас на Парнасе". Выкарыстоўваючы сюжэты, матывы, вобразы беларускай літаратуры, Сяргей Кавалёў стварае свой непаўторны драматургічны свет, выпрабоўвае старадаўнія рамантычныя гісторыі сумнай іроніяй нашых дзён.

В.К.

У Нацыянальным выставачным цэнтры "БелЭКСПА" была разгорнута экспазіцыя выставы "Дызайн — біржа-2004", дзе быў прадэманстраваны ўзровень айчыннага дызайну амаль што ва ўсіх сферах вытворчасці. Вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны, якія рыхтуюць прафесійных дызайнераў, прадставілі тут асноўныя раздзелы экспазіцыі: дызайн-адукацыя, паліграфія, інфармацыйныя тэхналогіі, вонкавая рэклама, прамысловы дызайн, дызайн інтэр'ера, экспадызайн, архітэктура і будаўніцтва, дызайн вопраткі і абутку, галантарэі.

У праграме выстаўкі працавалі семінары па стратэгіі дызайнерскіх рашэнняў.

Янка ЗАЛУЖНЫ
Фота аўтара

"Мусі-пусі", альбо Трыумф пошласці

Узіраюся ў дзень сённяшні і думаю: відаць, сапраўды пошласць людская — бессмяротная. Чым жа яшчэ, як не бессмяротнасцю, растлумачыць, што з гадамі яна не толькі не здае сваіх пазіцый, не марнее, а, наадварот, набіраецца моцы, перарастае ў цынізм і ўседазволенасць і паўсюдна ўжо ладзіць свой трыумф.

...Заходжу ў мясцовае аддзяленне сувязі. На вітрыне — суквецце паштовак з надпісамі-пажаданнямі (пераважна, гэта "вершы", надрукаваныя да таго ж з арфаграфічнымі памылкамі). Асаблівую ўвагу звярнулі на сябе дзве з іх. На першай — дзве прыгажуні у, так бы мовіць, віртуальных купальных касцюмах. Прыгажуні, паклаўшы рукі на пэўныя месцы, пажадліва ўсміхаюцца. Унізе чытаю: "Ты такой клёвый, и мы хотим..."

Другая паштоўка "з сюрпрызам". На знешнім баку буйнымі, кідкімі літарамі: "Ты любишь все натуральное?" На развароце: "Ну и как тебе моя натура?" "Натура" ўяўляе сабою яшчэ адну прыгажуню, якая, амаль прыпаўшы долу, выстаўляе на ваш агляд тое, што здаўна выстаўляюць адна адной вясковыя кабеты ў час сварак, жадаючы як наймацней абразіць непрыяцельку.

— І адкуль жа ў вас такія цікавыя паштоўкі? — пытаюся. — Ці не камерсанты падкінулі?

— Ды не. Белпошта недзе закупіла. Здаецца, у Расіі.

Абедзве паштоўкі пушчаны ў свет нейкім ИПР "Стезя". Мастакі — Манько і Божына (Расія)...

На вуліцы сустракаю хлапчука гадоў шасці-сямі. У руках — цукерка, якую ён раз-пораз кладзе ў рот і з асалодаю смокча. Упадабаная дзіцем цукерка мае форму белага чалавечага чэрапа з чорнымі ямінамі-вачніцамі.

— Ты дзе гэта прыдбаў такое?

— А вунь там, у булачнай.

У булачнай, апроч цукерак-чарапоў, пакупнікам прапануецца "жевательный мармелад" у выглядзе агідна тоўстых чырвоных чарвякоў: прыемнага апетыту!

Толькі ж апетыт пасля такіх "стымулятараў" — самі разумееце. Каб хоць трохі ўзняць яго, уключаю радыё. Сваё роднае, беларускае:

Муси-муси-пуси,
миленький мой,
Я горю, я вся во вкусе
рядом с тобой.
Я, как бабочка, порхаю
над всем
И никаких проблем,
Ночью я тебя съем.

Нішто сабе "бабочка"! Ці не хаўрусніца той самай спявачкі, якая, жадаючы пазбегнуць граху канібальства, прасіла адвезці сябе ў Гімалаі? Гэтая — не просіць. Яна ўжо і ахвяру сабе абрала. Гэтага самага "муси-пуси».

Перш чым націснуць кнопку тэлевізара, з асцярогаю праглядаю праграму. Хвілін колькі адлачываю. Але тут... Вы ўжо здагадаліся? Так, вядома ж, яна, нечымі вялікімі грашыма і нашымі шматпакутнымі нервамі аплачаная, рэклама! Ды разумею я, што "ў наш цяжкі час, час рынкавай эканомікі..." і г.д. Толькі ж навошта прынікацца да "прикольного вкуса", "оттянись по полной", "круче не бывает"? Навошта так абражаць чалавечую годнасць, выстаўляючы на публічны паказ тое, што выстаўляць недаравальна?

Ды што тут гаварыць пра такія "дробязі", як годнасць і прыстойнасць, калі пры дзейснай дапамозе сродкаў масавай інфармацыі і некаторых "творцаў" даўно ўжо сарвана покрыва нават з найвялікшых таямніц прыроды — кахання і смерці. Тут увогуле даходзіць да кашчунства. Асабліва жудасна, калі такога кшталту "чтиво" прапануюць дзіцячыя выданні.

Трымаю ў руках майскі нумар "ежемесячного развлекательно-познавательного" часопіса "Клякса" (падпісны індэкс 00611, заснавальнік і выдавец ОДО "ВУАЛ", Мінск). Наконт "познавательности" гаварыць увогуле не хочацца, што ж тычыцца "развлекательности", то юны чытач можа "развлечь" сябе аповедам пра маленькага наіўнага людаеда Васю, які ўпотайкі ад сваіх сяброў, таксама людаедаў, "пробрался в столовую и, оттяпав еды (у трупа — **В.К.**) ногу, тут же съел, никому ничего не сказав".

Далей дзеянне адбываецца так, як у апавяданні Л. Талстога "Костачка". Толькі маленькі людаед выкінуў костачку (ад чалавечай нагі) на могілкі, а калі ягонае "свавольства" выкрылі, "заплакал" и убежал к себе в морг".

Там жа ўбачыце вы і "комікс", дзе ў адказ на просьбу злоўленай рыбкі адпусціць яе ў ваду, хлапец адказвае: "Да пожалуйста!" — і кідае рыбку ў кацёл з кіпенем. Але сапраўдным "перлам" развлекательно-познавательного" можна назваць "Страшную колыбельную", дасланую, як і шмат іншых "твораў", чытачамі і ўхваленых рэдакцыяй "Кляксы":

Спит убитая лисичка,
Спит задушенная птичка,
Обезглавленный хомяк.
Посмотри, как он обмяк,
Утонув в зловонной жиже,
Спят в аквариуме мыши...

і г.д. яшчэ некалькі строф.

"Ды не бяры ты да сэрца, — сказаў мне адзін знаёмы, калі я з абурэннем паказала "Кляксу". — Гэта ж проста "страшылкі", ну, жарты ў іх цяпер такія".

Жарты?! Відаць, штосьці не так у мяне з пачуццём гумару.

"Кожны зарабляе грошы, як можа". А тое, што калечыцца дзіцячая псіхіка, топчуцца этычныя, маральныя нормы, не так ужо і важна. Гэта ўжо потым, калі "дзеткі", мастацкі густ і стыль паводзін якіх будзе фарміравацца спачатку пад уплывам "страшылак" і "коміксаў", а пазней — "баевікоў", "трыпераў" і "крутой эротыкі", пачнуць абураць нас жорсткасцю ды цынізмам, мы пачнём шукаць першапрычыну.

Нехта скажа, што я перабольшваю, што роля літаратуры ў фарміраванні светапогляду і характару чалавека не такая ўжо і вялікая, а можа, і ўвогуле ніякая.

Толькі вось цяжка ўявіць сабе, што паслухаўшы ці прачытаўшы, напрыклад, "Зорку Венеру", юнак выйдзе на вуліцу і пачне чыніць гвалт. А пасля якога-небудзь "супербаевіка"? Тут ужо адказаць адназначна нельга.

Пра сустрэчу Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі я прачытала ў артыкуле Уладзіміра Саламахі "Усё залежыць ад усіх нас" (ЛіМ "№ 21). Кіраўнік дзяржавы сказаў, што "ўсе бібліятэкі, тым больш школьныя, павінны гэтыя выданні (беларускія часопісы — **В.К.**) падпісаць. Гэта рашэнне павінна быць у Беларусі навечна... А каб чыталі, трэба знаёміць, як у хаце-чытальні".

Толькі ж на сённяшні дзень (чэрвень, 2004) у многіх школах як не было, так і няма ніводнага перыядычнага беларускамоўнага выдання. Не адведзены ў школьнай праграме і спецыяльныя гадзіны для азнаямлення вучняў з беларускімі літаратурна-мастацкімі творамі.

А пра гэты выпадак, які можа надацца выдумкай ці анекдотам, расказала мне сяброўка-бібліятэкарка: "Забегла я па нейкай справе ў адзін з кабінетаў аддзела культуры. Якраз у пятніцу. Заадно пацікавілася, ці быў сёння "ЛіМ". Дык ты ведаеш, што мне адказалі? "Не, сёння ў нас нікога чужога не было".

Адметнай і, здавалася б, станоўчай рысаю беларускіх пісьменнікаў лічыцца сціпласць. Але ці не празмерна яны сціплыя, нашы пісьменнікі? Ці многія пачуюць іхнія галасы ў вэрхале нахабнай і навязлівай рэкламы бульварнай літаратуры, літаратуры, параўнанай кімсьці з вядомых пісьменнікаў, удзельнікаў "круглага стала" "Звязды" (здаецца, Раісай Баравіковай) з рэдзенькім супчыкам, пры працяглым ужыванні якога страчваецца здольнасць арганізма засвойваць паўнаякасную ежу.

Ёсць і яшчэ адна "навала", пра якую нельга больш маўчаць — "самапальныя" кніжкі. У памянёным ужо артыкуле Уладзіміра Саламахі гаворыцца: "Бясконца выдаваемыя самадзейныя кніжкі так званай прозы і паэзіі ў прыватных выдавецтвах за грошы аўтараў або спонсараў, прадукт, які новаспечаныя "пісьменнікі" раздаюць сябрам і знаёмым, проста зневажае само паняцце творчасці". Ад сябе дадам: кніжкі тыя запаланяюць і дзяржаўныя бібліятэкі, а некаторыя з бібліятэк робяць шумныя прэзентацыі "шэдэўраў". І яшчэ. Даволі часта такія кніжкі маюць не толькі нізкі мастацкі ўзровень, але і падаюць як норму самыя нізкія памкненні і бэсцяць усё тое, з чаго ўласна і пачынаецца чалавек.

Валянціна КАДЗЕТАВА

Абсягі

ВІЦЕБШЧЫНА

У гонар Льва Сапегі

У 1604-м годзе канцлер Вялікага княства Літоўскага Леў Сапега заснаваў у Талачыне касцёл, адкрыў школу і бальніцу для бедных. У 1796-м годзе касцёл быў ператвораны ва уніяцкую, а ў 1804-м годзе — у праваслаўную Свята-Пакроўскую царкву. Яна дзейнічае і па сённяшні дзень, унесена ў спіс важнейшых гістарычных помнікаў архітэктуры Беларусі і ахоўваецца законам. Сёлета ў кастрычніку адбудуцца вялікія святочныя мерапрыемствы з нагоды 400-годдзя заснавання гэтага храма.

Вядомы мясцовы мастак і скульптар Юрый Палякоў вырашыў увасобіць у скульптуры вобраз выдатнага дзяржаўнага дзеяча мінулага Льва Сапегі, які шмат зрабіў для росквіту дзяржавы, для людзей, у тым ліку і для талачынцаў. Словы творцы не разыходзяцца са справай: работа над скульптурай завяршаецца. Гэты своеасаблівы помнік Льву Сапегу, як паведаміў Юрый Палякоў, плануецца ўстанавіць у райцэнтры паблізу Свята-Пакроўскай царквы напярэдадні яе слаўнага юбілею.

Прыз кінааматару за фільм пра вёску

Нядаўна ў Мінску прайшоў VIII нацыянальны фестываль аматарскіх фільмаў, арганізаваны сталічнай відэакінастудыяй "Таццяна". Прыза за лепшы фільм і дыплома журы фестывалю за грамадзянскую пазіцыю, мужнасць і суперажыванне ўдастоена работа талачынскага кінааматара Анатоля Шнэйдара "Паміраючая вёска".

"Гэта, па сутнасці, роздум пра лёс беларускіх вёсак на рубяжы XX і XXI стагоддзяў, усхваляваны аповед пра адну з вёсак раней знакамітага калгаса "XVIII партз'езд" Талачынскага раёна, — кажа аўтар фільма Анатоль Шнэйдар. — Сёння ў тутэйшай вёсцы Парэчча меней чым 50 жыхароў, а раней было болей за 500. Многія дамы забіты дошкамі, а іншых ужо няма і ў паміне. У некалькіх дзесятках метраў ад вёскі пралягла сучасная добраўпарадкаваная аўтастрада Масква — Мінск — Брэст — Варшава — Берлін — Парыж. Дзень і ноч імчацца па ёй у розных накірунках аўтамабілі розных марак з розных краін свету. А ў Парэччы час нібыта спыніў свой бег. Вёсачка засталася на задворках мінулага стагоддзя, марудна патухае..."

Антон БЯРОЗКІН

МАГІЛЁЎШЧЫНА

"Я абараняў свой слаўны горад"

Дырэкцыя магілёўскага кінавідэапрадпрыемства "Позірк" сумесна з гарадскім саветам ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, Цэнтралізаванай сістэмай бібліятэк вобласці арганізавалі акцыю "Я абараняў свой слаўны горад". Яна праводзілася ва ўсіх кінатэатрах абласнога цэнтра на працягу тыдня.

У ходзе яе правядзення школьнікі сустрэліся і пазнаёміліся з маліўчанамі, якія ўлетку 1941-га года на подступах да Магілёва капалі супрацьтанкавыя равы, змагаліся ў падполлі, перажылі фашысцкую акупацыю.

Таксама ў кінатэатрах разгорнуты кніжныя выставы адпаведнай тэматыкі, дэманстраваўся хроніка-дакументальны фільм Іосіфа Вейняровіча "Магілёў. Дні і ночы мужнасці".

Міхась БОЛІНСКІ

Трасцянец — вечны боль

Трасцянецкі лагер смерці з'яўляецца буйнейшым месцам масавага знішчэння людзей на тэрыторыі Беларусі ў гады нямецка-фашысцкай акупацыі. У Трасцянцы загінулі савецкія ваеннапалонныя, падпольшчыкі і партызаны, жыхары Мінска, вязні турмаў і канцлагераў.

Назва "Трасцянец" аб'ядноўвае некалькі месцаў: урочышчы Благаўшчына і Шашкоўка, вёску Малы Трасцянец, якая за 10 км ад Мінска па Магілёўскай шашы.

Восенню 1941 года ва ўрочышчы Благаўшчына нямецкія акупанты пачалі рыхтаваць гіганцкія могілкі. З лагера ў Масюкоўшчыне былі прыгнаны сотні чырвонаармейцаў, якія сталі працаваць на зямельных работах. Былі вырыты дзесяткі глыбокіх траншэй.

У пачатку 1942 года ў ваколіцах Малога Трасцянца мінскай паліцыяй СД была створана падручная гаспадарка. Для яе абслугоўвання быў арганізаваны працоўны лагер. У ім дзейнічалі млын, лесапільня, слясарная, сталярная, шавецкая майстэрні. Умовы жыцця і працы ў лагеры былі вельмі цяжкія. Людзі жылі ў дашчаных бараках, харчаваліся адыходамі. За нязначнае парушэнне рэжыму ішла смяротная кара. На тэрыторыі лагера былі ўстаноўлены стацыянарныя шыбеніцы. Лагернай адміністрацыяй перыядычна дэманстраваліся паказальныя групавыя экзекуцыі.

У сярэдзіне 1942 года ў Беларусь рэгулярна пачалі ісці транспартныя сродкі з Вены, Кёнігсберга, іншых гарадоў, якія перавозілі яўрэяў Аўстрыі, Венгрыі, Германіі, Польшчы, Чэхаславакіі. Тых, хто валодаў пэўнымі прафесіямі, адбіралі і накіроўвалі ў малатрасцянецкі лагер. Астатніх на крытых грузавіках везлі да траншэй у Благаўшчыну, дзе расстрэльвалі з пісталетаў і аўтаматаў.

Да восені 1943 года абстаноўка на Усходнім фронце прымусіла акупантаў замесці сляды масавых знішчэнняў людзей. Былі створаны спецыяльныя каманды, якія прыступілі да эксгумацыі пахаванняў у Благаўшчыне. Траншэі былі ўскрыты, астанкі людзей спалены і змаскіраваны. Ва ўрочышчы Благаўшчына знойдзены 34 ямы-магілы, у якіх закапаны 150 000 чалавек.

У Шашкоўцы гітлераўцы пабудавалі печ для спальвання трупаў расстраляных людзей. Печ працавала штодзённа. Трупы складваліся ў штабелі з дрывамі і падпальваліся. Усяго ў Шашкоўцы было знішчана і крэміравана 50 000 чалавек.

Перад адступленнем фашысты спалілі ўсю дакументацыю і разбурылі частку пабудоў.

У 1941—45 гг. у трасцянецкім лагеры смерці было загублена 200 000 чалавек. За гады вайны больш людзей знішчана толькі ў Асвенціме, Майданеку і Трэблінцы.

Аб гэтым страшным злачынстве нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Беларусі сведчаць і дакументы, якія захоўваюцца ў Беларускім дзяржаўным архіве кінафотафонадакументаў. На фотаздымках — зверствы фашыстаў, якія чынілі яны ў лагеры смерці Малы Трасцянец, фотакопія плана пабудоў і ўнутраны выгляд памяшканняў, дзе адбываліся масавыя спальванні грамадзян, забаронны знак пры ўваходзе ў лагер і інш.

Кіналетапіс "Трасцянецкі лагер смерці" (1944 г.) расказвае аб вызваленні вязняў і працы камісіі па расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх акупантаў.

Тамара РЫМАШЭЎСКАЯ,
старшы навуковы супрацоўнік аддзела інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў БДАКФФД.

Напрамак: Беларусь — рэйхстаг

Паэты Паўлюк ПРАНУЗА і Пятро ПРЫХОДЗЬКА вызвалялі нашу рэспубліку і распісаліся на рэйхстагу

Вялікая Айчынная вайна... Тры гады жыцця на акупаванай тэрыторыі, тры гады змагання з ворагам. Неймаверныя пакуты, голад, холад, смерць. І якой радасцю свяціліся вочы ўсіх жыхароў Беларусі, калі іх пачалі вызваляць нашы воіны. А самі салдаты адчулі на роднай зямлі, што Перамога блізка, і яны абавязкова распішуцца на сценах рэйхстага — гэтага страшнага логава фашыстаў.

Хуткаплынны час імкліва бяжыць, як тая рака, аддаляе векапомныя падзеі, якія ўскалыхнулі ўвесь свет. За амаль 60 гадоў пасля Вялікай Айчыннай вайны вырасла не адно пакаленне, алею, на жаль, значна парадзелі шэрагі ветэранаў. Ды што казаць, калі ў беларускай літаратуры засталіся літаральна лічаныя пісьменнікі-франтавікі.

Сёння пойдзе размова з паэтамі, якія вынеслі ўсе цяжкасці Вялікай Айчыннай. Гэта — Паўлюк (Павел Кузьміч) Прануза (86 гадоў) і Пятро (Пётр Фёдаравіч) Прыходзька (84 гады). Наш карэспандэнт Яўген ХВАЛЕЙ сустрэўся з імі.

— Вас, ветэранаў вайны, засталося вельмі мала. Час няўмольны... Хоць дзеля такіх, як вы, нават часу варта было б затрымацца, не так спяшыць. Бо вы не толькі здабывалі Перамогу, але і ўславілі яе ў сваіх творах. Раскажыце, адкуль пачаўся ваш баявы шлях?

ПРАНУЗА: — Пачынаў я з Бранскага фронту, з-пад вядомай Курскай дугі. Гэта, па сутнасці, блізка ад Беларусі, якую пасля мы вызвалялі. А служыў я ў 3-й гвардзейскай Рэчыцка-Брандэнбургскай Чырванасцяжнай ордэнаў Кутузава і Суворава зенітна-артылерыйскай дывізіі. З ёй я прайшоў 5170 кіламетраў, пражыў 911 дзён і начэй. Зенітчыкамі дывізіі збіты 504 варожыя самалёты. У мяне да сённяшняга дня захоўваецца карта баявога шляху нашай дывізіі.

ПРЫХОДЗЬКА: — Бачыце, якое супадзенне: і я, як Паўлюк Прануза, пачынаў з Бранскага фронту, з той жа Курскай дугі. Але мы служылі ў розных дывізіях. Наша дывізія ўваходзіла ў 38-ю армію пад камандаваннем Маскаленкі. Я быў палітруком роты. Натхняў байцоў, часам і вершамі, на пераможныя атакі.

— Ішло паспяховае наступленне нашых войск. Усё хутчэй набліжалася такая дарагая і родная вам беларуская зямля. Дзе кожны з вас ступіў на яе, святую!

ПРАНУЗА: — Гэта было на Гомельшчыне. Мы наступалі праз мой родны горад Добруш, дзе я нарадзіўся. Забег на сваю вуліцу імя Войкава, зайшоў у хату. А там — бацька і маці. Радасць, абдымкі, пацалункі... Жывы сын, жывыя бацькі — хіба гэта не шчасце?! Немцы не спапялілі нашу вуліцу, а іншыя дыміліся. Прыбеглі суседзі, давай распытваць пра сваіх сыноў-воінаў, можа, бачыў дзе... Я затрымаўся дома зусім нядоўга, мы рушылі далей, ішло наступленне...

ПРЫХОДЗЬКА: — Я ў час вызвалення ступіў на беларускую зямлю ў лістападзе 1943 года. Гэта адбылося каля Лоева. Мы фарсіравалі Дняпро — і вось яна, родненькая... Хацелася цалаваць яе, прыціснуцца грудзьмі. Недалёка адтуль была і мая радзіма — Хоцімск. Я ўспамінаў, як пакінуў гэты гарадок яшчэ да вайны. А цяпер, здавалася, на крылах да яго паляцеў бы... Але і Лоеў быў мне вельмі блізкі — бо гэта ж наш беларускі горад. Я, па сутнасці, увасобіў вядомы верш Пімена Панчанкі — ён называўся "Байцу, які першы ступіць на беларускую зямлю". Калі я быў не першы, то адзін з самых першых...

— Успомніце найбольш запамінальныя для вас эпізоды вызвалення Беларусі?

ПРАНУЗА: — Іх было шмат. Я вызваляў Гомель, Рэчыцу, на захадзе Беларусі — Нясвіж, Баранавічы... У Нясвіжы, ля славутага замка Радзівіла нас сустракалі жыхары хлебам-соллю. Неслі ўсё, хто што мог... Абдымаліся, цалаваліся... І ніколі не думаў я, што з гэтым гарадком параднюся пасля вайны на доўгія гады... Я тут выкладаў аж да пенсіі беларускую мову і літаратуру ў школе і ў педвучылішчы імя Якуба Коласа.

ПРЫХОДЗЬКА: — Запамінальныя эпізоды? Ну, вядома ж, гэта сустрэчы жыхароў вызваленых раёнаў. Але быў у мяне і кур'ёзны эпізод, які ледзь не скончыўся сумна. Нашы так хутка наступалі, што ў некаторых месцах салдаты пераходзілі фронт. Было і ў мяне такое. Пасля інструкцыі камісара дывізіі нас адпусцілі па сваіх размяшчэннях. Мне трэба было прайсці праз лясок у бліндаж сваёй роты. Але я пайшоў іншай сцежкай і перасек лінію фронту. Чую "гер-гер" за спінай... Я ціхенька назад. Трапіў на сцежку і знайшоў сваю роту.

— Як адлюстравалі вы ў сваіх творах доўгачаканы дзень вызвалення роднай зямлі?

ПРАНУЗА: — Праз усю маю творчасць праходзіць тэма вайны. Да самых апошніх дзён яна не пакідае мяне. У мяне шмат выйшла кніжак. Але самы дарагі мне рукапісны зборнічак, пераплецены мною яшчэ ў час вайны. Тут стаяць даты: 1941—1945. Вершаў — добрая сотня. Я пісаў іх у перапынках паміж баямі. Зборнічак добра пажаўцеў за 60 гадоў. Але адгарні яго — і да цябе вернецца ваенная маладосць. У зборніку ёсць вершы, напісаныя ў час вызвалення Беларусі. Вось адзін з іх:

Боль узяў мяне ў палон трывала.
Урачы з ім уступілі ў бой.
Я магу зрабіць яшчэ нямала.
Быць хачу на перадавой.
Я — салдат гвардзейскае
закваскі.
Замець веку мне у твар мяла.
У жыцця я не вымольваў ласкі,
Крых не браў з ягонага стала.

ПРЫХОДЗЬКА: — У мяне нямала вершаў, нават ёсць паэмы на ваенную тэматыку. Пісаў і ў час вызваленчага паходу праз Беларусь. Верш "Мая маладосць" датаваны 1944 годам.

Можа, шмат што забудзецца
ў свеце
З усяго, што было і што ёсць.
Ды ніякія сцюжа і вецер
Не завеюць маю маладосць.

Яна ў шлях мяне доўгі імкліва
Праз усе перашкоды вяла.
У каханні такой сарамлівай,
А ў паходах адважнай была!

— Вайна кацілася на Захад. Вызвалена была ўжо Беларусь. Далей ішлі іншыя краіны. Набліжаўся Берлін... Раскажыце, як вы заканчвалі вайну!

ПРАНУЗА: — Я са сваёй 3-й гвардзейскай прайшоў Беларусь, Польшчу, Германію... Аж да Берліна. За Берлін былі жорсткія баі. Гэта была апошняя надзея Гітлера. І ён агрызаўся, як мог. Нарэшце Берлін быў узяты. Мы ўсе марылі распісацца на сцяне рэйхстага. Падышлі да рэйхстага, а там вялікімі літарамі было выведзена: "ЖУКАЎ". Так славуты маршал-пераможца распісаўся. Над верхам і ўнізе — сотні подпісаў нашых воінаў. Не было месца, адзін аднаго падсаджвалі, каб распісацца. Падсадзілі і мяне. Я напісаў: "Беларус з Гомельшчыны П. Прануза". Радасць была неймаверная!

ПРЫХОДЗЬКА: — У мяне крышку інакш адбылося. Вайну мы пачыналі з Пранузам з аднаго фронту, а заканчвалі па-рознаму. Я сустрэў Перамогу пад Прагай. Прагу вызваляў фронт пад камандаваннем маршала Конева. Як я ўспрыняў Дзень Перамогі? У ноч з 8 на 9 мая я дзяжурыў па рэдакцыі дывізійнай газеты, дзе быў адказным сакратаром. Прымаў зводку па радыё спецыяльна для газет. У ёй было паведамленне, што нямецкае камандаванне капітулявала. Запісаўшы зводку, скамандаваў: "Пад'ём!" усёй рэдакцыі нашай газеты. Усе ўскочылі: "Што такое?" Я ўсклікнуў: "Вайна закончылася!" Што было: радасць, ускрыкі, скокі! А затым пасля Перамогі мяне паслалі працаваць у Берлін. Я быў ваенным карэспандэнтам газеты "Савецкая Армія". І тады ж на фоне пераможанага рэйхстага сфатаграфаваўся і распісаўся на сцяне. Хоць і са спазненнем.

— І апошняе пытанне. У кожнага пісьменніка ёсць свой любімы твор. Які ён у вас, у прыватнасці, пра вайну!

ПРЫХОДЗЬКА: — Самая дарагая для мяне — паэма "Вішнёвы агонь". Яе ўхвалілі ў свой час Аляксей Пысін, Антон Бялевіч, Анатоль Вялюгін, які надрукаваў у часопісе "Полымя". Чаму яна мне дарагая? Таму, што ў аснову яе пакладзены сапраўдны жыццёвы факт. У паэме гераіня Кацярына Пінчук, а ў жыцці — Антаніна Цішчук. Яна была паланянка. Мы сустрэліся з ёй у час паходу. Незвычайна прыгожая была жанчына. Я пайшоў далей на Захад, а яна засталася ў сваёй вёсцы. Аб тым, як аўтар-герой шукаў яе пасля вайны — уся паэма...

ПРАНУЗА: — Мне дарагія зборнікі вершаў "Памяць, памяць...", "Рукі салдата", "Сустрэча", у якіх вайна жыве ўсім сваім эмацыянальна-філасофскім зместам. Але зноў жа паўтаруся — найдаражэйшы для мяне пажоўклы рукапісны зборнічак, складзены ў час вайны. Яго пакуль нікому не аддаю, нават музеям. З яго і прачытаю адзін з маіх любімых вершаў:

Не экскурсантам,
а салдатам,
Абпалены агнём баёў,
З гранатамі і аўтаматам
На дах рэйхстага я ўзышоў.

Здалося: сонца стала ніжай,
Каб і святла, і ласкі даць.
А тых, хто ў бойках
лютых выжыў,
Узняць, падняць,
расцалаваць...

Лёс каваў і зброяй і адвагай,
Пераможным крочыў
бальшаком.
Сорак пяты. На сцяне
рэйхстага
Гнеўна распісаўся я штыком.

На здымку: Пятро Прыходзька, Мікалай Аляксеў і Міхась Калачынскі ў рэдакцыі газеты "Савецкая армія" (1975 г.).

Гандлёвая (Камунальная) набярэжная. Канец 1940-х гг. Фотарэпрадукцыя А. Малевіча

У Траецкім прадмесці. Фота К. Дробыша

Мой Мінск — маё жыццё

Своеасаблівыя ўспаміны мінчаніна, які пражыў амаль 75 гадоў у сталіцы Беларусі

Сярод усіх маіх мінскіх уражанняў, уражанняў дзяцінства, важнае месца займаюць 8 гадоў, пражытых у доме Якуба Коласа. Здарылася так, што наша сям'я засталася без жылля. Даведаўшыся аб гэтым, Якуб Колас сказаў бацьку, якога ён ведаў яшчэ з дарэвалюцыйных часоў (бацька мой быў зямляк паэта, родам з панямонскіх мясцін):

— Ігнат, перабірайся з сям'ёю да мяне. Я пабудаваў добрую хату. Жыві, колькі спатрэбіцца...

Так мы апынуліся ў гасцінным доме песняра па Вайсковым завулку.

Я любіў чытаць. Седзячы на падваконніку, глытаў кнігу за кнігай. Аднойчы Якуб Колас падышоў да мяне:

— Ты, я гляджу, шмат чытаеш. А як?

— Імкнуся чытаць як мага болей. І вашы кніжкі — таксама. Вось чытаю "Дрыгву"...

— Не ганіся за колькасцю. Чытай і задумвайся: ці правільна паступіў герой. Што б ты зрабіў на яго месцы? Ацані кнігу ў цэлым.

Гэтыя мудрыя словы паэта я запомніў на ўсё жыццё. Яны дапамаглі мне пасля, калі я стаў старшакласнікам, а затым — студэнтам.

Вясной 1934 года надарыўся такі выпадак. Мы з бацькам ішлі праз сад "Прафінтэрн" (зараз парк Горкага). Раптам заўважылі на сцяжыне жоўты гадзіннік. Далі аб'явы — ніхто не адклікнуўся. Што рабіць? Бацька паслаў мяне да старэйшага сына Коласа Даніка, студэнта-хіміка. Ён зрабіў пробу:

— Дык гэта ж золата!

Занеслі знаходку ў "Таргсін". Узамен атрымалі палку каўбасы, галоўку галандскага сыру, па баначчы чырвонай і чорнай ікры. Паклікалі сям'ю Коласа і наладзілі святочны стол.

У 1937 годзе мы атрымалі кватэру. "Жыві, колькі спатрэбіцца" вылілася амаль у дзесятак гадоў жыцця, як у Хрыста за пазухай. З высокім пачуццём пакідалі мы ўтульны дом Коласа. Хоць не хацелася расставацца са шчырымі гаспадарамі.

Памяць захавала да дэталяў успамін аб "Прафінтэрне" — парку Горкага. Невялічкі лес у цэнтры Мінска на беразе нетаропкай Свіслачы. На пагорку — сосны, ніжэй — ліпы, бярозы, таполі. Дарэчы, да сёння збераглася альтанка, створаная рукамі чалавека. Добрай душы садоўнік пасадзіў ўкруг дзесяць ліпавых дрэў. Зараз яны тоўстыя і высокія. У іх цяньку добра адпачываецца.

Той час быў для мяне шчаслівай парой. Але шчасце не бывае бясконцым. За ім, як заўважыў Шэкспір, ценем ходзіць бяда. Так здарылася і ў нашай сям'і. У сярэдзіне 20-х гадоў бацька разам з К. Шапялевічам і М. Калінічэнкам напісалі падручнікі "Чырвоная змена" і "Чырвоная Беларусь". Кнігі ўхвалілі, некалькі разоў яны перавыдаваліся. Але пачаліся сталінскія рэпрэсіі. Адзін за другім знікалі кіраўнікі рэспублікі. Застрэліўся старшыня ЦВК Чарвякоў. Старшыня Саўнаркама Галадзед скінуўся з трэцяга паверха турмы і загінуў. Прапалі сакратары ЦК КПБ (б) Гікала і Шаранговіч.

Бацьку выклікалі на партыйны сход, на "чыстку". Яго закідвалі градам пытанняў.

— Чаму вы змясцілі артыкул аб сельскай гаспадарцы капіталістычнай Даніі? Навошта прапагандуеце кулацкую гаспадарку Язэпа Мароза?

Бацька адказваў: Данія — адна з перадавых краін Еўропы. Чаму ж не павучыцца ў яе? А калі друкаваліся радкі аб віцябляніне Я. Марозе, ніхто не разглядаў яго як кулака. Наадварот, гэты наватар атрымаў тры ўрадавыя граматы, быў выбраны членам ЦВК Беларусі. Не грэх было б выкарыстоўваць і яго вопыт.

— А вашы табліцы аб сухотах? З іх вынікае, што колькасць хворых на сухоты расце, а па смяротнасці ад гэтай хваробы мы займаем першае месца ў свеце.

— Так яно і ёсць, — адказваў бацька. — Гэтыя звесткі агучваліся на IX з'ездзе КПБ (б).

Паслухмяны сход-судзілішча прагаласаваў за выключэнне бацькі з партыі, у якой ён з'яўляўся актыўным членам з 1918 года, за палітычныя і нацдэмаўскія памылкі. А што значыла гэтае выключэнне? Бацьку зволілі з Наркамасветы, ён стаў працаваць шараговым настаўнікам.

У чэрвені 1941 года пачалася вайна. Уночы з 21 на 22, падчас фашысцкага нападу, бацьку забраў "чорны воран", адвёз у турму на Валадарскага, дзе шмат было падобных небарак. Час ад часу іх кудысьці вывозілі. Надышла і бацькава пара. Яго павялі разам з іншымі за горад па Чэрвеньскім тракце. Ля Чырвонага ўрочышча (зараз там аўтазавод) начальнік канвою падаў каманду: "Стой!" У бацькі абарвалася сэрца. Але тое, што здарылася далей, інакш як цудам не назавеш. Камандзір раптам сказаў:

— Я маю загад расстраляць вас. Але не верыцца мне, што вы — ворагі. Таму ідзіце, хто куды хоча. Мая парада — на Усход, бо Мінск вось-вось можа быць захоплены фашыстамі...

Бацька і яшчэ некалькі чалавек накіраваліся на Усход, астатнія вярнуліся ў Мінск. Толькі ў Мічурынску на Тамбоўшчыне скончыліся бацькавы пакуты. Ён быў без дакументаў. У штабе дывізіі ўбачыў свайго сябра Я. Сініцкага. Той і пацвердзіў, што схуднелы, у абшарпаным адзенні чалавек ёсць Ігнат Мазур. Бацька стаў вайскоўцам. У дзеючай арміі знаходзіўся да апошняга дня вайны і закончыў яе ў Празе.

А цяпер крышку аб маёй маці. Пра яе я не ведаў нічога ўсю вайну аж да ліпеня 44-га года. Я быў на фронце. Гнаў думкі, што яна загінула. Калі ўдавалася, чытаў газеты. У адной з газет вычытаў інфармацыю: "Учора ў Мінску адбыўся парад і мітынг партызан. На ім выступіла настаўніца Лідзія Папова". Сумненняў не было: гэта мая мама. Яна жывая! Мне ўдалося атрымаць вольную на 5 дзён, і я, нібы на крылах, паляцеў да маці. Ехаў у перапоўненых вагонах, на іх дахах, спадарожных грузавіках. За Кіевам пачаліся беларускія лясы, якія не раз бачыў у сне. Колы выстуквалі: Гомель, Бабруйск, і вось нарэшце Мінск. На пераездзе таварняк прыпыніўся: адсюль блізка наш дом. Я саскочыў з цягніка і пабег... Аслупянеў, калі ўбачыў на месцы нашага дома чорны абвуглены кораб. Увайшоў у пад'езд — на сцяне сажай выведзеныя словы: "Іна і Сева! Я жыву на вуліцы Свярдлова, 20, кв. 5". Адзін кідок — і я адчыняю дзверы мамінага пакойчыка. Маці не адразу пазнала мяне. Пяць гадоў прайшло, як расталіся мы. Вельмі папатрапаў мяне фронт. А калі мама зразумела, што гэта я, пахіснулася, слёзы пабеглі з яе вачэй. Усю ноч мы прагутарылі, не звёўшы павек. Мама ўспамінала, як жудасна ёй было ў чорныя гады акупацыі...

Назаўтра быў зваротны шлях — я ехаў зноў на свой 3-і Украінскі...

Усевалад МАЗУР,
кандыдат эканамічных навук,
заслужаны работнік
вышэйшай школы Беларусі

КУФАР-NEWS

У новы год — з новым беларускім каналам

Старшыня Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Уладзімір Мацвяйчук нядаўна далажыў Прэзідэнту краіны аб тым, што ў хуткім часе ў рэспубліцы з'явіцца новы тэлевізійны канал "Беларусь ТВ". Згодна паведамленню БЕЛТА, канал плануецца аснасціць сучасным абсталяваннем, а вяшчанне пачнецца пад канец 2004 года — на пачатку 2005-га.

Да таго ж, па словах кіраўніка тэлерадыёкампаніі, зараз ідуць перамовы наконт падпісання пагаднення з Усерасійскай дзяржаўнай тэлевізійнай і радыёвяшчальнай кампаніяй. Асаблівая ўвага скіроўваецца на супрацоўніцтва з рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі. Вядома, што на працу на новы канал будзе запрошаны высокапрафесійны персанал, але ці будуць сярод яго прадстаўнікі расійскіх каналаў — пакуль невядома...

"Даліна памяці" Трасцянца

У мемарыяльным комплексе "Трасцянец", што пад Мінскам, павінна з'явіцца "Даліна памяці". На яе стварэнне падалі заяўкі каля 20 удзельнікаў, сярод якіх творчыя калектывы архітэктараў, дызайнераў, мастакоў, прычым не толькі з Беларусі, але і з іншых краін. Бо конкурс, аб'яўлены Мінгарвыканкамам і Міністэрствам культуры РБ, лічыцца міжнародным, а працы прымаюцца да 1 ліпеня. Вядома, што за лепшыя прапановы будуць атрыманы прэміі: першая — 20 тыс. долараў, другая і трэцяя — 10 і 5 тыс. долараў адпаведна.

Патрабаванні да ўсіх удзельнікаў аднолькавыя: каб найбольш выразна і дакладна рашыць ландшафтную тэрыторыю, зрабіць на ёй акцэнт. Сам комплекс ствараецца для захавання памяці пра больш як 200 чалавек, знішчаных фашыстамі ў 1941 — 1945 гадах падчас Другой сусветнай вайны ў вёсцы Малы Трасцянец. Тут пахаваны прах савецкіх людзей, удзельнікаў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху, ваеннапалонных, палітычных вязняў нямецкіх турмаў і лагераў, яўрэяў з Аўстрыі, Польшчы, Германіі, Чэхаславакіі. Міжнародны лагер смерці Трасцянец — аб'ект еўрапейскай гісторыка-культурнай прасторы. Вядома, што ён быў самым вялікім на тэрыторыі СССР па колькасці тых, хто загінуў у ім.

ВІКа

У дзесятым міжнародным дзіцячым пленэры, прысвечаным слаўнай патроцы нашай радзімы, найпадобнейшай Еўфрасінні Полацкай, які працаваў у рэспубліканскай мастацкай галерэі, прынялі ўдзел каля 500 дзяцей з усіх краін СНД, Прыбалтыкі і дальняга замежжа.

Пасля заключнай выставы пленэру работы ўдзельнікаў раздадзены ў дзіцячыя дамы, бальніцы і школы-інтэрнаты.

Фота Я. Залужнага

ЗАХАРАВА, 19

РЭДАКЦЫЙНА-ВЫДАВЕЦКАЯ ЎСТАНОВА «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

прымае да разгляду:

выдавецкія праекты самай шырокай тэматыкі;

выканае ўвесь спектр рэдакцыйна-выдавецкіх паслуг;

арганізуе рэкламу і прэзентацыю выданняў.

Вул. Захарава, 19,
тэл.: 284-66-71.

Выдавецкая ліцэнзія — ЛВ № 570 ад 23 кастрычніка 2002 года, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Пішыце на адрас: 220005, Мінск, вул. Захарава, 19, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва"; e-mail: minsk@lim.by

Адрас у Інтэрнеце — www.lim.by

Кнігі "Мы — беларусы", "Беларусь мая, Песня мая...", "Чарнобыльская рана" і "Чырвоная кніга для дзяцей" можна набыць у Рэдакцыйна-выдавецкай установе "Літаратура і Мастацтва". Тэлефоны аддзела маркетынгу і рэкламнай дзейнасці: 284-66-71; 284-84-62.

Псіхалогія вайны

Перш чым пачынаць размову пра псіхалогію, трэба разабрацца з сутнасцю такой з'явы, як вайна. Кажучы проста, гэта фізічнае знішчэнне сабе падобных па загадзе дзяржавы, значыць патрабаванне нейкай сістэмы. Навошта патрэбна гэтае знішчэнне? Як няўпэўнены ў сабе чалавек спрабуе выклікаць павагу і страх праз знявагу, пагарду, жорсткасць у дачыненні да іншых, так і сістэма. "...Калі яна здольная да самаўдасканалення, гэта звычайна мірная сістэма: яна знаходзіць рэсурсы і сэнс існавання ў самаразвіцці. Калі ж да самаразвіцця не вельмі схільная, тады ўмацоўваецца праз расшырэнне..."[1]

Такім чынам, сістэма спрабуе схаваць комплекс непаўназначнасці, прымусіўшы ўсіх думаць, што яна моцная і самадастатковая, калі ўжо нападае на іншых. Гэта падман, ілюзія. Злачынства робіцца праз рукі звычайных людзей. Адарваўшы селяніна ад зямлі і плуга, гараджаніна ад працы на прадпрыемстве, дзяржава выпраўляе грамадзян на смерць часта толькі каб задаволіць свае амбіцыі. Простаму чалавеку няма ніякай карысці, цікавасці і жадання пакідаць сям'ю, малых дзяцей дзеля спраўджвання нейкіх абстрактных ідэалаў. І рэч нават не ў тым, што на вайне могуць забіць (хоць і нельга так казаць). Вельмі ўражвае тое, што ў такіх жорсткіх абставінах поўнасцю мяняецца светапогляд чалавека (часцей не ў лепшы бок), разбураецца псіхіка. Тое, што ў нармальным жыцці лічыцца забароненым, амаральным: забойства, знявага асобы, — тут з'яўляецца нормай жыцця, без гэтага проста немагчыма выжыць. Нейкі псіхалагічны бар'ер скасоўваецца, чалавек сыходзіць з тармазоў, не ведае ўжо, што добра, што не.

Але ў якой ступені адбываецца змяненне? Які адбітак накладвае на асобу час, у якім яна жыве? Ці можам мы сказаць, што вайна па-рознаму дзейнічае на людзей, якія жывуць у пачатку стагоддзя і ў канцы? Ці з'яўляюцца апошнія больш развітымі і разумнымі, ці вучыць іх чаму-небудзь горкі вопыт бацькоў і дзядоў, паклаўшых свае косці на палях змаганняў? Паспрабуем знайсці адказы на старонках беларускіх твораў мастацкай літаратуры. Бо яна, пераасэнсоўваючы і ўзважваючы тое, што было, можа стаць найкаштоўнейшым матэрыялам для доследаў. Звернемся, напрыклад, да такіх твораў, як "На імперыялістычнай вайне" Максіма Гарэцкага і "Цынкавыя хлопчыкі" Святланы Алексіевіч. Яны расказваюць пра адчуванні чалавека на вайне ў пачатку стагоддзя, падчас імперыялістычнай вайны, і амаль у канцы, у час вайны ў Афганістане.Творы напісаны ў форме запісаў аднаго чалавека ("На імп. вайне") і споведзяў многіх ("Цынкавыя хлопчыкі"). Такім чынам, інфармацыя больш каштоўная, бо атрымана яна з першакрыніц — ад саміх удзельнікаў.

Не важна, хто і калі пачынае вайну. Заўсёды метады яе развязвання несправядлівыя, бо служаць для вырашэння палітычных, а не агульначалавечых праблем. Часта пад ілжывым покрывам быццам бы высокіх ідэй распальваецца варожасць, нянавісць і сеецца смерць. Будзем абапірацца на канкрэтныя прыклады.

Імперыялістычная вайна. Пачатак — 1914 год. Повад: забойства Аўстра-Венгерскага наследніка ў Сараеве. Германія абвінаваціла ў гэтым Сербію, развязалася вайна. Расійская імперыя, у склад якой уваходзіла і Беларусь, пад лозунгам дапамогі братняму славянскаму народу адправіла свае войскі ў тую ж Германію. Інтарэсы на самай справе вырашаліся эканамічныя, тэрытарыяльныя. А людзі захлыналіся ў крыві, абараняючы інтарэсы ніколі не бачанай імі Сербіі. Жыццё-бадзянне, жыццё пад кулямі, жыццё ад абстрэлу да абстрэлу. І як не засумаваць разам з Лявонам Задумам, галоўным героем запісак пра імперыялістычную вайну: ...Усё гэта цяпер згіне, як згіну, можа, і я сам... ва славу... ва славу... чаго? Вызвалення "малых" народаў? А ці вызваліцца мой народ? Што яму дасць гэтая вайна? Лепей не думаць..."[2] Нават вера, якой гандлявалі ўлады, можа пахіснуцца ад усведамлення несправядлівасці таго, што адбываецца на зямлі. Лявон Задума: "Я веру і не веру, што над гэтымі парванымі кішкамі ёсць нешта, што завецца богам..."

Вайна ў Афганістане (1979—1987 гг.). Прычына яшчэ больш недарэчная, але, безумоўна, як след пададзеная ў прыстойнай форме. ЗША высадзілі свае войскі ў В'етнаме. СССР вырашыў "дагнаць, папярэдзіць, перагнаць". Саюзныя войскі амаль адразу ж апынуліся на тэрыторыі Афганістана. Мэта: навучыць "правільна" жыць, пабудаваць камунізм. А паколькі сустрэлі лозунгі насцярожана і неахвотна, загадана навязаць патрэбны лад сілай: што ж яны, дурні, не разумеюць, што адсталі ад цывілізацыі. Мы іх хуценька навучым. Потым кіруючыя ўлады быццам бы апомніліся, назвалі вайну "брэжнеўскай авантурай", а тады... Тады маладыя 18-гадовыя хлапчукі падманам, а бывала і добраахвотна кідаліся абараняць ідэалы, насаджаныя з дзяцінства, ідэалы, у якія верылі. Верылі да таго моманту, як убачылі, што прынесла іхняе "вызваленне": гора, жах, смерць, сіроцтва, нянавісць. Зразумеўшы немагчымасць вырвацца з пекла, знаходзілі іншыя ідэалы. Паслухаем аднаго з герояў Святланы Алексіевіч: "Што мы абаранялі? Рэвалюцыю? Не, я ўжо так не думаў, я ўжо ўнутрана разрываўся. Але пераконваў сябе, што мы абараняем нашы ваенныя гарадкі, нашых людзей."

Так, вера знікае. Застаецца толькі адно жаданне — выжыць. Бо недахоп ежы, адзення, бруд і вошы — нязменныя спадарожнікі войнаў. У барацьбе за выжыванне знікае залішняя інтэлігентнасць і сарамлівасць. Калі на вайне Лявон Задума не мог без пачуцця агіды глядзець на снеданне з агульнага бака, які ніколі добра не мылі, то падчас баявых дзеянняў даводзілася з прагнасцю есці і не такое. "Мяса раздзіраюць на порцыі пальцамі, імі тут жа і смаркаюцца "ў кулак". Звараныя порцыі раскладваюць на падсцелены мяшок, а часам нават на шынялі..."

Амаль 60 год нічога не змянілі ў побыце вайскоўцаў. "Дзяржава паслала грамадзян, амаль дзяцей, ваяваць, не паклапаціўшыся пра самае элементарнае... Савецкі салдат — самы танны салдат. Самы цярплівы. Так было у 41-ым годзе... І праз 50 гадоў гэтак жа... Чаму? Самі сябе абувалі, апраналі, кармілі. У забітых наёмнікаў забіралі курткі, кітайскія штаны, трусы. Усё бралі..."

Аглушаныя дэвізамі і громкімі словамі, хлопцы вучыліся забіваць. Цяжкі грэх ператварыўся ў будзённую працу. "Ужо нам было брыдка і цяжка чакаць і не страляць. Не было ўжо ні цікавасці, ні захаплення, а толькі — упорчывая, напружаная і якаясь злая праца." Ці нармальна гэта, ці не — вырашыць складана. Вось што кажа герой Святланы Алексіевіч: "Я ні разу не чуў, што на вайне забіваць нельга. Я ведаў, што судзяць толькі тых, хто забівае ў мірны час. Яны — забойцы, а ў вайну гэта называецца інакш: "сыноўскі абавязак перад Радзімай", "святая мужчынская справа", "абарона Айчыны".

Чалавек механічна націскае на курок, нягледзячы, хто там: стары, дзіцё, жывёла... І нават вярнуўшыся дадому, вайскоўцы ўспамінаюць гэтыя звычкі. Нехта не падабаецца, хоча абразіць — забіць.

Спачатку пужаюць абстрэлы, віскат снарадаў. Потым прывыкаеш. І тут раскрываецца ўвесь чалавек, які ён ёсць. Кожны няўдалы крок — твой боль да канца дзён. Так лёгка праявіць маладушнасць. Ратуючыся ад куль, Лявон Задума скінуў з насілак мёртвага таварыша, Шалапутаў, вальнапісаны, хаваўся ў хаце пад выглядам параненага; воіны-афганцы быццам бы ў бойцы забівалі таварышаў, з якімі пасварыліся... Але ёсць на вайне і сапраўдныя героі. Дастаткова ўспомніць камандзіра, які мужна загінуў у баі. Тут узнікае спрэчнае пытанне. Хто такі герой? Той, хто больш забіў? Узгадаем развагі Лявона Задумы: "Якія ж мы героі... Георгіеўскія кавалеры? Каб не баяліся кары, каб не вайсковая дысцыпліна, ніводзін бы з нас, пэўна, з месца не зрушыўся б... На сучаснай вайне — усе героі ці, лепей кажучы, няма герояў, а ёсць болей ці меней дысцыплінаванае быдла". Роздумы працягваюць "воіны-інтэрнацыяналісты": "Загад: караван знішчыць... Пераходзім на знішчэнне... За гэта, ці што, нам уручалі ордэны ад удзячнага афганскага народа?!" Нямногія вытрымліваюць жорсткі ваенны рэжым: страчваюць розум, канчаюць жыццё самагубствам. А тыя, што застаюцца, вымушаны цягнуць крыж успамінаў, уздрыгваючы ад кожнага шоргату. Пакуты ў адзіноце, бо няшчасце, як ні парадаксальна не зближае, а раз'ядноўвае людзей. Кожны за сябе. Мала таго, што салдаты, якія збольшасці хварэлі на дыстрафію, пакутавалі самі, яны знарок прыніжалі таварышаў. Дзедаўшчына страшная панавала. Маладзенькіх білі, не шкадуючы, прымушалі рабіць усё па гаспадарцы за 20—30 чалавек. Квітнела прастытуцыя, хваробы. Высокамаральныя, людзі ўсё ж кідаліся ў гэты бруд ад адчаю.

Фотакалаж А. Патапенкі

Але насуперак усяму не губляюць вайскоўцы і простых чалавечых пачуццяў: пачуцця гумару, кахання. Праўда ўсё тут своеасаблівае. Кожная сустрэча ў любы момант можа стаць апошняй.

Але не для ўсіх вайна — пакута. Былі і такія, што нажываліся на ёй, займаліся спекуляцыяй. Уяўленне сучаснікаў пра Афганістан:

— Дублёнку прывёз? Магнітафон японскі прывез? Нічога не прывёз... Хіба ты ў Афганістане быў?

Тое ж і на імперыялістычнай вайне: "Некаторыя свой паёк прадаюць крамнікам, каб зляжыць грошы і вярнуцца дамоў у лакіраваных ботах, элегантамі.

У час вайны чалавек марыць толькі аб тым, каб гэта хутчэй скончылася. Але, вось дзіва, звязаўшыся з гэтым раз у жыцці, цяжка ўявіць сабе мірнае існаванне. Адчуваеш сябе "лішнім" чалавекам. "Хацелася працягу. Прасілася кудынебудзь, дзе вайна ідзе. Не мірыцца душа з гэтым жыццём. Не хоча. На вайне нават лепей. Там апраўданне ёсць усяму. І добраму, і страшнаму".

Аналізуючы творы, прыходжу да высновы, што вайна ў канцы стагоддзя ўсё ж іншая. Больш хітрая. Чалавек выкручвае такія агідныя махінацыі, якія не сустракаліся раней. Імперыялістычная вайна была несправядлівая, як і любая іншая, але яе не выракліся. Вайну ж у Афганістане хутка аб'явілі несправядлівай. І паспяшаліся хуценька забыцца, кінуць у цень тых, каго падманулі, тых, хто паклаў на ёй сваё жыццё ці здароўе. Успамінаюцца словы інваліда: "Калі вайна несправядлівая, дык вярніце мне ногі!.." Пакалечаныя душы і сэрцы таксама не вылечыш. Пра гэта нельга забыцца, нельга проста сказаць: прабачце, палітычная памылка. Як нельга сказаць гэтага пакрыўджаным маці, стогн і плач іх раздаецца над чорнымі крыжамі.

Трэба ўсвядоміць: вайна аднолькавая. Яна нясе толькі смерць, пакуты адным, узбагачэнне іншым. Хай змяняецца зброя, хай ваенная тэхніка развіваецца далей і далей, хай знаходзяцца ўсё больш дасканалыя апраўданні. Дастаткова паглядзець у мінулае і сучаснае, каб услед за ахвярамі ўсіх войнаў паўтарыць: не — вайне!

Святлана СТАХОЎСКАЯ,
студэнтка факультэта журналістыкі

[1] — С.Алексіевіч, "Цынкавыя хлопчыкі". Мінск, "Беларусь", 1991г.

[2] — М.Гарэцкі, "На імперыялістычнай вайне". Мінск, "Мастацкая літаратура", 1985г.

ВЫДАННІ

У выдавецтве Беларускага таварыства "Кніга" выйшаў зборнік успамінаў сяброў Васіля Быкава "Наш Быкаў" (укладанне Генадзя Бураўкіна). Сярод тых, хто ўзгадвае пра славутага пісьменніка, — Мікола Аўрамчык, Рыгор Барадулін, Данута Бічэль, Уладзімір Дамашэвіч, Сакрат Яновіч, Вітаўтас Пяткявічус, Дзмітрый Бугаёў, Анатоль Кудравец, Віктар Казько, Барыс Кіт, Івонка Сурвіла і многія іншыя. Па словах укладальніка, "Аўтары не ставілі задачу (ды яе і немагчыма выканаць адным намаганнем, адной сябрынай) даць вычарпальную ацэнку літаратурнаму таленту Васіля Быкава, усебакова раскрыць ягоны характар, паслядоўна прасачыць ягоны пакручасты лёс, раскласці па палічках яго сімпатыі і антыпатыі, чалавечыя слабасці і захапленні. Яны проста прыгадалі "свайго" Васіля Уладзіміравіча, якога ведалі і любілі, з якім не раз перажывалі вялікія і малыя радасці і беды, для якога назаўсёды захавалі ў сваіх сэрцах цёплы запаветны куток..."

Выдавецтва "Беларуская навука" выпусціла кнігу Міхася Тычыны "Кузьма Чорны. Эвалюцыя мастацкага мыслення". Тут даследуецца працэс напісання К.Чорным літаратурных твораў, пачынаючы з узнікнення іх агульнай задумы і да яе рэалізацыі. Аналізуюцца рукапісы і чарнавікі пісьменніка. Паказваецца цесная ўнутраная сувязь этапаў творчага працэсу, высвятляюцца прычыны змяненняў у тэксце, вызначаюцца найбольш характэрныя асаблівасці работы пісьменніка над раманамі 40-х гадоў XX ст.

Большасць вершаў, якія склалі паэтычны зборнік "У Будслаўскай святыні Ты Ранішняй Зоркай...", была надрукавана ў часопісе "Ave Maria" пад рубрыкаю "На конкурс Маці Божай Будслаўскай". У творах шчыра і пранікнёна ўслаўляецца Апякунка Беларусі, прамаўляюцца да Яе не толькі словы хвалы і падзякі, але і малітоўна просіцца заступніцтва і апекі для сябе, сваіх сем'яў і роднага краю. Кніга прысвечана 500-годдзю Будслава.

Дабрыня мудрасці

Менавіта так у двух словах можна сказаць пра новую кнігу Ганада Чарказяна "Пум-Пур у калясцы і іншыя казкі", адрасаваную найперш дзецям малодшага школьнага ўзросту і толькі што выпушчаную выдавецтвам "Мастацкая літаратура". Адразу прыходзіць на памяць вядомае выслоўе, якое даўно стала хрэстаматыйным: "Для дзяцей трэба пісаць, як для дарослых, толькі яшчэ лепш".

Як піша Ганад Бадрыевіч для дарослых, прыхільнікі ягонага таленту ўпэўніліся даўно, паспеўшы пазнаёміцца з шэрагам ягоных кніг. Як і змаглі лішні раз пераканацца, што сучасную беларускую літаратуру нельга зводзіць толькі да набыткаў тых, хто піша па-беларуску. Моцная ў ёй і плынь, ля вытокаў якой стаяць рускамоўныя пісьменнікі, якія жывуць у нашай краіне.

Творчасць жа Г. Чарказяна, як ужо неаднойчы адзначалася, увогуле унікальная з'ява. Курд па нацыянальнасці, ён даўно адчувае сябе ўпэўнена ў беларускім прыгожым пісьменстве. Адбываецца гэта дзякуючы таму, што ягоныя творчыя пабрацімы і сябры ахвотна перакладаюць яго лепшыя творы як на беларускую, так і на рускую мову, а нярэдка розныя моўныя варыянты ў публікацыях суседнічаюць, альбо раздзелы прадстаўлены так, што адзін — беларускі, а другі рускамоўны. Ці наадварот.

Гэта тычыцца і твораў, адрасаваных дзецям. Як і кнігі "Пум-Пур у калясцы і іншыя казкі", што пераўвасоблена выдатнымі майстрамі слова Рыгорам Барадулінам і Іванам Бурсавым. Яна, дарэчы, у Г. Чарказяна — дзіцячага пісьменніка — не першая. Атрымала вядомасць і папярэдняя "Казкі дзеда Ганада". Цяпер атрымаліся як бы два зборнікі пад адной вокладкай, што, як на маю думку, вельмі добра, бо аўтаматычна пашыраецца кола чытачоў. З аднолькавай зацікаўленасцю да напісанага Г. Чарказянам паставяцца як дзеткі, якія ведаюць беларускую мову, так і тыя, хто ёй пакуль не валодае. А ўзяўшы зборнік у рукі і пазнаёміўшыся з рускамоўнымі творамі, яны, несумненна, пазнаёмяцца і з беларускамоўнымі.

Аддаючы належнае першай яе частцы, усё ж заўважаеш, што другая выйграе дзякуючы таму, што Г. Чарказяну пашчасціла прыдумаць арыгінальны персанаж, якога больш не адшукаеш нідзе: ні ў народных казках, ні ў якога-небудзь іншага аўтара. Гэта, безумоўна, ужо само па сабе сведчыць на карысць таго, што аўтар тонка адчувае дзіцячую псіхалогію, разумее, наколькі дзяцей захапляе нешта новае, як прыцягвае іхнюю ўвагу герой загадкавы, з якім больш нідзе не сустрэнешся.

Што гэта і на самай справе так, відавочна і з невялічкага ўступу, у якім даецца кароткая, але дастатковая характарыстыка гэтага персанажа:

О Пум-Пуре раньше никто не знал
на свете,
Ни взрослые, ни дети.
Не потому, что он где-то
скрывался,
Просто никто им не интересовался.
Был он не тих и не удал,
Не велик и не мал,
Не красавец и не урод:
Голова с кулачок,
А все, что ниже, —
сплошной живот...
Жил себе Пум-Пур да поживал —
Спал да ел,
Ел да спал.
В свободное время любил ворон
считать,
Но больше всего ему нравилось
Мечтать:
"Вот сесть бы в возок-коляску,
С горки — ж-ж-жих! —
И прямо в сказку!
Не ворон считать,
А — королевством управлять!.."

Ды нездарма кажуць: калі чагосьці вельмі хочацца, яно абавязкова рана ці позна здзейсніцца. Так атрымалася і з героем Г. Чарказяна. Аднойчы, адкрыўшы раніцой вочы, ён убачыў перад сабой старога, які і прапанаваў яму стаць каралём. Так Пум-Пур, якім да гэтага ніхто асабліва не цікавіўся, апынуўся ў казцы, а дакладней — трапіў у казачнае каралеўства. У казцы ж, як вядома, усё магчыма. У казачным каралеўстве — тым больш. З гэтага моманту і пачынаецца для Пум-Пура новае жыццё.

Якім жа яно можа быць у таго, хто не прывык бачыць далей за свой нос, а да ўсяго — няўклюдны, абмежаваны, пазбаўлены хоць якой-небудзь культуры паводзін? А такім, якое Пум-Пуру і падабаецца. Г. Чарказян не баіцца паказаць свайго героя непрывабным, які ў некаторыя моманты можа выклікаць да сябе не толькі ўсмешку, а і нават некаторую агіду. Робіцца гэта наўмысна, каб дзеці змаглі ўпэўніцца, што на якім бы месцы той, хто нічым добрым не вылучаецца, ні апынуўся, ён ўсё адно ні на што добрае не здатны.

Выкрываючы Пум-Пура, пісьменнік выкрывае невуцтва, абмежаванасць, абыякавасць.

А яшчэ Пум-Пур акружае сябе людзьмі, якія гэткія ж, як і сам ён. Таму і ў жонкі ўзяў дзяўчыну па імені Цюх-Цюх, якая ва ўсім варта свайго мужа. Дый сыночак у іх нарадзіўся, рыхтык бацька. Пум-Пура таксама нішто асабліва не цікавіць. Але, як відаць з далейшага разгортвання сюжэту, менавіта Цум-Пур з цягам часу ператворыцца ў таго, хто здатны прымаць правільныя рашэнні, паводзіць сябе ў нечаканых, складаных сітуацыях абачліва, знаходзіць выхад нават там, дзе, здавалася б, усё даўно зайшло ў тупік.

Асобныя казкі, якія расказваюць аб гэтым падарожжы, як і тыя, што ўзнаўляюць папярэднія падзеі, сюжэтна звязаны між сабой, таму ёсць усе падставы гаварыць аб тым, што "Пум-Пур у калясцы і іншыя казкі" — не што іншае, як займальная аповесць.

Пісьменнік паўстае не проста выдатным знаўцам дзіцячай псіхалогіі. Ён нагадвае сабой таго вопытнага педагога, які праводзіць са сваімі выхаванцамі важны ўрок і, пачынаючы з імі гаворку, ужо адразу адмаўляецца ад педагогікі дыдактызму, якая толькі на першы погляд дае пазітыўныя вынікі, а на самай справе не дазваляе наладзіць неабходны кантакт, бо мацуецца на звычайным дыктаце. У Г. Чарказяна ўсё заснавана на поўным даверы, а давер гэты дасягаецца не ў апошнюю чаргу дзякуючы таму, што пісьменнік у неабходных выпадках сам уяўляе сябе ў тых ці іншых абставінах, загадзя прадугадваючы магчымасць развіцця падзей менавіта ў такім, а не іншым накірунку.

Інакш кажучы, расказвае толькі пра тое, што, цалкам упэўнены, абавязкова выкліча інтарэс у маленькіх чытачоў. І гэта таксама важная адметнасць кнігі Г. Чарказяна, бо па-ранейшаму ў перыёдыцы з'яўляецца (а нярэдка яны і ў кнігі трапляюць) нямала твораў, у якіх, як быццам, і знаходзіцца месца шчодрай аўтарскай фантазіі, а на паверку аказваецца, што гэта вельмі далёка ад таго, што цікавіць саміх хлопчыкаў і дзяўчатак.

Чарказян хоць і не адмаўляецца ад традыцыйных персанажаў — такіх, як Баба Яга, Змей Сухавей і Змей Градабой (а яны ў розных варыянтах і героі шмат якіх народных казак), аднак абавязкова асучаснівае іх, а гэта ідзе толькі на карысць той жа займальнасці, а таксама дасціпнасці і нечаканасці прыгод персанажаў у нечаканых абставінах.

Усё ў аповесці "Пум-Пур..." завяршаецца шчасліва. Хоць сам Пум-Пур па сутнасці мала ў чым змяніўся, а калі на нешта і здатны, дык толькі, каб паранейшаму марыць, аднак, як сведчыць пісьменнік на самым завяршэнні гэтай гісторыі, "у той жа час на зямлі не было чалавека больш шчаслівага, чым ён..." Дый гэтага, калі разабрацца, дастаткова для Пум-Пура, таму што шчасце — паняцце шматграннае. Усцешвае і тое, што ў самім каралеўстве ўсё пачало змяняцца да лепшага, бо на трон узышоў Цум-Пур, а ён, у адрозненне ад свайго бацькі, аказаўся чалавекам куды больш дзейным.

Неўтаймаванасць аўтарскай фантазіі не ў меншай ступені характэрна і для казак Г. Чарказяна, перакладзеных на беларускую мову Р. Барадуліным. У іх можна напаткаць і знаёмых герояў, але кожным разам пісьменнік ставіць іх у зусім новыя сітуацыі, дзякуючы якім персанажам, што, паводле аўтарскай задумы, падаюцца станоўчымі, ёсць магчымасць абавязкова праявіць сябе найлепшым чынам, а ў некаторых выпадках і паднесці іншым такія ўрокі, з якіх добра відаць, як трэба паводзіць сябе, што рабіць, каб заслугоўваць павагу.

А ўвогуле, дабрыня, шчодрасць, узаемаразуменне — рысы, якімі прываблівяюць шмат якія персанажы кнігі. Нават тыя, што, здавалася б, знешне непрывабныя. Узяць хоць бы Восліка з аднайменнай казкі. У чым бы ён ні хацеў дапамагчы сваёй маці, тая нязменна адказвала: "Гэта добра. Але ты яшчэ маленькі і кволенькі. Табе трэба расці. Ты расці, сілы набірайся. А пакуль я сяк-так сама спраўлюся..."

Невядома, колькі б гэта працягвалася, але аднойчы Вослік напаткаў Чмеліка. Калі той даведаўся, што Вослік не ведае, як дапамагчы маме, адказаў: "Гэта вельмі проста. Трэба пачынаць з маленькай справы". Чмялёк паляцеў далей, а Вослік здзівіўся: "Гэтакі малюпасенькі і гэтакі кемлівы. Дзіва, дый годзе! Бадай што, ягоная праўда!"

Пачынаць трэба з маленькай справы, а пасля будуць іншыя, больш важныя — гэтая думка прысутнічае і ў некаторых іншых казках Г. Чарказяна. Праўда, часам крыху завуалявана, але дзеці абавязкова здагадаюцца, што хацеў сказаць ім пісьменнік. Здагадаюцца і зробяць для сябе пэўныя высновы. Пагадзіцеся, што на сённяшні час, калі мастацкае слова дэвальвуецца, гэта важна.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Кнігі маюць свой лёс

Нататкі пра адну знаходку Нацыянальнай бібліятэкі

Супрацоўніца Нацыянальнай бібліятэкі, пісьменніца Людміла Сільнова неяк запрасіла мяне да сябе, каб паглядзець разам цікавую знаходку з фонду беларускага аддзела. Гэта аказалася кніга нашага вядомага паэта Паўлюка Труса "Вершы і паэмы" (Мінск, 1940), на якой мы ўбачылі надпіс — аўтограф Васіля Лаўрыновіча. Надпіс мае такі змест: "Паўлюк Трус наш нацыянальны паэт. Няма чаго яму бадзяцца па заграніцах. Дасылаю на Радзіму гэтую кніжку, знойдзеную ў падвалах чорнага Берліна 2 мая 1945 года. Старшына В. Лаўрыновіч. Берлін 2/V—45 г. В/ч 70911 "Б". З гаворкі з Людмілай мне ўдалося высветліць, што гэты Лаўрыновіч — даволі вядомы чалавек у Беларусі. Ён удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, настаўнік і нават паэт, аўтар трох лірычных зборнікаў. Але адна з найбольшых яго заслуг перад Радзімай — тое, што ён, выпадкова знайшоўшы ў берлінскім падвале выданне беларускага паэта, пранёс яго праз усе ваенныя шляхі-дарогі, каб потым вярнуць свайму народу як вялікую каштоўнасць і сапраўдны скарб. У гэтым учынку выявіліся патрыятызм і самаахвярнасць мужнага чалавека, які потым уславіў нашу краіну сваёй руплівай працай і сагрэў тых, хто вакол яго, шчырай любоўю, гарэннем палымянага сэрца.

Гартаю старонкі газеты "Советская Белоруссия" за 1 мая 1984 года. У артыкуле "Книга жизни", змешчаным пад рубрыкай "Наш современник", расказваецца пра этапы жыццёвага шляху Васіля Апанасавіча Лаўрыновіча. Нарадзіўся ён у в. Целуша на Бабруйшчыне ў шматдзетнай сям'і, у якой было 9 дзяцей. Трое з іх загінулі на фронце. Бацькі атрымалі "пахаронку" і на Васіля, аплакалі ягоную смерць. Але ён застаўся жыць, ацалеў і нават дайшоў да Берліна. Быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Вярнуўся, каб яшчэ не раз парадаваць сваіх бацькоў. Працаваў завучам Глушанскага і Капыльскага дзіцячых дамоў, больш як 20 гадоў разам са сваёю жонкай аддаў школе. Больш як 15 гадоў вёў школьнае літаб'яднанне "Званок".

Васіль Лаўрыновіч цытуе словы добрага знаёмага свайго бацькі — беларускага пісьменніка Платона Галавача: "У жыцці трэба быць воінам, настаўнікам і паэтам". Так, нашаму земляку гэта ўдалося... Пісаць вершы пачаў у гады Вялікай Айчыннай. Яго паэтычныя схільнасці былі заўважаны — яго прызначылі пры штабе... пісарам. Пасля ў адным з падвалаў на Вільгельмштрасе ён знайшоў кіпу кніг. Сярод іх аказаўся і ацалелы (на дзіва!), захаваны ў добрым стане паэтычны зборнік П. Труса. Кніга была перададзена ў бібліятэку. Цяпер ёю можа карыстацца кожны зацікаўлены чытач...

Васіль Лаўрыновіч займаўся літаратуразнаўствам. Ён напісаў мноства артыкулаў і рэцэнзій, прысвечаных творчасці беларускіх і савецкіх пісьменнікаў. У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі можна пазнаёміцца і з яго новай кнігай вершаў для дзяцей дашкольнага ўзросту. Яна напісана на беларускай мове і мае назву "Едзе лірнік з песняй" (Мінск, 1976).

Але, відаць, самае галоўнае, што зрабіў гэты выдатны Настаўнік у сваім жыцці, — ён выхаваў сваіх вучняў добрымі людзьмі. Кім бы яны ні былі — хлебаробамі або педагогамі, паэтамі ці воінамі, думаецца, ім у вышэйшай ступені ўласціва пачуццё патрыятызму. "Любіце сваё! — гаварыў ім кожным словам, кожным жэстам іх настаўнік. — Любіце так, як любіў я тады, калі нёс па дарогах вайны ў запыленым рэчмяшку паэтычны зборнік Паўлюка Труса, што захаваўся ў дашчэнту спаленай сталіцы фашысцкай Германіі для таго, каб самім існаваннем нагадваць аб прыгажосці і велічы нашай з вамі Радзімы".

Святлана ЯВАР

Алег САЛТУК

Храм

Я душы сваёй не шкадую
І ніколі не шкадаваў.
Я свой храм у душы будую,
Ды пакуль што не збудаваў.
Не хапала ў мяне цярпення,
Не ставала і кволых сіл.
Я лавіў для храма праменні,
На зямлю з нябёсаў насіў.
На зямлі ж было аж замнога
Камянёў — іх збіраў, як мог,
Каб расчысціць да храма дарогу,
Каб у ім пасяліўся Бог.
Я будую свой храм зацята,
Не вялікі і не малы,
А такі, каб было ў ім святаў
Аж пад самыя купалы.
Вы прыходзьце, як вокны заззяюць
І малітва пачуецца ў ім...
А пакуль яшчэ совы лятаюць
Над пакутлівым храмам маім.

Першы пацалунак

Маліннікі паджарыя
І жаўранка званок.
Спякотныя выжарыны.
Ты ад мяне праз крок.
Ён мне здаецца вечнасцю
І на нагах цяжар.
А сонейка высвечвае
Твой загарэлы твар.
Дзесь рэхам адгукаецца
Зязюліна "ку-ку"...
Напэўна, так кахаецца
Адзін раз на вяку.
Цябе тады ў малінніку
Ад спёкі засланяў
І вочы твае сінія,
Як неба, цалаваў!

У валатоўках

Як падступалі бітвы,
Званілі ўсе званы,
Каб памагла малітва
Прыйсці дамоў з вайны.
Маліліся славяне,
Стары і малады.
На выцвілых курганах
Згубіліся сляды.
У валатоўках ціха
Ляжыць француз ці швед?..
А лебедзь з лебядзіхай
Па азяру плыве.
Закончыліся бітвы,
А можа, не, як знаць?..
Ні звона, ні малітвы —
Нічога не чуваць.

Беларусь

Нібы слёзы, росы
Палі на пракосы.
У нябёсах гусі —
Сэрца ў Беларусі.
Па жыцці блукаю,
Сам сябе шукаю.
Знаю, што вярнуся —
Сэрца ў Беларусі.
Возеру і полю,
Вербам і таполям
З болем пакланюся —
Сэрца ў Беларусі.
Курганы, дубровы,
Месяц вечаровы...
Словы вам не хлусяць —
Сэрца ў Беларусі!

Дарога

Сляпы вядзе сляпога,
Глухі вядзе глухога,
Нямы вядзе нямога,
Дурны вядзе дурнога
Цярновая дарога —
Сто год — адна вярста...
Ці знойдуць хоць нябогі
Дарогу да Хрыста?

Мы

Жывём, нібы ў казцы ці ў сне.
І сон невясёлы, і казка.
Няма ні спагады,
ні ласкі
Ні ў гэтай, ні ў той старане.
Хаця мы стаім і размову
З Еўропай на роўных вядзем.
Народ мы ці толькі прадмова,
Пачаўся ці скончан
наш дзень?
А нас жа з табой мільёны
Дабрэйшых у свеце людзей.
І лес наш спрадвечна зялёны,
Азёры за неба сіней.
А ў небе за нас Еўфрасіння
Ўсё моліцца ноччу
і днём.
Таму мы вось разам з усімі
Са смехам і з плачам
жывём.
Народ мы ці толькі
прадмова
Да роду й народу свайго?..
Ці ёсць у нас роднае слова,
Ці мы пахавалі яго?

Пятро ПРЫХОДЗЬКА

Паэтам розных пакаленняў

Былі і ёсць паэты йшчэ,
што разам
Вышыні бралі з дыму і агню.
А хто, калі казаў з іх,
што адразу
Ў паэзіі заняць мог вышыню?

Калі з вайны вярталіся
жывымі, —
Радзіма шчыра абдымала
нас, —
А з вершамі — казала —
франтавымі
Патрэбна пачакаць
вам нейкі час.

Хоць голас у іх чуўся
зухаваты
І ўсе прапахлі порахам яны, —
Але пакуль, напэўна,
сыраваты,
Каб перадаць нягоды
ўсе вайны.

Паэзія ж, вядома —
вечны пошук
Сардэчных слоў,
так неабходных ёй.
І ветру шум і ціхі дрэваў
пошчак
Яна ўбірае ў сувязі з зямлёй.

Сягоння хтосьці з маладых
пазтаў
Старэйшых можа абагнаць
парой.
Але ні ў кога з пераможных
лётаў
Не можа песня ў раве стаць
старой.

Не спадзявайся ж, друга,
на падмогу, —
Паэт у працы — сам сабе
прарок.
І калі ў слове ёсць адданасць
Богу —
І праз агонь праб'ецца
твой радок!

Мікола МЯТЛІЦКІ

22 чэрвеня 2001 года

Ўсяго адна хвіліна да вайны,
Да той крывава ненажэрнай
дзеі,
Што ў вобліку жахотліва
кашчавым
Залье крывёй ціхмяна сонны
свет.
Ўсяго адна хвіліна да вайны.

Шарэ золак хмарывам.
І горад
Спакойна спіць. А я выцця
сірэн
Напружана чакаю. Колісь ён
Праз нейкі міг ужо ад іх
аглух.
Гулі надрыўна ў небе
самалёты,
І вырасталі пад крыжамі
крыл
Узрывы бомбаў —
вогненныя кветкі.

Ужо адна хвіліна, як вайна
За Буг ступіла з вогненнай
касою
І павяла даўжэзны свой
пракос,
Зрабіўшы шчэ найпершы
толькі ўзмах.
І як багата ляжа ў тым
пракосе
На шырах свету жыццяў
абарваных,
Не менш, як траў на звычнай
касавіцы...

Гадзіну ўжо гудзе-брыдзе
вайна.
Ўзіраюся ў спакойнае
дасвецце
І слухаю цябе, мой родны
Мінск,
Ты ўстаў на папялішчы
і крыві,
І бачыш свой спакойны
мірны сон
Праз шэсцьдзесят...
У гэткі ж самы
ранак...

1981 г.

Васіль ЛАЎРЫНОВІЧ

Над магілай хлопцаў

Камандзіру партызанскага атрада Конану Ф.П.

Над Нератоўкай-рэчкай,
Выпрамлены станам,
Пры шляху ў Парэччы
Дуб стаіць тытанам.
Дуб той супраць буры
Голле расхінае:
Жалуды, як кулі,
Ён на дол кідае.
Што яму адплата —
Стрэлы перуновы?
Дуб стаіць салдатам,
Беражэ дубровы.
І стаяць тытану
З думаю бясконцай,
Быццам партызану
Над магілай хлопцаў.

Іна СНАРСКАЯ

Буры сыч

Боль мой, буры лясны сыч,
Ты мне ў ночы вочы пазыч,
Разбуры мой здрадлівы сон
І крылом захіні, як крысом.

Красамоўна маўчанне тваё:
Там шукае свой скарб груганнё,
Там цякуць у лясныя вякі
Пракавечныя песні ракі.

А з рукі падымаецца ветах
На скрыжалях вятроў
запаветных...
Гэта ўсё падуладнае мне
Пакуль сыч за сцяною раве.

* * *

Вечарэ,
я — прырэчана:
быццам ветах
сэрца ссечана.
Ружа-кветка
недарэчная
па рацэ плыве
побач з вечнасцю.

* * *

Гром, грымі,
Грудзі мае напаўняй
малаком, —
Неба з зямлёю мілуецца,
Дом зялёны не цісне замком.

Белы свет, мо святліца,
У якой парадзіха — я,
Неба з зямлёю мілуецца,
Дыхае небам зямля.

Гром, грымі,
У знямеласці вуліц
каханне кліч!
Неба з зямлёю мілуецца,
Каб нарадзіўся Зніч.

Мікола КЛІМОВІЧ

Прыпяць

Балада

Прыпяць, Прыпяць,
твае воды —
Сведкі даўняе нягоды,
Праз вякі свае сівыя
Поры зведала ліхія.
Колькі слёз, матуля
Прыпяць,
Давялося табе выпіць
Той гаротнаю часінай,
Як нядоля над краінай
Дзікім коршунам гайсала.
Ці, як здань, наўкол стаяла
Чорнай хмарай з паднябесся,
Абвіла маё Палессе...
На татар, бяздушных,
хцівых
Князь Астрожскі мчаў
на крылах.
Колькі згінула народу
Ад ваякаў тых з усходу,
Ад тэўтонаў ды ад ляхаў!
Беларус не толькі плакаў,
А змагаўся, што ёсць сілы,
Зграі воўчыя асіліць.
Біў няшчадна іх Касцюшка,
Што з іх рылаў цякла юшка.
Каліноўскі —
сын наш кроўны
Вёў адважна бой нароўны,
У лапы трапіў супастатаў,
Але смерць прыняў ад катаў
З клічам грозным,
пераможным,
Што паўстане з братоў
кожны
І ўзыдзе ў тым змаганні
Над зямлёй святое Ранне...
Ты, мая рака-матуля,
Ратавала люд ад кулі —
Твая пушча ды дуброва
Паратункам была, сховай.
Ты лясных салдат туліла,
Іх вадой святой паіла,
Каб буяла іхня сіла,
Каб нянавісць расла ў жылах
Да фашыстаў, нелюдзяў
і катаў,
Да забойцаў, вырадкаў
праклятых.
Наш народ — герой, асілак,
Гэтых нечысцяў асіліў,
Разграміў ушчэнт заразу,
Каб адрадзіць жыццё
адразу ж,
Каб зацвілі сады ля хатаў,
Каб баразну ўздымаў араты,
Каб дзятву чакала школа,
Каб прыгажэла ўсё наўкола.
І нашы сёлы, гарады,
Каб госці ехалі сюды.
Айчынай нашай любавацца,
Яе сынамі захапляцца.
...А цяпер Чарнобыль душыць
Пакалечаныя душы,
Падкажы, матуля Прыпяць,
Дзе такой вадзіцы выпіць,
Каб бяду-атруту сцерці,
Супакоіць нашы сэрцы.
Даплыві да пана Бога,
Раскажы пра нас, нябогаў.
Досыць нам выпрабаванняў
І бясконцых ушчуванняў.
Хай ратуе нашых дзетак,
Пушчу нашу і палетак,
Хай пашле дабро і згоду
Людзям нашым, майму роду.
Папрасі, рака-матуля,
Каб будзіла нас зязюля,
Жыта ў полі красавала,
Каб старонка ў сонцы ззяла.
Каб прыстойна нас на Веча
Словам шчырым, чалавечым
Велічала ўся Планета
З Лета ў Лета, з Лета
ў Лета.

Уладзімір ШПАДАРУК

* * *

Надыдзе час, калі Айчыннай
Вайны апошні ветэран
Ў зямельцы родненькай
спачыне,
Каб адпачыць, нарэшце, там.

Стаміўшыся ад жорсткай
працы
Пад назвай жудаснай:
"Вайна",
Ад думак: "У жывых
застацца б,
Дамоў вярнуцца б давідна",

Каб будаваць і хлеб
вырошчваць,
Любіць і дзетак гадаваць...
Асірацее хутка плошча,
Як воі ў неба адляцяць...

Шануйце ж іх, пакуль
жывыя,
Пакуль яшчэ на нас глядзяць
Іх вочы сумныя, святыя,
І сэрцы здольны адчуваць...

Шкадуйце іх, засцерагайце
Ад раўнадушша і маны,
І крыўду-боль ад іх хавайце,
Каб не пакутвалі яны.

КАРОТКІЯ АПАВЯДАННІ

Туфлі — з ног...

У напаўпусты салон тралейбуса зайшлі двое хлопцаў. З выгляду — крутыя, але не надта каб: недзе блізкія да дробных гандляроў ашавуркі. Па ўсім відаць, не даўнія дружбакі: хутчэй за ўсё толькі што, на прыпынку, сышліся. Яшчэ, можа, і не пазнаёміліся.

Адзін — каржакаваты, з доўгімі рукамі, без пальчатак. Але ў дабротнай шапцы. Футра норкавае. Паліто чорнае, доўгае. Боты фірменныя, памеру ці не самага апошняга. Твар яго дробны, нос доўгі, вастрадзюбы. Шчокі ўпалыя.

Другі — высокі, але не сказаць каб худы: дзябёлы; ногі — тоўстыя цыбы, і ў вузкіх штроксах ім яўна цесна: пры сагнутых каленях калашынне напінаецца да росцягу; і яшчэ — даюцца ў вочы верхнія акантоўкі сцягнутых гумкамі белых шкарпэтак і тупамысыя, з белымі шнуркамі туфлі. Яго акругла-пляскатая галава, падобная на бячэйку ад бубна, пакіўвалася — такое ўражанне! — адначасова ва ўсе бакі. Здавалася, на яе што ні напхні, дык абавязкова зваліцца долкі. А што картуз ці якая кепка без прывязі й хвіліны не патрымаецца. Гаспадар галавы-бячэйкі, як кажуць, ужо не вязаў лыка — не гаварыў, а нешта няўзнак выгукваў. Усеўшыся, ён дастаў з кішэні дабротнай дублёнай курткі паўлітэрку, адкаркаваў і зрабіў запар колькі прагавітых глыткоў. Тут жа прапанаваў выпіць гэтак жа, з горла, і свайму напарніку, аднак той адмовіўся ад дармовага частунку, чым і змусіў дабрадзея адступіцца і больш не дакучаць.

Чарговы прыпынак — і тралейбус умомант напоўнены пасажырамі. П'яны боўдзіла апынуўся тым часам ажно каля першага, што ля кабіны вадзіцеля, сядзення, скрай якога сціпла прыляпілася даволі маладжавая жанчынка. На ёй былі зграбная андатравая кацавейка і ці не з выдрынага футра шапка-кубанка, што так пасавала мілавіднаму твару з вуснамі, падобнымі на ружовы бутончык. Боўдзіла перагнуўся як не ў тры пагібелі й бадай узлёг усім сваім цяжарам на плечы прыціхла-ўтрапёнай маладайкі. Тая, праўда, не пажадала цярпець здзеку — рашуча выграблася з-пад дзікунаашаломка і стала рухава прабівацца да дзвярэй. І тут жа выйшла на чарговым прыпынку... Як жа яна здзівілася, калі ўбачыла, што следам за ёй грабецца з тралейбуса і гэты самы бэйса-бамбіза, прыліпала. Ён спяшаўся — з ходу гайсануў на асфальт, пакаўзнуўся і, упаўшы на спіну, выцяўся патыліцай аб бардзюр так моцна, што аж гулы пайшлі, нібы ўпала на асфальт аднекуль зверху шырокая дошка...

Як ні дзіўна, першым падбег да раптоўна аціхлага гаваруна вадзіцель тралейбуса, ухапіў запясце яго левай рукі й стаў намацваць пульс; у правай пацярпелы трымаў незакаркаваную бутэльку, якая не тое што не разбілася, але нават і кроплі з яе не праліпся.

Павабная маладайка, здзіўленая тым, што бутэлька з рук пацярпелага не выпала, а туфлі нечага раптам разляцеліся ў розныя бакі, сказала да вадзіцеля:

— Вы толькі гляньце — так гахнуўся, што ажно без туфляў застаўся...

— І праўда, — кіўнуў ёй вадзіцель і адступіўся. — Да пульсу не дабрацца... Чалавек страціў прытомнасць, трэба «хуткую» выклікаць. — Ён жа сам і заспяшаўся да тэлефоннай будкі, што была насупраць, акурат пад балконным брылём шматпавярховіка.

Тым часам праз заднія дзверы тралейбуса сталі выходзіць людзі. Пярэднія хоць і былі расчыненыя, але перад самай іх зеўрай ляжаў пацярпелы, і каб выйсці, трэба было пераступаць праз яго. Ніхто гэтага не зрабіў.

І вось — першы падступіўся пажылы мужчына. Адзін з тых нецярпліўцаў, якія толькі што пакінулі тралейбус. Мужчына нахіліўся і адпусціў нябогу спачатку гальштук, за ім спешна расшпіліў верхнія гузікі ў кашулі. А калі ўгледзеў, што ногі пацярпелага без туфляў, няўцямна выбуркнуўся:

— Ну, калі туфлі паскідаў, то...

— Аняго ж, яны так і пырснулі ўбакі, — зноў ажывілася маладайка, выйшла з анямення. — Я насвае вочы ўсё бачыла... Дрыгнуў нагамі — і туфлі хоп-хоп, пазляталі.

— Туфлі спадаюць ад смяротнай сутаргі... Такія моцныя штуршкі. — Пажылы мужчына настроіўся на размову. — Я кажу вам гэта як фельчар... Санітарам давялося быць на апошнім годзе вайны, дык салдацік, помню, абшаснуўся і ўпаў з танка на асфальт... Галавой выцяўся. І верыце, яго так усяго калатнула, так скукожыла і ў той жа міг выпрастала, што боты кірзавыя пазляталі з ног. Я саскочыў, узяў яго на рукі, а ён ужо абвяў, пацяжэў...

— Ой, дык і хлапец гэты ўжо нежывы?

Алесь МАСАРЭНКА

— Сканаў... Як бачыце, капыты адкінуў, піток.

— Каб жа я ведала, што пакаўзнецца— падала б яму руку...

— Каб цвярозы быў, то не пагнаўся б за табой... — Працадзіў скрозь зубы вадзіцель тралейбуса: — Такая ўжо каралева!

Маладайка азірнулася на голас і ўбачыла вадзіцеля, гнеўна кінула ў адказ:

— Грубіян!..

Сірэна «хуткай дапамогі» заглушыла галасы. Умомант жывое кола парвалася з боку асфальта, і да распластанага мерцвяка падскочылі двое санітараў з насілкамі.

Сны бабулі Алены

Крыж

Бачу сон — ляціць крыж з неба. Дыміць унізе, паволі спускаецца. Я адна. Вакол мяне пуста, анікога. Спалохалася — кінулася ўцякаць. І атрымалася, быццам я ў нейкай спружыне ўнутры, і мяне так выпстрыкнула, што я куляй лячу. Але ж — неяк трэба выбрацца з гэтай спружыны. Спрабую расцягнуць кольцы, і тады між іх можна свабодна вылезці. Але — думка: навошта вылазіць? Навошта?.. І засталася ў спружыне. Не вылезла.

Трэба ж, толькі праз два гады зразумела сэнс гэтага майго сну: Гасподзь паслаў мне збавенне — вылазь на Божы свет, жыві, кахай, рабі добрае людзям і пра сябе не забывай. А галоўнае — не мучай сябе, сваю душу і цела. Гані прэч пакуты, што ціснуць штодня!..

Выходзіць, я, упартая асліца, упартае дзіця прыроды, засталася ў пажыццёвай пастцы, з якой і сёння не магу вылезці па сваёй дуроце.

...Гасподзь, я зразумела, што Ты ёсць і будзеш ва векі вякоў. Ты справядлівы й добры. Даруй мне, грэшнай, што з сабой аніяк не магу ўправіцца. І не дзіва — вакол столькі несправядлівасці,столькі пакут і гора, і дзе ўжо мне, бяссільнай, перамагчы свае грахі.

Мая нявінная душа пакутуе. Але ж я нікога і не забівала, нікога не рабавала. То як жа тыя жывуць, што ў Бога вераць, а забіваюць, гвалцяць, крадуць і мухлююць?..

Зямля правальваецца...

Стаіць нашая хата — прыгожая, вялікая. Святло ў вокнах.У хаце —мама, бацька і я. Помню, нечага выйшла на вуліцу. Гляджу на поле, а там — чыста, ні травінкі, і такім цяплом патыхае, аж мая душа трымціць ад навакольнай харашыні. Тут жа, за полем — лес. Палоскай чорнаю. На фоне гарызонта нагадвае паўкруг каромысла, дужкаю ўгару... Уражанне такое, быццам мы ўсе, з хатаю, слізгацім уніз па гэтай дугаватай горцы. А ўнізе ж там, ведаю, — пропасць, бяздонне...

Спалохалася, убегла ў хату, крычу бацькам:

— У пропасць ляцім!.. Зямля кувыркаецца... Мама, тата! — хвалююся. — Уцякайма хутчэй!

Тата:

— Чаго нам куды бегчы?.. Якая пропасць?!.

Мама:

—— Калі й паміраць, дык лепей тут, чым на чужыне...

Сама я не засталася ў хаце — выхапілася на падворак... І прачнулася.

Замучаныя, галодныя...

Еду на калёсах. Конь цёмна-чырвонай масці, спраўны. Дарога звычайная, паабапал — алешнік, лаза, там-сям відаць маладыя бярозкі.

Паварот — і дарога пайшла ўніз, у лагчыну. Перада мною — рака. Спынілася. Бераг круты. І ўвесь голы... Адно — пні, пні, пні... Нідзе наўкруг ні кусціка, ні малога нават дрэўца. І нехта ўсё, бачу, варушыцца, кешкаецца сярод гэтага пнёўя...

Падышла бліжай — аж гэта людзі!.. Дарослыя і дзеці. Усе ў белым адзенні. І адзенне такое — вышываныя кужальныя кашулі, беларускія. Людзі замучаныя ўсе, змардаваныя. Але жывыя, памерлых не відаць. І што — дзялянка вялікая, пнёўе не надта і высокае. Людзі хто-як ляжаць і сядзяць. Нехта паклаў галаву на пень, знерухомеў і бадай ужо не дыхае, адно вочы яшчэ гараць, не патухлі. А нехта наўзніч ляжыць, на спіне, і курчыцца ад голаду, стогне...

І мне вядома, што гэта з людзьмі знарок такое здзеялі — сагналі сюды, каб паміралі — ціха, без гвалту...

Бог ты мой! Саскочыла я з калёс, упала — паўзу. Наткнулася на жанчыну. Ляжыць, гаротная, пры смерці. А з ёй упобачкі й дзеткі ейныя, худушчыя — скура ды косці. Пытаюся ў жанчыны:

— Мілая, чаго так ляжыш?.. Бяжы адсюль, бяжы! Гіблая гэта мясціна... Лес нехта вынішчыў, то і людзям тут, без лесу, не жыць. Уцякай, мілая. І дзетак сваіх ратуй!

Жанчына:

— Няма куды ўцякаць, — голас нябогі прашалясцеў, як высахлы лісток на галінцы.

Я пабаялася ўстаць — гэтак жа, на жываце, папаўзла назад, на горку. Пра каня і калёсы забылася. Аж тут, бачу, хаты стаяць. І ўсе пустыя... А гаспадары іх, выходзіць, на беразе сярод пнёўя паміраюць. Падхапілася і пабегла. І так: ад хаты — да хаты, крадма бегла, каб ніхто не ўбачыў, не запыніў. Спяшалася, каб жа хутчэй каму-небудзь сказаць пра бяду, каб выратаваць людзей ад смерці...

Прачнулася — дыхаю ўзрушана, сэрца стукоча ў грудзях — як не выскача навырунак. І — пот залівае ўсю, горача. Думаю: «Няма куды ўцякаць спакутаванаму народу... Але ж няма чаго і ў магілу дачасна кідацца — трэба жыць!»

Партрэты

Бераг ляснога возера... Шафёр накідаў донак, начапляў на звіслае над вадой кустоўе старожняў. Пасля доўга хадзіў па беразе са спінінгам. Злавіў нарэшце даволі ўнушальнага шчупака. Неўзабаве шугануў даволі напорысты дождж, і давялося вярнуцца да райкамаўскага «козліка».

Я тым часам ні на хвілінку не адыходзіў ад сакратара райкама — стараўся хоць збольшага запісаць яго чарговы аповед...

Шафёр пачаў распальваць вогнішча, але нарыхтаваны ім сушняк пасляеў ужо адсырэць, і трэба сухая папера, каб падкласці пад стаўбурысты лоўжык знізу і запаліць.

— Іван Савельевіч, у мяне там, апрача партрэтаў членаў Палітбюро, аніякай іншай паперы няма... Дазвольце хоць адзін спаліць, га?

— Спалі хоць і два, абы мне вогнішча было!

Шафёр дастаў партрэт Грышына, падзёр на доўгія вузкія палосы, запаліў. Тым часам сакратар выцяг з рукзака колькі бульбін і цэлафанавы пакет з рознымі спецыямі для юшкі. Нарэшце падступіўся да зусім яшчэ кволенькага цяпельца і закурыў. Якраз падышоў шафёр і распластаў споверх горкі сушняку другі партрэт, але ўжо цэлы, непадзёрты. І што — тварам уверх. Спаволі партрэт стала курочыць, абрысы нядаўняга генсека ўвачавідкі мяняліся — адно лахматае брыво выстарчылася строга ўверх і заярчэла, схапілася агнём, другое — умомант счарнела і трэснула, выпусціўшы праз вузенькую шчыліну тонкі струменьчык дыму...

Сакратар убачыў гэта і аж зніякавеў. Уражана выгукнуў:

— Сямёнавіч!.. Ты што ж робіш, цяльпук?!.

— Вы дазволілі... Пісьменнік —сведка... Хі-хі-хі... Сказалі — хоць і два партрэты бяры.

— Што я сказаў, маць тваю за нагу?!.

—Ды хай гарыць... Не ўсё роўна? Што той крутаслоў, што гэты — выжлякі адной зграі.

— Ну хоць бы павярнуў...

— Тварам на агонь?

— Дальбог звольню за такія штукі... Сам напрошваешся. — Іван Савельевіч паглядзеў на мяне. — Вы, спадзяюся, пра гэта не станеце пісаць?

— Напішу абавязкова, калі звольніце Сямёнавіча... А так — пабачым, — няпэўна адказаў я і падумаў:

«Занатую, каб не забыцца!»

— Мне, знаеце, успомнілася, калі я старшынёй калгаса быў, — ажывіўся раптам сакратар. — Прыехаў журналісцік — баявы такі, напорысты. Кажа: «Матэрыял у чарговы нумар... Заўтра трэба здаць». І здаў, знаеце... Мы пахадзілі з ім у скверыку недзе хвілін з пятнаццаць. І ўсяго толькі. А восень, дождж марасіў, і я ў капелюшы быў. Ён, гэта, на бакенбарды мае заглядзеўся, нават сказаў, што і сам такія адпусціць... І што ж? Ранічкай, праз дзень, звоніць мне сакратар райкама і кажа: «Едзь хуценька да мяне... Замочым тваю шавялюру!» — І рэгча, як конь. Аж гэты пісарчук і блізка не бачыў маёй «чупрыны», але так яе ўславіў, такіх кучараў наплёў, што з мяне смяяўся ўвесь раён, пасля—і вобласць.

Шафёр, акрываючы касцярок чарговым партрэтам, але ўжо тварам на агонь, сказаў да свайго шэфа:

— Калі б той хлапчына не ўпрыгожыў вашу безвалосую макушку, то вы, можа, і сёння хадзілі б у старшынях... Як бы там ні было, а вас заўважылі ў вобласці, вамі зацікавіліся — і павысілі. А вы —мяне прыпуцілі, і я вам за гэта ўдзячны, і ніколі не здраджу. А гэты пісьменнік — мая радня, каб вы ведалі. Таму нічога дрэннага не напіша пра вас, а ўсё скажа так, як і было на самай справе. І вас, можа, зноў заўважаць, га?

— Няма куды ўжо мне зрывацца адсюль —праз год пенсія... Дом над кручаю, унізе — Сож, луг... Толькі й жыць.

Ганарар

Сляпы ў пераходзе, патрэсваючы наструненым на лоўлю грошай капелюшом, штораз паўтарае:

— Жыццё маё ў смутку —
кешкаюся, бы свінчо,
у цёмным закутку.

Я таксама кінуў у стары капялюш колькі тысячаў — як ганарар за даволі ўдалы трохрадковік, куды лепшы за ўсякія там хоку ды танку, за вушы прыцягненыя ў нашу паэзію. .

"Залаты век" працягваецца

Два дні ў Наваградку святкавалі месцічы 960-годдзе свайго легендарнага горада. З гэтай нагоды тут упершыню прайшоў Беларускі фестываль мастацтваў, якому далі назву «Наваградак: «залаты век» працягваецца". Арганізавалі яго Гродзенскі аблвыканкам, Наваградскі райвыканкам і Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі на чале з маэстра Міхалам Фінбергам.

На прыгожых высокіх пагорках ахінутай паданнямі балтаславянскай зямлі пры канцы X стагоддзя пачаў развівацца горад-крэпасць. У XII-XIII стст. яго праславілі майстры-месцічы, што гандлявалі з Візантыяй ды Еўропай — пераважна зброяй, выробленай з бронзы, золата і срэбра. У 1253 г. каранаваўся тут князь Міндоўг, з якім звязана станаўленне ды развіццё Вялікага княства Літоўскага. Гадоў праз трыста горад атрымаў права на самакіраванне. Тады й надышоў для Наваградка "залаты век". Чым быў ён адметны? Талерантнасцю, поліканфесійнасцю, нацыянальнай згодай сярод месцічаў — а жылі тут ліцвіны, продкі сучасных беларусаў, ды яўрэі, татары, палякі: адданыя нашчадкі ўласных моўных і рэлігійных традыцый, мелі яны мажлівасць развіваць свае школы, духоўную, мастацкую, побытавую культуры, шануючы і ўзбагачаючы культуры адно аднаго...

Наваградак вывеў у свет незвычайных асоб, сярод якіх — і паэт Адам Міцкевіч, і вучоны-інжынер, астранаўт Барыс Кіт. І здаецца, своеадметны беларускі дух рамантызму, вальналюбства ды памяркоўнасці жывіць атмасферу нашай старажытнай сталіцы, да гістарычных каранёў-камянёў якой, пэўна ж, невыпадкова трэба ўзнімацца, як да сапраўдных святыняў: крочыць да Замкавай гары і крутых абарончых валоў, да гары Міндоўга, да рукатворнага кургана ў гонар Адама Міцкевіча...

•

Фестывальны рух, які, дзякуючы ініцыятыве Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі на чале з яго няўрымслівым лідэрам, спакваля ахоплівае нашы несталічныя гарады і падтрымліваецца кіраўніцтвам краіны як адзін з перспектыўных і важных напрамкаў развіцця маладой беларускай дзяржаўнасці, нацыянальнай ідэалогіі, — гэты рух не мог абмінуць і Наваградчыну. Параўнаўшы аналагічныя, але ўжо больш сталыя імпрэзы, што адбываюцца ў Заслаўі, Нясвіжы, Міры, пераконваешся ў слушнасці і ў мудрасці гэтага доўгатэрміновага культурна-асветніцкага і, сёння можна казаць так — ідэалагічнага праекта. Сапраўды, штогадовыя мастацкія святы ў т.зв. малых гарадах — і падмурак, і крылы стваральных спраў, звязаных з адраджэннем і захаваннем нашай культурна-гістарычнай спадчыны — дзеля годнай будучыні Беларусі. Традыцыйныя «Дажынкі», Дні беларускага пісьменства, музычныя фестывалі, геаграфія якіх пашыраецца дзякуючы дзейнасці "малой філармоніі" — калектываў Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі на чале з маэстра М.Фінбергам... Пры належнай падтрымцы мясцовых улад і дапамозе ўрада такія акцыі дазваляюць, вобразна кажучы, "прыбраць у доме", добраўпарадкаваць побыт, больш патрабавальна паставіцца і да культуры духоўнай, і да культуры агульнай у несталічных рэгіёнах, прынамсі, у старадаўніх беларускіх мястэчках, знаных сваім колішнім еўрапейскім укладам жыцця. Да таго ж, пра што сёлета — і афіцыйна! — гаварылася падчас фестывалю "Музы Нясвіжа", камерныя музычныя фэсты маюць спрыяльную перспектыву, звязаную з развіццём турызму, важнай часткі вялікай прэзідэнцкай праграмы.

•

Як ні шчаміліся залева з навальніцаю ў атмасферу наваградскага фэсту, а штрыхі дажджу яе зусім не сапсавалі, ды і сонца было ўдосталь. І горад, у вонкавым абліччы якога чалавек назіральны можа «вычытаць» нямала пазнаваўчых старонак нашай супярэчлівай, багатай і драматычнай гісторыі, шчасліва адпачываў. Ад віру машын (іх рух па цэнтральных вуліцах быў перапынены). Ад будзённай калатнечы. Адпачываў пад музыку фальклорных гуртоў і эстрадных зорак Гарадзеншчыны. Адпачываў у няспешнай плыні мінакоў, сярод якіх было нямала моладзі, сем'яў з дзецьмі-малалеткамі ды яшчэ з каляскамі: выдавала на тое, што пра дэмаграфічны крызіс тут, мабыць, толькі чулі. Адпачынку спрыялі стылізаваныя вясковыя падворкі з хатнім пачастункам, штукарствы мясцовых кандытараў у кавярнях на вольным паветры, адмысловыя вырабы з усіх прыродных матэрыялаў, прапанаваныя майстрамі ды гандлярамі на кірмашы рамёстваў.

•

Ля помніка Адаму Міцкевічу выступала сталічная капэла «Sonorus» пад кіраўніцтвам Аляксея Шута, якая выконвала харавыя творы беларускіх кампазітараў і ўрыўкі з монаоперы Алега Залётнева «Адзінокі птах», прысвечанай А.Міцкевічу і ўвасобленай Беларускім паэтычным тэатрам аднаго акцёра «Зьніч». Тамсама рыхтаваліся выступіць і камерныя калектывы Дзяржаўнага канцэртнага аркестра, ды навальніца вымусіла перанесці гэтую праграму (яе, паводле традыцыі аналагічных фестываляў, суправаджаў захапляльны навукова-асветніцкі каментарый Вольгі Дадзіёмавай) у Дом-музей паэта, дзе, да таго ж, адбылася сустрэча з кампазітарам Эдуардам Зарыцкім, аўтарам песеннага цыкла на вершы А.Міцкевіча, ды разгарнулася персанальная выстаўка мясцовага мастака Кастуся Качана. (Між іншым, быў у той дзень і яшчэ адзін вернісаж: Іван Грынь, загадчык аддзела ідэалагічнай работы Наваградскага райвыканкама, пазнаёміў навукоўцаў і журналістаў са сваёй кампактнай, але змястоўнай фотавыстаўкай «Зямля Наваградчыны, краю мой родны»).

Грунтоўнай атрымалася навукова-практычная канферэнцыя «Гістарычная і культурная спадчына Наваградчыны. Мінулае і сучаснасць», праведзеная пад навуковым кіраўніцтвам мастацтвазнаўцы Барыса Лазукі. На яго думку, важная адметнасць гэтай сустрэчы ў Наваградку ў тым, што яна аб'яднала навукоўцаў сталічных і мясцовых, што, безумоўна, спрыяе ўзаемаабмену ідэямі, узбагачэнню даследаванняў і пошукаў, свежаму погляду на ўжо, здавалася б, даўно адкрытыя і бясспрэчныя рэчы.

•

Гарадская плошча, пры канцы дня ўжо аблашчаная летнім сонейкам, рыхтавалася да кульмінацыі — урачыстага адкрыцця свята і шматгадзіннай музычнай праграмы Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам прафесара Міхала Фінберга. Праграма складалася з некалькіх тэматычных блокаў, і на першым плане, безумоўна, была прэм'ера новай працы — «Песні Перамогі», прысвечанай 60-годдзю вызвалення нашай краіны ад фашысцкай навалы. Але ж адкрыла вечаровы гала-канцэрт прэм'ера песні пра Наваградак, напісанай Эдуардам Зарыцкім на тэкст мясцовага паэта Самсона Пярловіча, — дарэчы, дыск з яе студыйным запісам быў урачыста перададзены маэстра М.Фінбергам у падарунак гораду.

•

Песнямі апеты Наваградак быў урэшце і каранаваны. Яскравымі зоркавымі дыядэмамі ўзнесліся ў вечаровае неба над ім агні феерверка. А роўна праз тыдзень камерныя калектывы аркестра, музыканты Магілёўшчыны ды госці са Смаленшчыны ладзілі канцэртныя праграмы чарговага фэсту — «Мсціслаў-2004». Гэты старажытны горад прымаў Беларускі фестываль мастацтваў ужо трэці раз. Асноўныя імпрэзы прысвячаліся творчасці айчынных кампазітараў-класікаў мінулага стагоддзя Мікалая Чуркіна ды Анатоля Багатырова і музычнай спадчыне сусветна вядомага нашага земляка Міхала Клеафаса Агінскага.

Што далей? Сачыце за музычнымі анонсамі. Працяг адметна-беларускага фестывальнага жыцця будзе. Абавязкова.

С.БЕРАСЦЕНЬ
Фота Марыі Шаблюк

Свята з нагоды "Свята"

Адна з найбольш прэстыжных навучальных устаноў нашай сталіцы — матэматычная гімназія №50. Неўзабаве яна адзначыць свой паўвекавы юбілей. Трапіць сюды вучыцца не так і проста. Дзякуючы паглыбленаму вывучэнню прадметаў матэматычнага цыкла, прафесіяналізму выкладчыкаў веды гімназістаў глыбокія і грунтоўныя. Выпускнікі лёгка паступаюць у вядучыя ВНУ Беларусі, атрымліваюць адукацыю і за мяжой.

У гімназіі даволі часта праходзяць сустрэчы з цікавымі людзьмі. Так, нядаўна адбылася сустрэча з пісьменніцай Таццянай Мушынскай, якую запрасіла класны кіраўнік аднаго з трэціх класаў Людміла Моднік. На вечарыну сабраліся адразу ўсе трэція класы (вучні чацвёртага года навучання). А падставай для размовы стаўся зборнік апавяданняў і казак Т.Мушынскай "Свята печанай бульбы", які нядаўна выйшаў у выдавецтве "Мастацкая літаратура".

Будучыя матэматыкі вельмі сур'ёзна падрыхтаваліся да прэм'еры кнігі, бо ўсе сцены залы былі ўпрыгожаныя малюнкамі — ілюстрацыямі да казак і апавяданняў. Прычым, і з гэтай кнігі, і з папярэдняй — "Віця Неслух у краіне мурашоў", у свой час выпушчанай выдавецтвам "Юнацтва". На малюнках былі адлюстраваныя і іншапланецяне, і Віця, які трапіў да мурашоў, і Чых з Ангінай ды Бабай-Ягой, і яшчэ многія іншыя героі казак і апавяданняў.

У прэзентацыі актыўна ўдзельнічаў (і ўпрыгожыў яе) узорны хор "Ветрык" Мінскай школы мастацтваў, якім кіруе вядомы ў краіне харавы дырыжор Вера Дабравольская. На сустрэчы ў выкананні гэтага хора прагучалі творы "Клён", "Апенькі" (музыка Алены Атрашкевіч, словы Т.Мушынскай), а таксама "Вясёлы цягнік" Уладзіміра Сарокіна (хор, спецыяльна для "Ветрыка"), "Скажы, вада" Уладзіміра Солтана.

Сучасным "камп'ютэрна-матэматычным" дзецям зусім не часта даводзіцца чуць такія прыгожыя акапэльныя спевы. Спачатку трэцякласнікі нават не паверылі, што дзяўчаты з "Ветрыка" спяваюць не пад "фанеру"... "Жывыя людзі гэтак не спяваюць", — ціха перашэптваліся па радах.

Было вельмі цікава і весела. Знайшлося месца і для захапляльнай гульні ў рыфмы (у якой удзельнічалі не толькі юныя матэматыкі, але і настаўнікі, і харысты), і для адказаў на самыя нечаканыя і дасціпныя пытанні. А скончылася прэм'ера кнігі зусім натуральна: усе, хто хацеў, атрымалі аўтографы яе аўтара. Сустрэча ў гімназіі яшчэ раз пераканала, што юныя матэматыкі і фізікі ніяк не абыдуцца без песень і лірыкі.

Т.Т.

Захопленыя родным Прынямоннем

Імпрэза працягвалася дзве гадзіны без антракта, ды (выпадак рэдкі!) ні ў кога з гледачоў не ўзнікала памкнення пакінуць залу раней. Наладзіў тую вечарыну Дзяржаўны музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры РБ. Называлася яна "Таленты лідскага краю", прысвячалася 60-годдзю вызвалення Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў, і атмасфера яе была прасякнута шчырым — без паказнога пафасу — патрыятычным пачуццём. Пачуццё гэтае высноўвалася з песень ды прамоў, з вершаў ды вобразаў на жывапісных палотнах. Высноўвалася праз нягучнае прызнанне ў любові да радзімы, да яе шматаблічнай старажытнай культуры і кранальнай прыроды; праз неўміручую памяць пра яе гісторыю; праз пашану да постацяў знаных і выбітных землякоў; праз простае захапленне жыццём на своеадметнай нашай зямлі.

Чым жа здзівілі-парадавалі таленты Лідчыны?

Лейтматывам іх сустрэчы з мінчукамі ва ўтульнай музейнай зале стаўся вернісаж Рычарда Грушы — мастака, скульптара, яшчэ і аўтара шчырых паэтычных радкоў, з якіх, дзякуючы даравітым мясцовым музыкантам, нарадзілася нямала лірычных песень. Іх прадставіў, сярод іншых твораў, народны тэатр эстраднай песні "Ліда-мюзікл". Яны гучалі таксама ў выкананні народнага ансамбля яўрэйскай музыкі "Шалом" (ён стала і плённа супрацоўнічае са сваім земляком), у чыім рэпертуары арганічна спалучаюцца мілагучнае беларускае слова новых песень, народныя яўрэйскія спеўныя мелодыі ды калярытныя матывы танцаў — дарэчы, з магічна-пранікнёным віртуозным найгрышам саліста-скрыпача. Раз-пораз увага прысутных скіроўвалася на вяхі разнастайнай творчай дзейнасці Р.Грушы, яго біяграфію, на старонках якой — і праца ў калгасе, і першыя праявы таленту мастака-самародка, і гранне на бас-гітары ў малодзёжным гурце, і вайсковая служба ў колішнім Ленінградзе, з якім яму прапаноўвалі звязаць далейшую армейскую кар'еру ды творчае жыццё...

Некрыклівы і нейкі надзвычай дзейны патрыятызм Р.Грушы, самой яго існасцю пацверджаная адданасць радзіме ўразілі ўсіх, каму толькі цяпер давялося пазнаёміцца з гэтай нешараговай асобай. Уразілі яго натхнёныя землякі: музыканты, артысты-аматары, юныя чытальнікі. Усхваляванасць творчасцю нібы перадалася ад гасцей з Прынямоння ўсім прысутным і ўвасобілася ў шчырае захапленне, выказанае, прынамсі, дырэктарам музея Зінаідай Кучар, старшынёй Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА РБ Уладзімірам Шчасным, старшынёй Беларускага фонду культуры Уладзімірам Гілепам...

Выстаўка "Родныя краявіды Прынямоння" прэзентуе толькі часцінку творчасці Рычарда Грушы, чые карціны, скульптуры, адмыслова зробленыя мемарыяльныя шыльды, памятныя знакі, афарміцельскія праекты сустрэнеш у музеях і ў капліцах, у дзіцячых садках і ў калгасах, у самых розных установах і нават пад адкрытым небам, на гістарычных сцежках ва ўсіх кутках

Бацькаўшчыны. Экспазіцыя работ мастака ў музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры працягнецца да сярэдзіны ліпеня.

С.ВЕТКА
Фота В.Патапенкі

Выхавай вучня!

Музыканты — народ звышзаняты. Каб зрабіць такі здымак, трэба было кожнаму з увасобленых на ім персанажаў спрычыніцца да нейкай асаблівай, агульнай для ўсіх нагоды. Сапраўды, гэтае фота —адлюстраванне падзеі, адметнай у гісторыі развіцця айчыннай школы выканальніцтва на домры. Тым вечарам у сталічнай Зале камернай музыкі адбыўся канцэрт навучэнцаў класа вядомага нашага дамрыста Яраслава Валасюка.

Канцэрт, наладжаны ў працяг вядомага філарманічнага цыкла "Настаўнікі і вучні", быў прымеркаваны да 80-годдзя Мінскага дзяржаўнага музычнага вучылішча імя М.Глінкі і прадэманстраваў высокія педагагічныя і творчыя дасягненні гэтай навучальнай установы. Эфектны і складаны рэпертуар, які ўвабраў узоры самых розных эпох, школ, стыляў і жанраў: Накадзава і Тарціні, Мендэльсон і Сарасатэ, Хачатуран і Войцік, Цыганкоў і Клеванец... Саната, канцэрт, партыта, арабеска, сюіта... Гранне сола і ў ансамблі дамрыстаў "Унісон", пад акампанемент фартэпіяна і ў дуэце з гітарай. Афішу ўпрыгожылі імёны ўжо вядомых вучняў Я.Валасюка — лаўрэатаў рэспубліканскага конкурсу Кацярыны Забайрачнай, Алены Халяўскай, Іллі Драгунова (праз нейкі час пасля таго канцэрта ён узяў удзел у міжнародным выканальніцкім конкурсе ў Германіі і атрымаў першую прэмію). У праграме, якую вяла музыказнаўца Іна Зубрыч, удзельнічалі канцэртмайстры Іна Васілевіч ды Ірына Сухаржэўская, малады гітарыст Андрэй Гурыновіч.

Апроч фота, застаўся відэазапіс канцэрта. Яшчэ не раз, і з неаслабнай цікавасцю, будуць глядзець ды слухаць тую касету шаноўны педагог і яго таленавітыя вучні. Будуць шукаць "прыколы" і аналізаваць памылкі, рабіць высновы і вучыцца.Будуць успамінаць сваю нялёгкую творчую працу і яе плён, які ўвасобіўся тым вечарам у сапраўднае свята музыкі.

С.Б.
Фота М.Жураўлёва

Віншуем!

Паўла МАРЦІНОВІЧА з 50-годдзем.

Першыя вершы ён надрукаваў у 1969г. Аўтар паэтычных зборнікаў "Прадвесне", "Час бурштыну"; выдаў кніжкі вершаў для дзяцей "Паспяшайся ў наш звярынец!", "Жыў-быў воўк", "Дзядзька Сон", "Сталёвы бусел". Перакладае з англійскай, літоўскай, польскай, чэшскай моў на беларускую.

Жадаем і надалей поспехаў у жыцці і творчасці.

ЮБІЛЕЙНЫ КАЛЯНДАР

◊ Споўнілася 95 гадоў з дня нараджэння Сяргея ЗНАЁМАГА, аўтара кнігі падарожных нататак "Відагоршчык", зборнікаў нарысаў "Дом № 31", "За дамбаю", "Лес гарыць", аповесцей "Ганчары" і "Біяграфія майго героя"; даследчыка беларускага фальклору і перакладчыка з рускай, украінскай і іншых моў.

◊ 90 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра САВІЦКАГА, аўтара шматлікіх зборнікаў аповесцей і апавяданняў, сярод якіх "Не сотвори зла ближнему», «Улька», «Радость жизни», рамана «И придет твой день», зборнікаў вершаў «После боя», «Сполохи на горизонте».

ПЕРАКЛАДЫ

Міхаіл ЛЕРМАНТАЎ

Ветразь

Бялее ветразь адзінокі
У мройнай прастране
марской!..
Няўжо так вабіць
край далёкі?
Няўжо ён край пакінуў свой?..

Вятрыска хвалі падганяе,
І мачта гнецца і скрыпіць...
Ды ўсё ж не шчасце ён шукае
І не ад шчасця ў даль бяжыць!

Пад ім бруя святлей,
чым просінь,
Над ім і сонца яснатой...
А ён, мяцежны, буры просіць,
Нібыта ў бурах ёсць спакой!

(1832)

* * *

Бывай, нямытая Расія,
Край, дзе і панства,
і прыгнёт,
І вы, мундзіры з бляскам
сінім,
І ты, адданы ім народ.

Магчыма, у гарах далёка
Унікну ад тваіх пашэй,
Ад іх нагледжанага вока,
Ад іх наслуханых вушэй.

(1841)

Лісток

Ад роднай галінкі дубовы
лісток адарваны
У стэп пакаціўся,
няўмольнаю бураю гнаны;
Засох і завяў ён ад холаду,
спёкі і гора,
Нарэшце, усё ж дакаціўся
да Чорнага мора.

Ля Чорнага мора чынара
стаіць маладая;
З ёй шэпчацца вецер, зялёнае
вецце гайдае;
І райскія птушкі на вецці
зусім не сумуюць;
У песнях сваіх услаўляюць
царэўну марскую.

Вандроўнік, як зросся
з карэннем чынары высокай;
Прытулку часовага моліць
са смуткам глыбокім;
І так ён гаворыць:
"Я бедны лісточак дубовы,
Заўчасна я выспеў і вырас
у краі суровым.

Адзін і без мэты па свеце
нашуся даўно я,
Без ценю засох я, завяў
без спачыну-спакою.
Прымі ж ты прышэльца між
лісцяў сваіх ізумрудных,
Я ведаю многа сказанняў
дзівосных і мудрых".

"Ты мне непатрэбны! —
лістку адмаўляе чынара —
Ты пыльны і жоўты, —
сынам маім свежым не пара.
Ты многае бачыў —
нашто мне быліны і жахі?
Мой слых прытамілі даўно
ужо райскія птахі.

Далей падавайся; быць побач
з табой не згаджуся.
Мяне любіць сонца, цвіту
для яго і свячуся:
Па небе я вецце раскінула
тут на прасторы,
Мае карані абмывае
халодаае мора".

(1841)

Запавет

На адзіноце так з табой
Хацеў бы я пабыць:
На свеце мала, братка мой,
Мне засталося жыць!
Паедзеш скора ты дамоў:
Глядзі ж... Ды што?
Пра лёс мой зноў,
Сказаць папраўдзе, знаю,
Ніхто не спагадае.
А запытаюць, што са мной,
Калі хто не забыў,
Скажы, што куляю чужой
У грудзі ранен быў,
Што чэсна за цара памёр,
Што быў на лекараў дакор,
Што ўдзячны свайму краю
Паклон я пасылаю.
Матуля з бацькам у гадах,
Ці быць ім у жывых...
Было б, прызнацца,
так шкада
Мне засмучаць старых;
Калі жывы хто, лепш
сказаць,
Што я лянуюся пісаць,
Полк у паход паслалі,
Скажы, каб не чакалі.
Суседка ёсць у іх адна...
Згадаю, як даўно,
Расталіся!.. Але яна
Не ўспомніць... ўсё адно.
Ёй пра мяне ўсё раскажы
І не шкадуй пустой душы;
Няхай яна паплача...
Нічога ёй не значыць!

(1840)

* * *

Я не люблю цябе; з табой
Сышоў пакут ранейшых сон;
Ды ў маім сэрцы вобраз твой
Жывы, хоць і бяссільны ён;
Другім адданы марам-снам,
Я ўсё забыць яго не мог;
Так храм пакінуты —
ўсё храм,
Кумір абвергнуты —
ўсё бог?

(1831)

Чаша жыцця

1

П'ём з чашы, што дае быццё,
І не глядзім вачамі,
Змачыўшы ў золаце піццё
Свайго жыцця слязамі;

2

Калі ж з вачэй
у смертны час
Павязка ападае
І ўсё, што спакушала нас,
З павязкаю знікае;

3

Тады і бачым мы наўздзіў:
Была пустою чаша,
Што ў ёй напітак —
марай быў,
І што яна — не наша!

(1831)

Пераклаў з рускай
Юрась СВІРКА

Чараўніцтва: ад старажытнасці да нашых дзён

Старажытныя кнігі захоўваюць сведчанні пра таямнічыя хваробы і нават смерці, выкліканыя ліхім чараўніцтвам. Вельмі проста аднесці іх на забабоны нашых продкаў, калі б не найноўшая гісторыя. Яна часам падкідае старыя, як свет, сюжэты.

Сакрэты магіі былі вядомыя чараўнікам Індыі, Вавілона і Егіпта, Грэцыі і Рыма. І старажытныя народы, і сучасныя афрыканскія, аўстралійскія плямёны карысталіся і карыстаюцца магічнымі сродкамі, каб пазбаўляцца ворагаў.

«Чужым вачам — соль ды пячаль»

Яшчэ дагэтуль шмат у якіх народаў, у тым ліку і ў беларусаў, захаваўся звычай старанна хаваць састрыжаныя валасы і пазногці, малочныя зубы дзіцёнка, рэшткі ежы. У старажытнасці страх перад заклінальнікам прымушаў людзей свята верыць, што праз гэтыя рэчы можна нашкодзіць іх былому ўладальніку.

Навукоўцы і даследчыкі паранармальных з'яў распавядуць пра шкодны ўплыў і адмыслова зробленых вузлоў.

Па ўсёй Беларусі вядомыя «заломы». На полі ахвяры завязваюць пук жыта і прамаўляюць над ім праклён. Раскруціць залом проста так нельга, яго можа абясшкодзіць толькі другі чараўнік або хрысціянскі святар. Ад сурокаў нітку з вузламі клалі ў кавалак хлеба, завязвалі ў анучу і неслі на скрыжаванне дарог. Каб засцерагчыся сурокаў, насілі і цяпер носяць на руках і нагах чырвоныя суконныя ніткі, завязаныя ў тры вузлы. Раней ад зубнога болю павязвалі на шыі ці руцэ матузок на дваццаць сем вузлоў. Ад бародавак дапамагае столькі вузлоў, колькі іх высыпала на целе, калі хто падыме тую нітку — на таго яны і пяройдуць. Тую нітку кладуць на раздарожжы, за трыццаць тры крокі ад крыжа ці пад дзвярыма з разлікам: як вузлы сатруцца, так і бародаўкі знікнуць. У беларускіх замовах ад ліхіх чараў ёсць такія словы: «Хто карову ўракне — таму кроўю вочы завалакне. Чужым вачам — соль ды пячаль».

Нават цяпер варта прыехаць на вёску і, калі ты не чужы мясцовым людзям, яны раскажуць такія гісторыі!..

Знойдуцца «бабкі» ці «дзяды», да якіх суседзі ходзяць у скрайнім выпадку па параду ці лекавыя расліны. Ходзяць, калі сцямнее, каб паменей цікаўных бачыла.

Здольнасці ў такіх бабак і дзядоў розныя: хто лечыць, хто мужа ў сям'ю верне, хто бязладнага мужыка ад бутэлькі адгаворыць ці сурок здыме. А ёсць і такія, што могуць самі сурочыць і чалавека, і свойскую жывёлу. Тых, хто валодае такімі здольнасцямі, завуць у народзе вядзьмаркамі і ведзьмакамі, чараўніцамі і чараўнікамі. Да іх ніхто не ходзіць у госці проста так, хіба што ліхія людзі.

Сеансы магіі ці ашуканства

Цяперашнія чараўнікі выкарыстоўваюць «чары на след» — выразаюць след нажом і апоўначы спальваюць яго ў лазні. Загаворваюць ежу і пітво, часцей за ўсё дадаюць туды ваду, якой абмывалі нябожчыка. Робяць яны і «падклады», паніншаму «падкідкі», «завіткі» — спецыяльна замоўленыя рэчы, што падкідаюць на парог дома ці ў дом. Найбольш распаўсюджаныя падклады — грошы, валасы, яечнае шкарлупінне, скарыстаныя запалкі, свечкі, мяшэчкі з сухой зямлёй, голкі, пашкоджаныя фотаздымкі. Завязваюць вузлы з праклёнамі. Карацей, арсенал вядомы са старажытнасці...

І ў вялікіх гарадах ёсць людзі, якія прафесійна займаюцца чараўніцтвам. Хто з вас не бачыў абвестак у газетах, на вулічных слупах, у гарадскім транспарце? У іх рознага кшталту магі і «сэнсы» прапануюць поўны набор паслуг. Я не паленавалася, пазваніла. Гаварыць даводзілася загадкамі, іншасказамі. Маё ўяўнае жаданне адправіць на той свет сябра, які нібыта моцна пакрыўдзіў мяне, зразумелі адразу і ўспрынялі без асаблівых эмоцый, занатавалі ў нейкі нябачны мне спіс і прызначылі час сустрэчы. Я не пайшла, палічыла ўсё гэта ашуканствам. Дый неіснуючага сябра пашкадавала, раптам выпадкова знойдзецца ягоны поўны цёзка...

Доктар Джэйс Сі Баркер расказвае ў сваёй скандальнай працы «Спалоханыя да смерці» пра самы распаўсюджаны метад абарыгенскай магіі: пра костку, скіраваную на нябачнага ворага ў суправаджэнні «Песні Смерці». Вядомы антраполаг згадвае выпадак, калі ахвяра гэтага рытуала памерла, нягледзячы на адсутнасць якіх-небудзь сімптомаў хваробы. Для абарыгена было дастатковым даведацца пра тое, што «ў яго гонар» праспявалі «Песню Смерці». Небарака ледзь запоўз у сваю хату і ў сутаргах сканаў. Сіла і моц чараўніка ў старадаўнія часы былі бясспрэчныя. Можна шукаць тлумачэнне ў асаблівасцях першабытнай свядомасці, у выключнай веры людзей у магію і чараўніцтва, як робяць тое навукоўцы, але... узгадаю адзін выключна дзіўны факт.

Тое адбылося ў 90-х гадах у інтэрнаце тады яшчэ Беларускага політэхнічнага інстытута. Адзін студэнт-першакурснік, дарэчы, матэрыяліст і цынік, паскардзіўся сябрам: як толькі ён заходзіць да сябе ў пакой, яго агортвае панічны жах — быццам нехта сочыць за ім; засынае і бачыць жудасныя сны. Пасля іх на целе з'яўляліся незагойныя драпіны. Суцэльнае вар'яцтва! Але па-за пакоем усе адзнакі вар'яцтва знікалі самі па сабе. Напалоханы малады чалавек стаў начаваць у сяброў і знаёмых. Усе кплі з яго, але потым зразумелі — не да жартаў.

Неўзабаве студэнт расказаў, што знайшоў пад сваім ложкам у інтэрнаце нейкую брыду — ліпкае рэчыва з пер'ямі і пасмамі валасоў. Пачаў распытваць інтэрнацкіх старажылаў: высветлілася, што ўсе папярэднія жыхары пакоя выязджалі праз месяц пасля засялення. І толькі іх сусед-афрыканец, непрыветлівы, змрочны хлопец, спакойна жыў там на адзіноце. Ад іншага знаёмага афрыканца дазналіся, што яго змрочны зямляк не раз пахваляўся сярод іншых афрыканцаў, што «рабіў суседзям магію». Наш студэнт нарэшце дамогся, каб яго перасялілі ў іншы пакой.

Малюнак А. Пата

Куды пойдзе разважны скептык?

Ёсць у акультыста С. Тухолкі такая праца: «Акультызм і магія». Прывяду з яе наступную цытату: «Энвальтаванне ці замова на каго-небудзь ёсць, па сутнасці, уплыў аднаго чалавека на астральнае цела другога, і звычайна выкарыстоўвалася чараўнікамі з мэтай забіць абраную ім ахвяру. Сурочаны чалавек пінуў ці ад беспрынцыпнай слабасці, ці ў нешчаслівым здарэнні».

Энвальтаванне на смерць — адзін з самых мярзотных магічных рытуалаў. І цяпер у сутнасці ён нічым не розніцца ад метадаў старадаўніх чараўнікоў: выкарыстоўваюцца валасы, васковыя лялькі, голкі, агонь.

У чалавечай супольнасці ўсё ўраўнаважана. Калі ёсць так званыя чараўнікі-кіперы, то абавязкова знойдуцца і тыя, хто з імі змагаецца. Сутыкнуўшыся з праявамі чорнай магіі, людзі шукаюць паслуг белых магаў. Аднак, часам абыходзяцца і сваімі сіламі.

У Мінску, як вынікае з газетных абвестак, ёсць і бабкі-вядуні, і знахаркі, і чараўніцы, але іх здольнасці выклікаюць сумнеў у разважных людзей. А разважныя, сур'ёзныя людзі часам шукаюць тлумачэнні незразумелым, звышнатуральным з'явам, што адбываюцца з імі ці з іх роднымі. Да каго пойдзе разважны скептык? Вядома, да навукоўцаў. Ці ёсць у Беларусі прафесійныя навукоўцы-парапсіхолагі, даведацца не ўдалося, але ў Расіі, у прыватнасці, у Маскве, такія навукоўцы амаль легальна займаюцца парапсіхалагічнай практыкай. Менавіта, «амаль»... Рэкламай у газетных абвестках яны не карыстаюцца. Кліенты да іх ідуць самі, дазнаўшыся ад знаёмых пра падобныя паслугі. Пашчасціла ў пошуках і мне, адзін знаёмы маскоўскі літаратар, рэдактар у камерцыйным выдавецтве, падказаў нумар тэлефона і абяцаў зрабіць пратэкцыю. Абяцанне выканаў. Хаця і адмовіўся расказаць, па што сам звяртаўся да спеца ад парапсіхалогіі.

Патэлефанавала без асаблівай надзеі на поспех. Мой нябачны тэлефонны суразмоўца прыгадаў агульнага знаёмага — рэдактара і яго просьбу, аднак папярэдзіў, што прозвішча свайго не назаве, так і застаўся таямнічым Вадзімам Пятровічам, хоць і дадаў, што маці яго родам з Беларусі, з Гомеля. Відаць, у яго былі важкія падставы заставацца «напалову інкогніта». Спачатку гаварылі па тэлефоне, але пытанняў было шмат, таму хвілін праз дзесяць парапсіхолаг дакляраваў мне, што дашле электроннай поштай некалькі сваіх дакладаў і фрагменты з кнігі, якую піша ўжо не першы год для аднаго з маскоўскіх выдавецтваў.

Са спробамі магічнага забойства парапсіхолаг Вадзім Пятровіч у сваёй практыцы сустракаўся, але рэдка.

— Рэч ў тым, што магам-кіперам можа стаць толькі чалавек з пэўнымі здольнасцямі, а такіх на тэрыторыі былога СССР адзінкі. Але, без сумневу, ёсць спецыялісты, якія працуюць на замову.

Мне было цікава, якім чынам здымаецца сурок на смерць. У адказ:

— Галоўнае «ўбачыць» чалавека, які сурочыў і зразумець прычыну: навошта? Чаму? Забіваюць жа не ў п'янай бойцы, а на цвярозую галаву — магіяй забіваюць за нешта. І калі «бачна», хто заклаў негатыўную праграму, — яе можна знішчыць. Негатыўныя праграмы закладаюць не толькі чараўнікі і ведзьмакі, а і...

І Вадзім Пятровіч расказаў такую гісторыю з уласнай практыкі.

Да яго звярнулася дзяўчына. У яе кватэры пачалі самазапальвацца рэчы, праводка. Узніклі праблемы са здароўем. Да парапсіхолага яна вырашыла звярнуцца пасля таго, як знайшла пад дзвярыма сабачую поўсць і пентаграму — кавалак пластыліну з зоркай, выкладзенай запалкамі. Дзяўчына толькі што пабралася шлюбам з даволі заможным мужчынам, на 20 гадоў старэйшым за яе. Былая жонка бізнесоўца звярнулася да вядомага ў Маскве чараўніка, які і вырашыў за адпаведную плату звесці са свету новую жонку.

І другі выпадак.

Мужчына — медык, яго забойства замовіла жонка. Прычына банальная — агульныя кватэра, машына. А ён знайшоў сабе новую жанчыну. У выніку: тры разы запар — рэанімацыя. Спачатку інфаркт, потым дыябетычная кома і ўрэшце — смяротны інсульт. Уявіце сабе — здаровы пяцідзесяцігадовы мужчына, які ніколі не хварэў, і... Яго прывяла да парапсіхолага каханка, як толькі ён выйшаў з бальніцы пасля комы. Прычыну высветліць паспелі, але было ўжо запозна.

Магічнае забойства з пункту гледжання здаровага сэнсу — поўная лухта. Але мой суразмоўца так не лічыць:

— Людскія нянавісць, крыўды, зайздрасць нараджаюць асаблівы таемны свет, дзе існуюць чорныя магі, яны могуць за грошы забіць чалавека, забраць яго душу. Але ёсць і тыя, хто змагаецца з цёмнымі сіламі, здымае сурокі, разбурае закляцці.

Гэта асаблівы свет, але належыць ён рэчаіснасці. Вось некаторыя «сакрэты» сучасных спецыялістаў ад чорнай магіі:

— Каб забіць чалавека, маг імкнецца вывяліць, «сфатаграфаваць» яго псіхалагічны настрой. Калі ахвяра падуладная гіпнозу і верыць у магію, гэта спрошчвае задачу. Калі не, шукаюць слабое месца ў яе псіхалагічнай абароне. Каб магічны ціск спрацаваў, расхіствае чалавеку псіхіку. Ідзе псіхалагічная падрыхтоўка: тэлефонныя званкі дадому і на працу. Маўчанне ў трубцы. Потым кажуць жудасныя рэчы. Яны канцэнтруюцца вакол думак пра смерць і прагі смерці. Каб псіхалагічны ціск спрацаваў, патрэбна эмоцыя ў адказ — страх. Вельмі важна, каб у чалавеку пасяліўся страх. Замовы на магічнае забойства робяць, як правіла, на людзей, якія маюць грошы і ўладу, а яны — больш за іншых уразлівыя. Яны пастаянна баяцца згубіць багацце, уладу і жыццё. Калі пачынаюцца «цёмныя» званкі, ахвяра актывізуе сваю ахову, наймае новых людзей — ідзе напампоўванне абставінаў, і чалавек «адчыняецца для ўздзеяння». Далей і адбываецца гэтае энергаінфармацыйнае ўздзеянне — пучок канцэнтраванай энергіі, якая прасякнута адпаведнай думкай, накіроўваецца ў падсвядомасць чалавека.

Мы адрозніваемся ад жывёлаў тым, што ў нас ёсць духоўная праграма развіцця, а ў ёй — код жыцця і код смерці. Код смерці дапускае ўмовы, пры якіх ён спрацоўвае. Задача мага-кіпера прывесці гэты код у дзеянне. Для гэтага трэба ведаць, на што чалавек хворы, чаго баіцца, вызначыць яго псіхатып. Вопытны маг можа ўсю неабходную інфармацыю счытаць з фотаздымка і яе ж выкарыстаць у якасці магічнага маста для канцэнтрацыі.

Ну што, цяпер зразумела, што не варта малавядомым і незнаёмым людзям давяраць свае фотаздымкі, а тым больш карткі з гісторыяй хваробы?!

У аддаленых кутках падсвядомасці...

Не сакрэт і тое, што ў наш час дасведчаны псіхолаг можа такім чынам сканструяваць і «закадзіраваць» свае формулы ўздзеяння, што чалавек свядома іх не ўспрымае, але зафіксуе падсвядома. Парапсіхолагам вядома таксама, што ёсць на тэрыторыі былога СССР і такія магі-кіперы, якія ажыццяўляюць магічнае забойства праз падключэнне так званага цэнтра пакарання.

«...Мозг чалавека мае зоны, якія мы называем цэнтрамі пакарання. Справа ў тым, што нашы няправедныя ўчынкі фіксуюцца ў падсвядомасці. Жадае чалавек таго ці не, ён падсвядома сам прызначае сабе кару за зробленае, яго кат сядзіць у ім самім. Цэнтр пакарання можа быць не «падключаны» да псіхічнага жыцця чалавека, і тады ён цалкам спакойна грашыць. Але пры адпаведных жыццёвых абставінах цэнтр падключаецца, і тады спрацоўвае праграма пакарання — чалавек трапляе ў абставіны, надзвычайна небяспечныя для яго, нешта накшталт праграмы самазнішчэння.

Ёсць людзі, здольныя падключыць цэнтр віны з дапамогай фіксацыі сваёй свядомасці, тэлепатычна, падчас сну. І тады віна разбурае ахвяру ўздзеяння». З гісторыі вядома, што адзін індыйскі раджа трымаў у сябе на службе ёга-ката, які катаваў людзей адным толькі поглядам. Калі чалавек быў вінаваты — ён паміраў, кроў адлівала ад галавы і яго ўжо нельга было выратаваць. Калі ж віны не было, то чалавек проста страчваў прытомнасць, але заставаўся жывы. Псіхолагі цалкам дапускаюць магчымасць такога ўздзеяння. Псіхіка чалавека захоўвае вялікае мноства таямніц...

Можа, тут і схаваны сакрэт непазбежнай адплаты за грах?

Давялося мне паверыць, што магі-кіперы ў наш час зусім не міфічныя фігуры. Яны ёсць, іх паслугамі карыстаюцца. Але адкуль усё ж такі яны бяруцца?

Паводле слоў Вадзіма Пятровіча, лепшую групу выканаўцаў магічных забойстваў складае шматлікі атрад махляроў. Гэтыя людзі выкарыстоўваюць цікаўнасць да тэмы, яны пастаралі рознага кшталту акультныя арганізацыі, паадчынялі свае школы і выдаюць «міжнародныя дыпломы» па магіі і экстрасэнсорыцы. Парапсіхалагічнымі здольнасцямі яны не валодаюць, але затое маюць цудоўны камерцыйны талент і робяць грошы на падмане заказчыкаў. Шкоды ад іх не шмат, церпяць толькі тыя, хто да іх звяртаецца.

Другая, не менш шматлікая група — людзі псіхічна хворыя, і таму сацыяльна небяспечныя. Яны сконнылі т. зв. «магічныя» школы і цяпер ўпэўненыя, што насамрэч здатныя кіраваць жыццём і смерцю людзей. Большасць газетных абвестак наконт чорнамагічных паслуг даюць яны.

Трэцяя, нешматлікая група — людзі з пэўнымі прыроднымі здольнасцямі — у асноўным, вясковыя варажбіткі, яны перадаюць свой талент і веды ў спадчыну. Трапляюцца і гараджане, якія не заўсёды і ведаюць пра свае здольнасці. Ёсць і тыя, хто карыстаецца сваім дарам у крымінальных мэтах.

Пасля развалу Савецкага Саюза з'явіліся парапсіхолагі з новым мысленнем, гатовыя змагацца з чорнай магіяй. Большасць людзей слаба ўяўляе сабе, якія жудасныя распрацоўкі вяліся ў сакрэтных і паўсакрэтных лабараторыях. У Савецкім Саюзе сур'ёзна займаліся парапсіхалагічнымі даследаваннямі. Паводле ЦРУ, 29 савецкіх лабараторый бралі ўдзел у «звышнатуральнай гонцы ўзбраеннямі». Большасць з іх знаходзілася ў Маскве, іншыя ў Алма-Аце, Харкаве, Кіеве, Новасібірску, Краснадары, Ленінградзе, Адэсе, Пушкіне, Тбілісі.

Асаблівая ўвага надавалася магчымасці кантраляваць дыханне і рытм біцця сэрца, прыпыняць іх на адлегласці. Той жа праблематыкай займаліся і ў ЗША. ВМС ЗША заказвалі падобныя даследаванні па прыпыненні жыццёвых функцый шэрагу навуковых інстытутаў у Каліфорніі.

Вядома пра паспяховыя эксперыменты па дыстанцыйным адключэнні свядомасці чалавека на 2—3 секунды. Гэтага дастаткова, каб справакаваць аўтакатастрофу.

Магічнае кіперства — небяспечная тэма. Вельмі шмат з'явілася зацікаўленых у гэтай галіне людзей, што насцярожвае і нават палохае спецыялістаў. Парапсіхалагічныя лабараторыі савецкіх часоў знікілі. Але спецыялісты засталіся. І ці варта казаць, што іх напрацоўкі маюць пэўную камерцыйную каштоўнасць.

Страх перад магіяй зусім не знік у сучаснага чалавека, ён толькі схаваўся ў аддаленых кутках падсвядомасці і час ад часу нагадвае аб сабе. Сполах гэты ірацыянальны, ён існуе незалежна ад нашых ведаў і перакананняў.

Надвячоркам вяртаюся дахаты. На асфальце пяцітысячная купюра, пакрэмзаная чырвоным маркерам. Прыпынілася і пайшла далей. Прыгадалася, што чараўнікі скідаюць на грошы розныя хваробы, пошасці. Няхай ляжыць. А вы падняліб?

Ірына ЗАНЕЎСКАЯ

Успамін ля палутаркі

За музеем Вялікай Айчыннай вайны ёсць пляцоўка. На ёй розная баявая тэхніка часоў Вялікай Айчыннай вайны. Ёсць там і колькі даўніх, даваенных грузавікоў. Падышлі мы да аднаго з іх. Дзядуля сказаў: "От на такой палутарцы майго тату павезлі на вайну. Я бег за ёй і крычаў: "Тата, татачка! Не кідай мяне!" Пакуль не спатыкнуўся, не ўпаў у пясок. Гэта бачылі людзі, яны плакалі...

Дзядулеў тата — гэта мой прадзед. Звалі яго Ілля. Ён быў кавалём, млынаром. У яго былі залатыя рукі. Ён усё ўмеў, але не ўмеў ваяваць. Ён быў мірным чалавекам. Яго не вучылі ваяваць, і ён не хацеў ваяваць, ён хацеў працаваць.

З таго дня яго больш ніхто не бачыў у роднай вёсцы... Кажуць, што загінуў дзесьці пад Рагачовам. Разам з ім быў аднавясковец, сусед дзядзька Хама. Ён расказваў, што там, дзесьці каля рэчкі, шлі вялікія баі. Страляніна, выбухі, стогны, енкі параненых. Свішчуць кулі, рвуцца снарады — агонь, дым... Сапраўднае пекла. А мой прадзед Ілля з маленства недачуваў, у час бою зусім не арыентаваўся, што робіцца вакол яго. Дзядзька Хама ўзгадваў: "Я паўзу, і Ілля паўзе... Я падаю, і ён падае... Я бягу і ён бяжыць..." І раптам сярод гэтага пекла дзядзька Хама пачуў: "Хама, Хама!!!" Ён азірнуўся і ўбачыў, што Ілля качаецца на беразе паранены, з пасечанымі асколкамі грудзьмі. Памагчы было ніяк нельга, бо затрымаешся на секунду — і з ім разам ляжаш. Што далей адбылося, ніхто не ведае. Можа, у рэчку Ілля ўкаціўся, ці крывёю сцёк, ці немцы скончылі яго пакуты на векі вечныя. А было яму усяго трыццаць два гады...

Калі прадзеда Іллю забралі на вайну ў 1941 годзе, майму дзядулю Уладзю не было і чатырох гадкоў. Вайна зачапіла і яго, нават вельмі моцна. Праз выбух нейкага запалу ён стаў інвалідам на зрок. Зараз яму 66 гадоў. Успамінае дзядуля пра развітанне з татам вельмі шчымліва, са слязой на вачах. Мяне гэта кранула, і я вырашыў напісаць пра дзеда Іллю.

Са школьнага сачынення Сержука ЧЫЛКІНА-САДЭЛЬСКАГА вучня 6 класа СШ №51 г. Мінска

Калі спісваць не мае сэнсу

Скончыўся вучэбны год, але засталіся многія праблемы навучання, якія педагогам прыйдзецца тэарэтычна і практычна вырашаць з 1 верасня. І тут карысным будзе набыты сёлета станоўчы вопыт па арганізацыі вучэбнага працэсу.

Каб зрабіць працэс навучання асэнсаваным і больш карысным, трэба шмат увагі надаваць арганізацыі самастойнай працы школьнікаў на ўроках. У СШ № 57 г. Мінска настаўнікі заўважылі, што нават старшакласнікі не ўмеюць самастойна працаваць, вызначаць мэту і суадносіць з ёю шляхі вырашэння пастаўленай задачы. Акрамя таго, час на ўроку вучнямі выкарыстоўваецца нерацыянальна: мацнейшыя працуюць напаўсілы, а слабейшыя не паспяваюць выконваць заданне.

Было вырашана паспрабаваць аформіць напрацаваны матэрыял па некаторых дысцыплінах у выглядзе модуляў. Модуль уяўляе сабой матэрыял урока і ўказанні па працы з ім. Тэкст яго можа дапаўняцца вытрымкамі з падручніка, падрабязнымі тлумачэннямі складаных пытанняў, адлюстроўваць інфармацыю з дапамогай табліц, схем, дадатковых заданняў.

Дзеці выконваюць указанні модуля, а настаўнік працуе індывідуальна з тымі, у каго ўзнікаюць пытанні, або дае франтальныя тлумачэнні. Такім чынам, педагог паспявае надзяліць увагай большую колькасць вучняў, чым звычайна, і адначасова вырашыць праблему спісвання. Адзнакі выстаўляюцца па выніках тэматычнага кантролю (кантрольныя, практычныя, самастойныя работы), а з мэтай аб'ектыўнай ацэнкі ведаў прапаноўваюцца на выбар заданні пяці ўзроўняў складанасці.

Навучэнцы паступова ўсведамляюць, што якасць засваення матэрыялу залежыць ад іх саміх, а не ад тлумачэнняў настаўніка. Пры такой арганізацыі навучання на ўроку ўлічваецца індывідуальны тэмп працы літаральна кожнага вучня і знікае псіхалагічнае напружанне, бо адразу дзецям вядома, што канкрэтна і ў якой форме яны будуць выконваць, на якія пытанні адказваць. Разам з тым, — і гэта важна, адбываецца праца не на адзнаку, а на набыццё ведаў. У вучняў з'яўляецца адчуванне поспеху, стымул знайсці памылку, выправіць яе ды ісці далей, нараджаецца вера ва ўласныя сілы. Да таго ж, пасля навучання па праграме модульных тэхналогій дзеці могуць працаваць самастойна нават пры адсутнасці гатовых метадычных указанняў.

З выпускнога балю гімназіі №2
Фота А. Петаленкі

Што ў школьным патрфелі?

На Гомельшчыне аб'яўлена дабрачынная акцыя "Збяры школьны партфель". Гэта мерапрыемства прадугледжвае за кошт ахвяраванняў прадпрыемстваў і арганізацый, а таксама жыхароў вобласці аказаць дапамогу дзецям, якія выхоўваюцца ў малазабяспечаных, апякунскіх сем'ях, з'яўляюцца інвалідамі, сіротамі. Для многіх з іх школьны партфель з камплектам канцтавараў, неабходных для заняткаў, стане сапраўдным падарункам.

Акцыя працягнецца да пачатку вучэбнага года. Па папярэдніх дадзеных, у ёй прымуць удзел каля 40 прадпрыемстваў, што дасць магчымасць дапамагчы не менш за 100 школьнікаў.

У вялікі свет

У Беларускім гуманітарным ліцэі прайшлі выпускныя экзамены. Цяпер многія выпускнікі будуць працягваць адукацыю ў Беларусі, а частка з іх — у Чэхіі, Літве, Польшчы і Германіі. На выпускным балі прысутнічалі прадстаўнікі дыпкорпуса і беларускай інтэлігенцыі.

Між тым, другакурснікі ліцэя паспяхова здалі экзамены за курс базавай школы. Вядзецца таксама набор на першы курс.

Абеліск ля дарогі

Не, я ніколі цябе не забуду, мой радзіны верны сябра! Дагэтуль жыве ўспамін пра нашы гульні, спрэчкі, кнікі, суседскія сады, рэчку... Толькі цябе няма, і я вінен у гэтым! Прабач мяне, Паўлік!..

Мы мелі пад Кіевам хату, каня, карову, пяць курыц і кавалачак зямлі. Мама мая працавала на пошце, а бацька быў дырэктарам калгаса. Я хадзіў у шосты клас нашай вясковай школы. Там жа я пазнаёміўся з Паўлікам Цыганком.

Гэта быў смуглатвары, з чорнымі, як вугалёк, валасамі і чорнымі вачыма хлопчык, тоненькі, як хварасцінка. Яго бацька памёр, калі Паўліку было тры гады. Ён дапамагаў маці, хадзіў у магазін, шчапаў дровы, насіў ваду ў хату. Мы часта насміхаліся над ім, тады яго дзіўныя вочы неяк загараліся, твар чырванеў, вусны моцна сціскаліся. Ён нахіляў уперад галаву, і яго кучаравыя валасы — яго адзіны гонар — лезлі нават у вочы. Хлопчык рабіўся нейкім маленькім і змаўкаў надоўга.

Настаўнікі шкадавалі Цыганка, дапамагалі ў вучобе, толькі адна Рэпіна Генрыхаўна, настаўніца матэматыкі, яго не любіла.

Незадаволенасць узрастала. І вось аднойчы настаўніца ўдарыла Паўліка. За нявывучанае правіла. Цыганок увесь скалануўся і... праз зубы працадзіў:

— Фашысцкая шаўка!

...Праз дзень Павел Цыганок, вучань 6"А" класа, быў выключаны са школы. Немцы лютавалі. Хутка школу закрылі зусім.

Паўлік быў нашым суседам, але я з ім ніколі не гуляў разам. У нашых вачах ён быў "бабскім прыспешнікам", і вялікая бездань праляглa між намі... Але страшная падзея паклала ўсяму канец. Аднойчы ноччу маці ўскочыла і закрычала:

— Гарыць! Хата Цыганкоў гарыць!

Крык разнёсся па ўсёй вёсцы. Людзі, наспех апранутыя, беглі тушыць пажар. Але немцы жудаснай карычневай сцяной заступілі шлях дапамогі. Ледзянілі кроў халодныя жалезныя дулы аўтаматаў.

Людзі беглі да сваіх хат, але іх даганялі кулі, прабівалі гарачыя ўкраінскія сэрцы... Хутка вуліцы абязлюдзелі. Хаты дагарала, а маці Паўліка застрэлілі. На вачах сына. Яна крыкнула:

— Сынку, ты дзе?!

Але яго ўжо тут не было.

Мы спаць не клаліся. Седзячы ў кухні, маці ўспамінала жыццё Магды Цыганок і ні словам не абмовілася пра расстрэл. Мы чулі гэтыя страшныя словы ў яе голасе, чыталі ў яе вачах.

Раптам у цішыні раздаўся стук. Бацька схапіў стрэльбу і пайшоў адчыняць дзверы. Нехта стукнуў яшчэ. Маці збялела, узяла мяне за плечы і зазірнула ў дзверы. Там стаяў Паўлік.

Бацька схапіў хлопчыка за каўнер і ўцягнуў яго ў пакой, шчыльна зачыніўшы дзверы. Ніхто нічога не пытаў, не разведваў. Проста Паўлік стаў жыць у нас як мой брат і лепшы сябар на свеце.

Цэлых два месяцы мы былі разам. Немцы заціхлі, і як хораша было дзецям гуляць, не хаваючыся ад ненажэрных фрыцаў! Здаецца, час, праведзены з Паўлікам, быў найлепшым у маім жыцці. Цыганок выдатна размаўляў на беларускай, рускай і ўкраінскай мовах, ведаў на памяць шмат вершаў Шаўчэнкі. З ім было цікава гуляць, можна было размаўляць на любую тэму, даверыць кожны сакрэт. Мы ні на хвіліну не разлучаліся.

Іменна тады з'явілася наша вялікая любоў да марак. Маркі мы, здавалася, толькі з-пад зямлі і не выцягвалі. Мае таварышы былі таксама заядлыя філатэлісты. Больш за ўсё я зайздросціў Андрэю Клеменчуку. Альбом яго напіхваў трыста з гакам самых рэдкіх марак, у мяне ж было толькі пяцьдзесят. Паўлік меў два альбомы па сорак марак. Мы аб'ядналіся ў гурток юных філатэлістаў і абменьваліся між сабой. Але гэта працягвалася нядоўга.

Фашысты зноў пачалі нападаць на нашу вёску. Амаль кожны дзень каля нашай хаты строем праходзілі немцы, "карычневая чума". Тады Паўлікавы вочы зноў здзіўлялі мяне, як раней, у школе. Ён сам сабе ціхенька нешта шаптаў і выходзіў з пакоя. Мы ведалі, што Цыганок дапамагаў партызанам.

У немцаў, якія размясціліся ў нашай вёсцы, пачаў часта намакаць порах, хлеб быў горкі, знікала соль, у легкавых аўтамабілях былі праколатыя шыны. Неяк фрыцы даведаліся, што шкодніка завуць Павел Цыганок і што ён жыве ў нашай хаце. Пазней мы вызначылі, што яго выдаў Антон, рыжы здаровы дзяцюк, якога мы пазбягалі. Але ён кудысьці знік, і мы яго не бачылі.

Аднойчы я, Андрэй і Паўлік у двары гулялі ў даміно. Раптам адчыніліся веснічкі і ўвайшоў ... нямецкі афіцэр. Ён падышоў да мяне і сказаў ісці за ім. Андрэй збялеў. Я зірнуў на Паўліка — яго твар заставаўся спакойным.

... — Малшик, понимайть твоя, о чём моя говорить? Твоя вести маленький противный малшик и получать моя марки. Потом твоя получать еще много маркт! Ошень, ошень много марки!

І я ...згадзіўся...

— Ну? Што табе казалі? — наперабой пыталі сябры. Я няўпэўнена мямліў нешта наконт таго, што памыліліся адрасам, некага шукалі, але я яго не ведаю. Андрэй супакоіўся і хутка пайшоў. Тады Паўлік падышоў да мяне блізка-блізка і шапнуў:

— Лёнька, скажы лепш праўду. Скажы: мяне шукалі? Ты... ты заклаў?

Нешта мне балюча калола ўнутры. Як я мог?! Гэта ж мой сябра, мой брат! Але я раптам пачуў голас, МОЙ голас:

— Не, не цябе шукалі... — і тут я сарваўся. — І пакінь мяне! Што ты за мной ходзіш? Ідзі прэч! Прэч!

Паўлік нахіліў галаву, кучаравыя цыганскія валасы перашкаджалі бачыць, а вочы... Я зноў здзівіўся. Вось так ён стаяў у школе, калі мы насміхаліся над ім. Вось такія вочы былі ў яго, калі настаўніца незаслужана ўдарыла яго. А я... ён верыў мне, а я не апраўдаў яго надзеі... Як я мог...

— Паўлік, схадзі са мной, калі ласка. Цыганок стомлена, дакорліва зірнуў на мяне:

— Ну што табе? Чаму я?

— Хутчэй, нас чакаюць.

... Мы ішлі побач і маўчалі. Нарэшце Паўлік ціха мне сказаў:

— Я ведаю, куды мы ідзем. Я ведаю, што будзе потым. Памятай: я прабачыў бы табе ўсё, толькі не здраду. Такое не забываюць.

І ўсё.

Мы ішлі моўчкі.

Раптам я заўважыў: гарэла хата Клеменчукоў. Ніхто не бег на дапамогу — немцы лютавалі. Полымя шугала ўверх, у начным небе, як зоркі, рассыпаліся іскры. Вакол стаялі фрыцы, рагаталі і падкідвалі дровы ў крывавае вогнішча. Мы з Паўлікам накіраваліся туды.

Вось і немцы. Я бачыў толькі іх вялізныя спіны, туга абцягнутыя карычневымі кажухамі. Яны глядзелі на пажар, гучна смяяліся... А я думаў: там загінуў мой сябар Андрэйка, яго тата і мама, маленькая сабачка Малька, кошка Рыска і пяць кацянятак...

... — Я — Павел Цыганок! — Паўлік распіхаў аслупянеўшых фрыцаў і выбіўся на сярэдзіну круга, — Я! Бачыце? — мой сябар раскінуў рукі і крыкнуў: — Страляйце! Што ж вы? Страляйце!

Белабрысы афіцэр даў салдатам знак страляць. Мне здалося, што тлусты немец не прашаптаў, а закрычаў на ўвесь свет гэтае страшнае слова.

Паўлікавы нервы даўно ўжо здалі. Ён крычаў:

— Страляйце! Забойцы, каты, здраднікі, страляйце! — і вочы яго былі нейкія дзіўныя.

Безліч куль паляцела ў зямлю. Толькі адна — куля рыжага Антона — трапіла ў цэль. Куля здрадніка прабіла геройскае сэрца.

... Я бег, не чуючы пад сабою ног. У вушах яшчэ гучала страшнае "Страляйце!" і няўмольныя стрэлы. Толькі каля свайго дома я адчуў, што трымаю тры альбомы з маркамі. Разгледзеў — рэдкая калекцыя нямецкіх марак і... альбом Андрэйкі.

У кухні гарэў свет. Я распрануўся ў сенях, папажыў альбомы на лаву і ціха зайшоў. Маці падняла на мяне заплаканыя вочы, а тата строга запытаў:

— Дзе Павел?

Мама сказала:

— Лёнька, мы ўсё ведаем...

Бацька перабіў яе:

— Маўчы, маці! — і звярнуўся да мяне: — А ты што, фрыцам служыць надумаўся? Дык я цябе адвучу раз і назаўсёды! Ці ж гэта мой сын?! Здраднік! Памятай: такое не забываюць! А цяпер маліся!

Я стаў перад іконай на калені і прачытаў малітву, моцна блытаючы словы.

— Хопіць! — сказаў бацька. — Ідзём.

Маці загаласіла. Бацька цыкнуў на яе, мы апрануліся і пайшлі ў самы дальні куток сада. Я прытуліўся да плота, бацька прыцэліўся... і раптам маці павісла ў яго на руцэ.

— Што ты робіш, кат?! Што ты робіш?!

Куля прабіла мне нагу.

Два тыдні я праляжаў у гарачцы.

Бацька пайшоў у партызаны і не вярнуўся.

Ля дарогі, якая вядзе ў Кіеў, новенькі абеліск, пафарбаваны ў белы колер, з чырвонай зорачкай наверсе. Шмат на ім знаёмых прозвішчаў, але Паўла Цыганка няма. Я знайшоў вялізны валун, пафарбаваў яго чырвонай фарбай і на самаробным абеліску праўдзіва пераказаў гэтую гісторыю.

Не рабіце так, людзі! Нават альбом самых рэдкіх марак не каштуе чалавечага жыцця!

Анастасія ЧЫСТАЯ 6-а клас вучаніца Вілейскай гімназіі №1 "Логас"

Ці варта наводзіць цень,

або Некалькі слоў у адказ незадаволенаму

Галоўнаму рэдактару газеты "Літаратура і мастацтва" Казлову А.С.

Паважаны Анатоль Сяргеевіч!

У газеце "Літаратура і мастацтва" ад 2 красавіка 2004 г. быў змешчаны артыкул Э. Р. Іофе "Летапіс айчыннай гісторыі і літаратуры", у якім аўтар выказвае незадаволенасць некаторымі артыкуламі "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі". Лічым, што крытыка Э.Р. Іофе неабгрунтаваная. Таму просім змясціць у газеце іншую думку.

Галоўны рэдактар Г. П. Пашкоў.

У лістападзе 2003 г. пабачыў свет апошні том «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі». Завершаны важнейшы дзяржаўны праект. Гэта — унікальная з'ява ў гісторыі культуры Беларусі, таму што такога выдання ў наш час не мае ніводная краіна на постсавецкай прасторы. Гэта выданне атрымала добрыя водгукі ў перыядычным друку, у навуковых выданнях. Здаецца, можна ганарыцца тым, што гэта цікавая энцыклапедыя выйшла у нас, радавацца, што энцыклапедыя ахоплівае такі вялікі спектр фактаў, постацей і падзей, тлумачыць важныя з'явы і працэсы, закрывае белыя плямы ў беларускай гістарыяграфіі. «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» стваралася ў складаны час пабудовы новага грамадства, гэта не магло не паўплываць на выданне, верагодна, што ёсць пытанні, якія не да канца растлумачаны, не ўсе акцэнты і кропкі пастаўлены. Складальнікі, стваральнікі энцыклапедыі — больш як 500 яе аўтараў, вядучых вучоных-гісторыкаў Беларусі з павагай, з цікавасцю ставяцца да заўваг чытачоў, да справядлівай, аб'ектыўнай крытыкі ў свой бок, бо гэта дапамагае ісці наперад, шукаць шляхі ўдасканалення. Але ёсць крытыка — аб'ектыўная, навуковая, дакладна абгрунтаваная, а ёсць «крытыканы» і «крытыканства». На гэту з'яву можна было б і не звяртаць увагі, але настойлівасць крытыка патрабуе сказаць некалькі слоў — не ў апраўданне, не, а каб растлумачыць пазіцыю выдавецтва, якое мае вельмі вялікі, грунтоўны вопыт стварэння энцыклапедычных выданняў, свае каноны і прынцыпы, свае метадычныя патрабаванні. Яны ўсе дасканала выконваліся пры падрыхтоўцы і стварэнні ЭГБ. Вельмі шкада, што паважаны Э.Р.Іофе не зразумеў энцыклапедычных патрабаванняў і прынцыпаў і ў сваім артыкуле «Летапіс айчыннай гісторыі і літаратуры» сам фактычна падзяліў усіх беларускіх гісторыкаў на некалькі катэгорый. Ці варта было гэта рабіць? Здаецца зразумелым, што ўсе гісторыкі, як і ўвогуле ўсе прадстаўнікі роду чалавечага, вельмі розныя і немагчыма і, верагодна, непатрэбна рабіць усіх аднолькавымі. Адзін доктар навук, другі — кандыдат, у аднаго — 2 манаграфіі, у другога — 15 артыкулаў, адзін усё жыццё працаваў на адным месцы, другі — змяніў 10 месцаў працы. Таму энцыклапедыя ставіла за мэту не зрабіць усіх аднолькавымі, а даць аб'ектыўную інфармацыю, што рыхтавалася на падставе анкет,іхдавалі самі гісторыкі, якія таксама ставяцца да сваіх біяграфій парознаму. А што казаць пра партрэты — адзін вельмі хоча і нават патрабуе, каб матэрыял пра яго змясцілі з партрэтам, а другі не хоча ніякага партрэта прынцыпова. Некаторыя гісторыкі ўвогуле не трапілі ў выданне, таму што вельмі гэтага не хацелі і проста настойвалі, каб ніякай інфармацыі пра іх у ЭГБ не давалі. Вось вам і катэгорыі. Некаторыя, наадварот, замест невялікага энцыклапедычнага артыкула патрабавалі змясціць у энцыклапедыі ўвесь спіс сваіх навуковых прац і падрабязнейшую аўтабіяграфію, пачынаючы з ранняга дзяцінства. Вось вам і падыходы!

Што тычыцца зместу артыкулаў, змешчаных у «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі», то да яго таксама можна падыходзіць парознаму. І ў кожнага можа быць на гэты конт сваё меркаванне. Тое ж самае і да памераў артыкулаў — перабольшваць іх нельга, і тыя аўтары, якія стала супрацоўнічаюць з выдавецтвам «Беларуская энцыклапедыя», добра ведаюць, што напісаць артыкул у газету і часопіс ці ў энцыклапедыю — гэта справы зусім розныя, больш таго, прынцыпова розныя. Можна зразумець паважанага Э.Р.Іофе, калі ён лічыць, што не ўся цікавая інфармацыя пра тыя ці іншыя падзеі, персаналіі, была змешчана ў ЭГБ. У якасці прыкладу можна прывесці артыкул аб яўрэях як нацыянальнай меншасці, якая стала на працягу стагоддзяў жыве на тэрыторыі Беларусі побач з беларусамі, рускімі, украінцамі і інш., аўтарам якога з'яўляецца Э.Р. Іофе. Першапачаткова выдавецтвам быў запланаваны артыкул памерам у 3 тыс. знакаў. Аўтар прынёс у выдавецтва тэкст на 20 старонках памерам амаль 40 000 знакаў, таму на пасяджэнні рэдакцыйнай калегіі было прынята рашэнне скараціць артыкул да адпаведных памераў. У выніку атрымаўся артыкул памерам 10 000 знакаў, у тры разы з лішкам большы, чым запланавана. Для энцыклапедычнага выдання гэта нармальны, дастатковы памер. Колькасць яўрэяў — Герояў Савецкага Саюза сапраўды прапаноўвалася аўтарам для ўключэння ў артыкул «Яўрэі». Але ж у ранейшых артыкулах пра народы Беларусі, у тым ліку пра тытульную нацыю «Беларусы», такія лічбы не даваліся і рэдакцыі, згадзіцеся, не варта было парушаць агульны парадак. Не ўвайшлі ў артыкул і звесткі пра колькасць людзей — кандыдатаў і дактароў навук, лаўрэатаў прэстыжных прэмій і г.д. У цэлым над артыкулам «Яўрэі», як і над іншымі артыкуламі, была праведзена вялікая рэдактарская работа, было атрымана 11 рэцэнзій, у тым ліку з Ізраіля, што дазволіла ўдакладніць спрэчныя моманты і выправіць факталагічныя недакладнасці аўтарскага тэксту. Канчатковы варыянт артыкула адлюстроўвае найбольш сучасны ўзровень ведаў па гэтай тэме. Увогуле ж Э.Р.Іофе няма ніякіх падстаў скардзіцца на тое, што выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя», яго кіраўніцтва і рэдакцыйная калегія, якія так не падабаюцца Эмануілу Рыгоравічу, абыходзіць тэматыку, звязаную з яўрэйскай нацыянальнай меншасцю ў Беларусі. Можна пералічыць цэлы шэраг складаных, грунтоўных артыкулаў, якія змешчаны на старонках «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі».

«Аб'яднаная яўрэйская сацыялістычная рабочая партыя», «Антысемітызм», «Аршанскі сацыял-дэмакратычны камітэт Бунда», «Бабруйскі сацыял-дэмакратычны камітэт Бунда», «Бунд», «Віцебскі сацыял-дэмакратычны камітэт Бунда», «Гомельскі сацыял-дэмакратычны камітэт Бунда», «Горацкая арганізацыя Бунда», «Гродзенскі сацыял-дэмакратычны камітэт Бунда», «Іудаізм», «Магілёўскі сацыял-дэмакратычны камітэт Бунда», «Мінская яўрэйская сацыял-дэмакратычная група», «Мінскі сацыял-дэмакратычны камітэт Бунда», «Мяжа яўрэйскай аселасці», «Паалей Цыён», «Сінагога», «Сіянізм», «Талмуд», «Хасідызм», «Хедар» і шмат іншых.

Э.Р.Іофе сцвярджае, што ніякай крытыкі не вытрымлівае артыкул «Халакост», змешчаны ў «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі», і выказвае сваё меркаванне на гэты конт. Неабходна даць пэўныя тлумачэнні, каб у чытачоў сапраўды не зрабілася ўражанне, што «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» робіць «спробу замоўчвання Халакосту на беларускай зямлі». Трэба ўважліва прачытаць гэты артыкул, паглядзець, што ж сапраўды там напісана! У артыкуле памерам 1000 знакаў дадзены 3 значэнні гэтага тэрміну, якія ніводны дасведчаны чалавек аспрэчваць не будзе. У ліку гэтых значэнняў тэрмін «Халакост» падаецца як сінонім генацыду /генацыд дадзены пад курсівам, таму тым, хто знаёмы з правіламі карыстання экцыклапедычнай літаратурай, вядома, што ў энцыклапедыі ёсць такі артыкул, да якога і адсылаецца чытач/. Сапраўды, тэрмін «Генацыд» раскрываецца ў асобным артыкуле /глядзі ЭГБ, том 2, с. 505/. Важнымі для раскрыцця гэтага тэрміну з'яўляюцца артыкулы «Гета», «Лагеры смерці», «Акупацыйны рэжым», «Антысемітызм». Другое значэнне тэрміну «Халакост», дадзенае ў ЭГБ, гэта тое, што «ў другой палове XX ст. у гістарыяграфіі, асабліва яўрэйскай, тэрмін Халакост стаў ужывацца для абазначэння сістэматычнага праследавання і знішчэння яўрэяў нацыстамі і іх памагатымі ў Германіі і на захопленых ёй тэрыторыях у час Другой сусветнай вайны». Здаецца відавочным, што тэрыторыя Беларусі 3 гады была акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі, і таму гэты сказ мае да Беларусі непасрэднае дачыненне. Пры падрыхтоўцы артыкулаў «Яўрэі» і «Халакост» вострым было пытанне пра колькасць яўрэяў, загінуўшых на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Э.Р.Іофе прапаноўваў лічбы ў 1 млн. ці 900 тысяч чалавек. Але гэтыя лічбы завышаны і недаказаны. Гэта прыблізная аўтарская ацэнка па ўскосных звестках, якія не пацвярджаюцца дакументальнымі крыніцамі. Таму сцвярджаць гэта ў энцыклапедыі было б неабгрунтавана. У беларускай і замежнай гістарыяграфіі існуюць розныя лічбы ў розных аўтараў — ад 300 да 600 тысяч чалавек. Адзінай і даказанай, бясспрэчнай думкі тут пакуль што няма. Магчыма, яна з'явіцца ў будучым і тады будзе ўключана ў энцыклапедычныя выданні.

Пры вялікім жаданні ў любым выданні можна назбіраць шмат недахопаў. Але патрэбна, каб асабістыя крыўды і непаразуменні не ўмешваліся ў аб'ектыўнасць заўваг і крытычных прапаноў. І тое, напрыклад, што ў біяграфіі да артыкула «У.І.Пічэта» не прыведзены аўтары кнігі "Академик В.И.Пичета", "Страницы жизни" /Минск, 1981/, у ліку якіх і паважаны Э.Р.Іофэ, не ўплывае на дакладнасць гэтага артыкула. Гэта зроблена ў адпаведнасці з бібліяграфічнымі патрабаваннямі, прынятымі ў энцыклапедыі.

Цікавасць уяўляе заўвага Э.Р.Іофе наконт таго, што праблемы беларускага краязнаўства недастаткова поўна прадстаўлены на старонках «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі», хоць і лічыць агульны артыкул «Краязнаўства» ўзорным /гл. ЭГБ, том 4, с. 257—260/. Можна ўсё ж такі сцвярджаць, што праблемы беларускага краязнаўства прадстаўлены ў ЭГБ дастаткова поўна і на належным навуковым узроўні. Пра гэта сведчыць, напрыклад, тое, што на падставе ЭГБ студэнты нашых ВНУ, у тым ліку БДУ і Беларускага універсітэта культуры, пісалі курсавыя работы па тэме «Пытанні беларускага краязнаўства ў Энцыклапедыі гісторыі Беларусі», і матэрыялаў для напісання работ было дастаткова. Можна пагадзіцца з тым, што па некаторых пытаннях развіцця краязнаўчага руху на Беларусі ў ЭГБ хацелася б бачыць больш матэрыялаў. Але гэта таму, што краязнаўства — даволі шырокае паняцце: ёсць і экалагічнае, і геаграфічнае, і прыродазнаўчае, і культуралагічнае і інш., што не ўпісваецца ў гістарычную энцыклапедыю. Нам патрэбна «Беларуская краязнаўчая энцыклапедыі», настаў час яе зрабіць, выкарыстаўшы пры гэтым набыткі і напрацоўкі «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі». Выдавецтва «Беларуская энцыклапедыі» зараз працуе ў гэтым накірунку. І, здаецца, варта было б паважаным рэцэнзентам не крытыкаваць «Энцыклапедыю гісторыі Беларусі» за тое, што не ўсе краязнаўчыя пытанні ў ёй адлюстраваны, а выступіць са сваімі прапановамі і дапамогай у стварэнні новага каштоўнага для Беларусі выдання.

Ну і некалькі слоў на заключэнне! Сапраўды, зроблена надзвычай важная, карысная справа, завершана унікальнае выданне. Тут, у нас і менавіта ў нашы часы. Спадзявацца на тое, што праз гадоў 30 выйдзе новае выданне, якое «вывядзе ЭГБ на яшчэ вышэйшы ўзровень», канечне, можна. Але тады прыйдзе новае пакаленне гісторыкаў і выдаўцоў, увогуле энцыклапедыстаў, якое зробіць сваё, новае выданне. Гэта, напэўна, будзе іншае выданне. А мы — тут і зараз адказваем за тую «Энцыклапедыю гісторыі Беларусі», якая паводле меркавання вельмі многіх нашых чытачоў і рэцэнзентаў — надзейная цаглінка ў справе ўсталявання беларускай дзяржаўнасці, фундаментальная праца, запатрабаваная навукоўцамі, студэнтамі, школьнікамі, увогуле, усімі, хто цікавіцца багаццем і разнастайнасцю гісторыі беларускага народа. За іншае выданне будуць адказваць ужо нашы дзеці і ўнукі.

Фота Я. Запужнага

Ларыса ЯЗЫКОВІЧ
кандыдат гістарычных навук,
загадчык рэдакцыі гісторыі, філасофіі, эканомікі і права выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі».

Вяртанне да традыцый

У сценах Уздзенскага гісторыка-краязнаўчага музея адбылася сустрэча-канферэнцыя мясцовых краязнаўцаў і творчага актыву раёна з прадстаўнікамі інтэлігенцыі сталіцы, царквы і грамадскіх арганізацый. Яна прысвячалася вызначэнню шляхоў рэалізацыі зацверджанай 22 сакавіка гг. змястоўнай і ўсебаковай Праграмы супрацоўніцтва Міністэрства культуры РБ і Беларускай Праваслаўнай Царквы ў галіне культуры і творчай дзейнасці, аховы, аднаўлення і развіцця гістарычнай і культурнай спадчыны.

Адразу ж адзначым, што гэта Праграма не ўтрымлівае тэндэнцыйнай аднабаковай рэлігійнай арыентацыі. Да яе, па сутнасці, без перапрацоўкі могуць далучацца і іншыя традыцыйныя рэлігійныя канфесіі. Яна ім не супярэчыць. Асаблівасцю і адметнасцю нашага часу вылучаецца ўсё ўзрастаючая ўвага шырокіх колаў грамадства да царкоўнай гісторыі. Можна нават сцвярджаць, што з яе пачынаецца ўсялякая іншая гісторыя. Са святыняў і праверaных часам традыцый пачынаецца ісцінная культура, на іх яна і трымаецца.

Сустрэча пачалася з набажэнства ў мясцовай св.Петра-Паўлаўскай царкве ў імя свяшчэнапакутнікаў Праваслаўнай Царквы і пакінуўшых ужо нас даследчыкаў царкоўнай гісторыі на заходнерускіх землях. Па даручэнні мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта на магілу забітага ў 1935 годзе новапакутніка протаіерэя мясцовай царквы Міхаіла Навіцкага былі ўскладзены кветкі.

На афіцыйнай частцы канферэнцыі адзначалася, што ў апошні час на месцах набірае сілу краязнаўчы рух з шырокім удзелам прадстаўнікоў старэйшага пакалення, моладзі, школьнікаў, творчага асяродка сельскай інтэлігенцыі. Выступоўцы з Мінска, з Узды адзначалі гэту тэндэнцыю як характэрную для Беларусі. Есць абнадзейваючыя прыкметы творчай пошукавай працы не толькі на Міншчыне, але і на Гарадзеншчыне, Брэстчыне і ў іншых месцах. Са змястоўнай прамовай да ўдзельнікаў канферэнцыі звярнуўся доктар гістарычных навук прафесар Л. Лыч.

Вядома, што сур'ёзнае гістарычнае і культурнае аднаўленне асабліва дзейсна праяўляецца пасля значных грамадскіх узрухаў. Так было ў 20-х і 50-х гадах мінулага стагоддзя, так, здаецца, адбываецца і зараз.

У зале музея можна было пабачыць дакументы і службовыя царкоўныя кнігі, што належалі новапакутніку протаіерэю Міхаілу, выстаўляліся фондавыя абразы, перавыдадзеныя ў апошні час даведнікі, кнігі па царкоўнай гісторыі, творы хрысціянскай скіраванасці. Адбываецца кампетэнтнае вяртанне даследчыкаў да царкоўных прац нашых папярэднікаў: У. Завітневіча, В. Бяднова, протаіерэя П. Янкоўскага і інш. У іх творах, акрамя ўсяго, узвышаецца мілая сэрцу кожнага беларуса патрыярхальная адвечнасць, хаваецца і адказ на пытанне пра вытокі нашай незвычайнай стойкасці да жыццёвых выпрабаванняў.

На сустрэчы была прэзентавана толькі што выдадзеная апошняя праца пісьменніка Алеся Махнача — нарыс пра родную вёску Забалацце.

Удзельнікі сустрэчы наведалі запаветныя гістарычныя і культурныя мясціны Уздзеншчыны. Іх, дзякуй Богу, тут хапае. Выток Нёмана, месцы былых сядзіб Булгарыных, Кавячынскіх-Завішаў-Магдаліны Радзівіл, Наркевічаў-Ёдкаў... Гаварылася пра іх прывядзенне ў парадак і ўключэнне ў турысцкія маршруты, пра неабходнасць далейшай распрацоўкі мясцовай гістарычнай спадчыны.

Уладзімір КІСЯЛЁЎ

Кніжны фестываль аб'ядноўвае дзяцей

Нядаўні ўсерасійскі фестываль кніг для дзяцей і юнацтва меў такі рэзананс, што Расійскі кніжны саюз выступіў з ініцыятывай падобны фестываль праводзіць штогод. Аднак і гэта не ўсё. Мерапрыемствы "свята дзіцячай кнігі" ў рамках фестывалю-2004 працягнуцца па рэгіёнах аж да кастрычніка. Пасля чаго арганізатары падвядуць вынікі, дазнаўшыся: хто ж насамрэч з літаратурных герояў — самы любімы ў дзяцей і падлеткаў.

"Для нас галоўнае — скіраваць намаганні на прапаганду чытання, асабліва сярод маладога пакалення", — сказаў выканаўчы дырэктар Расійскага кніжнага саюза Генадзь Рудакоў. Ён выказаў меркаванне, што надалей фестываль стане пляцоўкай, на якой пачнуць раскрывацца новыя кніжныя праекты, у тым ліку і міжнародныя. Дзякуючы мерапрыемствам такога плана адбываецца яднанне пісьменнікаў і аматараў іх творчасці, адраджаюцца традыцыі сямейнага чытання, выхоўваецца пакаленне таленавітых чытачоў.

Дарэчы, фестываль стаўся першай спробай адрадзіць "дзіцячую кніжную прастору" на тэрыторыі СНД. Не ведаю, ці ішла размова пра тое, каб праводзіць фестывалі на тэрыторыі розных краін ці толькі ў Маскве і расійскіх рэгіёнах. Аднак тут ёсць ініцыятыва і для нашых, айчынных выдаўцоў. Даўно ліцца, што на Беларусі магутная база кнігавыдання, цудоўныя мастакі-графікі, ды і кніжкі, у большасці сваёй дзіцячыя, атрымліваюць дыпломы на прэстыжных міжнародных выставах-кірмашах. Дык што, — расійскі фестываль кніг для дзяцей і юнацтва — у госці да нас? Ці знойдзецца нейкая іншая форма для "кніжнага супрацоўніцтва"?..Так ці інакш, але беларускія выдаўцы — чаканыя госці на любым кніжным форуме.

Акцыю падтрымалі не толькі тыя, хто мае непасрэднае дачыненне да яе правядзення, але і палітыкі, грамадскія дзеячы, прадпрымальнікі, а таксама творчы саюз — Міжнародны дабрачынны фонд Уладзіміра Співакова.

ВКа

Мікола Кусянкоў

Смерць людзей не выбірае, хіба толькі ў глыбокай старасці, калі чалавечы век дажываецца дарэшты...

Ва ўсіх астатніх выпадках яна проста знаходзіць нас, каб вызваліць ад невыносных пакут ушчэнт разладжанага і зболенага жыцця. Для сапраўднага мастака смерць як фатум, як вартасная пазнака яго творчага жыцця. Лічыцца, што найталенавіцейшыя паэты паміраюць (найчасцей гінуць) маладымі, у самым росквіце свайго таленту. А масцітыя пісьменнікі паміраюць у пашанотным веку — самавіта і праведна, па-хрысціянску.

Усё так і не гэтак. Бо і самі творцы — і такія і гэтакія...

Мікола Кусянкоў не ўкладаецца ні ў адзін з гэтых канонаў: жыў, як паэт, памёр, як празаік... 69 гадоў — нажыгак не такі і малы. Тым больш для сённяшняга часу. А калі да гэтага самавітага жыцця яшчэ прыкласці і важкі літаратурны плён пісьменніка, то ў выніку нашчадкам пакідаецца годны ўзор чалавечай бытнасці пад Небам на Зямлі...

Нарадзіўся Мікола Сяргеевіч на Добрушчыне ў вёсцы Перарост 11 лютага 1935 года. З цяжкіх сямейных прычын выхоўваўся і жыў у дзеда з бабай у вёсцы Кругавец-Калініна, якую і лічыў сваёй малой радзімай. Там жа скончыў сямігодку. А пасля — Буда-Кашалёўскі лясны тэхнікум. Працаваў у лясных гаспадарках Калінінградскай і Гомельскай абласцей, а таксама ў Сібіры. У 1971 годзе скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы пры СП СССР. З гэтага часу і пачалося яго актыўнае літаратурнае жыццё. Працуючы ў газеце "Гомельская праўда", на кінастудыі "Беларусьфільм", у часопісе "Полымя" і выдавецтве "Мастацкая літаратура" на розных, у тым ліку і кіраўнічых, пасадах, Мікола Сяргеевіч паралельна нарошчваў і свой уласны літаратурны набытак. Выходзілі ў свет зборнікі вершаў "Жывіца", "Без прывалу", "Дуброва" (у 1991 годзе адзначаны Літаратурнай прэміяй СП Беларусі). Класічна-традыцыйны стыль паэтычнага пісьма як найлепш спрыяў і першым заўважным парасткам яго прозы. Кніжка "Завязь" з'явілася на кніжных прылаўках у 1987 годзе. Паколькі якраз на гэтым этапе вонкавыя літаратурбацыі нашага грамадскага жыцця пачалі скажаць устойлівыя праявы ўнутранага чалавечага жыцця, то пратэстная проза, заснаваная на духоўным нацыянальным вопыце, паступова і канчаткова выцясніла адметны лірычны голас паэта на ўзбочыну яго грунтоўных літаратурных пошукаў. Былі напісаныя і выдрукаваныя такія аб'ёмныя і псіхалагічнаёмкія мастацкія творы, як раманы "Явар з калінаю" ды "Арляк і зязюля", у якіх пісьменнік паспрабаваў выявіць драматычную цэласнасць людскога жыцця мастацкім метадам, не скажоным пафаснай ідэалагічнай дэкларатыўнасцю і штучнай касмапалітычнай метафарай...

А пра тое, што ў згаданых творах пісьменніку шмат што з задуманага ўдалося спраўдзіць, гаворыць факт прысуджэння яму Дзяржаўнай прэміі імя Якуба Коласа за ўпомненыя раманы (дылогію) у 2000 годзе. Між іншым, у тым жа годзе дылогія падоўжылася да трылогіі чарговым раманам Міколы Кусянкова "Хмель каля вольхі" выдрукаваным у часопісе "Полымя"...

Што засталося няспраўджаным з мастацкіх задум вядомага пісьменніка, цяпер ведае адзін Бог. Нам жа трэба засвоіць створанае Міколам Кусянковым. Засвоіць, ацаніць і не пусціць на вецер. Нашчадкам у яго ёсць што пераняць, у тым ліку літаратурнае майстэрства, сумленнасць і любоў да сваёй Айчыны.

Бывайце, Мікола Сергеевіч. Пухам вам родная зямля.

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і мастацтва"

Ён не знік — засталіся творы

Не стала Міколы Сяргеевіча Кусянкова. На дасвецці 22 чэрвеня, у тыя самыя хвіліны, калі шэсцьдзесят тры гады назад скаланула абсягі Бацькаўшчыны грымотнае водгулле крыважэрнай фашысцкай навалы, перастала біцца сэрца Чалавека і Майстра. Смерць сурова і бязлітасна, як і ў леташнюю скрушную дату Васіля Быкава, забрала пісьменніка назаўсёды, узнёсшы свой чорны крыж у гадавіну пачатку ўсенароднай трагедыі, як бы пацвердзіўшы тым, што сэрца сапраўднага пісьменніка заўжды на яе прыцэле...

Асновай яго жыццёвага лёсу стаў клопат пра наш беларускі лес. Ён нарадзіўся пад пахай зеленачубага бору ў добрушскай вёсачцы Перарост, многае ў жыцці паспрабаваўшы як бы на выраст: і гаркавы прысмак першых дзіцячых слёз у часы ваеннай і пасляваеннай бясхлебіцы, і неўтаймаваныя росшукі юнацкай будучыні, дзе выпрабоўваў сябе на абсягах сібірскай тайгі. Літаратурны дар, які непакоіў паўсюдна жаданнем творчага выяўлення, ужо досыць запознена, на пачатку сямідзесятых, прывёў у Маскву на Вышэйшыя літаратурныя курсы.

Ад першага паэтычнага зборніка "Жывіца", выдадзенага ў 1966-м, да дасканала завершанай празаічнай трылогіі, першыя два раманы з якой ("Явар з калінай" і "Арляк і зязюля") адзначаны Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь імя Якуба Коласа ў 2000-м, мінулі тры дзесяцігоддзі немітуслівай пісьменніцкай працы, усцешыўшай мастацкай выразнасцю запатрабаванні самай сур'ёзнай крытыкі і густ самага пранікнёнага чытача.

Напрыканцы 2002 года часопіс "Полымя" апублікаваў працяг хронікі лёсаў сям'і Гаркушаў – раман "Хмель каля вольхі". У сценах рэдакцыі, дзе Мікола Сяргеевіч да свайго пераходу на кіраўнічую пасаду ў выдавецтва "Мастацкая літаратура" працаваў у аддзеле прозы, гучалі ўсхваляваныя абяцанні-спадзеўкі здзейсніць задуманае – напісаць свой новы раман з уласна перажытага. Думалася, што плённа доўжыцца якраз гэтая праца. Аднак жорсткая хвароба распарадзілася інакш. І ён, знясілены ад пакут, у гойныя хвіліны адхлання, зноўку знаходзіў сілы, каб дыктаваць унуку Валодзю старонкі апошняй аповесці... Яго лебядзіную песню неўзабаве змогуць прачуць сэрцам чытачы часопіса "Полымя".

На пагоркавых каладзішчанскіх могілках, што ў атачэнні хвой і бяроз, мы развіталіся з Майстрам. Жмені прапаленага сонцам жвіру ўпалі на густа- зялёнае века труны... Сэрцы родных і сяброў сціснуліся ад хвалявання і болю... Нязгодная з жахотаю смерці думка ценька вяла сваё: сапраўдны пісьменнік знікае не ўвесь, застаюцца творы – яго духоўная прысутнасць сярод жывых.

Упэўнены, дарагі Мікола Сяргеевіч, што твая духоўная прысутнасць пад нябёсамі Бацькаўшчыны будзе неабвержна доўгай.

Мікола МЯТЛІЦКІ

Жывіца — сляза

Паважаны Мікола Сяргеевіч... Колькі разоў я звяртаўся гэтак пачціва да ЯГО... Працуючы ў выдавецтве "Юнацтва", я часта спускаўся са свайго 11 паверха Дома кнігі на 9, дзе з самага пачатку месціцца "Мастацкая літаратура". Там працавала нямала выдатных людзей. Сярод іх — Мікола Кусянкоў. Ён быў спачатку загадчыкам рэдакцыі прозы, потым — галоўным рэдактарам. З ім можна было сустрэцца на калідоры, павітацца. Хоць ён быў не надта гаваркі, але заўсёды нешта мог спытаць...

Я рыхтаваўся ўступаць у Саюз пісьменнікаў. Не хапала адной рэкамендацыі. Падумаў: а што калі папрасіць у Міколы Кусянкова? Мне вельмі імпанавала яго лірыка. А першы зборнік "Жывіца" літаральна запаланіў. Незвычайная назва. Змест насычаны густым лясным водарам. Я ведаў, што Мікола Сяргеевіч доўгі час працаваў у лясной гаспадарцы. Адсюль была і яго "жывічная" паэзія. Мікола Сяргеевіч адразу згадзіўся даць мне рэкамендацыю. Назаўтра я трымаў яе ў руках. Не чакаў, што пісьменнік, які быў пры сур'ёзнай пасадзе, так хутка напіша. Аб чым гэта казала? Што ён вельмі адказна адносіўся да ўсяго. Чалавек слова. Даў яго — выканай! Ён быў добрым, мяккім, але у той жа час і прынцыповым. У гэтым сэнсе можна было б прыводзіць прыклады падчас яго працы і галоўным рэдактарам, і потым, калі ўзначаліў рэдакцыю гісторыка-дакументальных хронік "Памяць".Ён карпатліва працаваў як на службе, так і за сваім пісьмовым сталом. Здзіўляючая была працаздольнасць! Я ніколі не бачыў яго ў расслабленым стане. Бывала, заходзіў у выдавецкі пакой — нікога няма, а Мікола Сяргеевіч, не адрываючыся, сядзіць за рукапісамі хронік. І ўсё ж творчасць для яго была важней за ўсё. Я ведаю, як ён пісаў свае раманы "Явар з калінаю", "Арляк і зязюля", за якія атрымаў Дзяржаўную прэмію. Штодзённа, вечарамі, начамі..

Шмат я мог бы называць кніг пісьменніка. Але зноў і зноў паўстае перада мной "Жывіца". Жывіца — тая ж сляза, якую пускае сасна.

Сёння яна, як і мы, у жалобе. Не стала яе песняра.

Не высахне твая крыніца.
Яна з глыбінь лясных бруіцца,
Нібы з сасны сама жывіца...

Яўген ХВАЛЕЙ

Грамадскае аб'яднанне "Мінская пісьменніцкая арганізацыя" смуткуе з прычыны смерці пісьменніка КУСЯНКОВА Міколы Сяргеевіча і выказвае глыбокае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

Рэдакцыя часопіса "Полымя" выказвае глыбокае спачуванне родным і блізкім лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, былога супрацоўніка часопіса, пісьменніка Міколы Сяргеевіча КУСЯНКОВА.

Рэдакцыя часопіса "Маладосць" глыбока смуткуе з прычыны заўчаснай смерці беларускага пісьменніка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі імя Якуба Коласа Міколы Сяргеевіча КУСЯНКОВА і выказвае шчырае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

Рэдакцыя штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва" выказвае глыбокае спачуванне родным і блізкім Міколы Сяргеевіча КУСЯНКОВА з прычыны яго заўчаснай смерці.

Выдавецтва "Мастацкая літаратура" смуткуе з прычыны смерці былога галоўнага рэдактара КУСЯНКОВА Мікалая Сяргеевіча і выказвае глыбокае спачуванне родным нябожчыка.

Рэдакцыя часопіса "Нёман" выказвае глыбокае спачуванне галоўнаму рэдактару Ніне Чайцы з прычыны смерці яе маці.

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва" выказвае глыбокае спачуванне галоўнаму рэдактару часопіса "Нёман" Ніне Чайцы з прычыны смерці яе маці.

Фоталетапіс пісьменніцкага братэрства

Прыемна, што заклік Уладзіміра Ліпскага стварыць фоталетапісу пісьменніцкага братэрства заўважылі многія творцы. У рэдакцыю даслалі лісты з малавядомымі здымкамі, некаторыя з якіх нідзе не друкаваліся, Віктар Карамазаў, Пятро Прыходзька і Сяргей Панізнік.

Вось што расказаў Сяргей Сцяпанавіч пра гісторыю вышэй надрукаванага здымка, і пра тых, хто зазняты: "Калі я працаваў у рэдакцыі літаратурна-драматычных праграм (была такая!) Беларускага тэлебачання, то пасля кожнай перадачы знаходзіў на пюпітрах перад камерамі выкарыстаныя здымкі (часам трапляліся і арыгінальныя фота). Складаў пасляэфірныя знаходкі ў папку. Архіў папаўняўся і ў выдавецтве "Юнацтва", калі складаліся зборнікі гістарычнай літаратуры "Бацькаўшчына".

Дасылаю ў рэдакцыю "ЛіМа" здымак, пазначаны датай 17. VI. 47 г. Подпіс на ім такі: "Нарада савецкіх пісьменнікаў Беларусі ў Мінску: злева направа В. Каратышэўскі (Пінск), М. Хрысціч (Брэст), М. Гарулёў (Магілёў), М. Ткачоў (Магілёў), І. Шамякін (Гомель), А. Бажко (Баранавічы), Р. Сабаленка (Баранавічы), А. Яблонскі (Маладзечна).

Фота Г. Бугаенкі".

Здымак, як бачна, зроблены ля Дома афіцэраў, калі не было яшчэ на пастаменце танка. Цікава, як пачувалі сябе пасляваенныя ўзлётаўцы ў літаратуру. Можа, падзеляцца сваімі ўражаннямі Іван Пятровіч Шамякін ці Алесь Цімафеевіч Бажко?

А можа, нехта іншы, хто быў сведкам таго часу ці чуў нейкія гісторыі пра нараду пісьменнікаў, пра творцаў раскажа нешта адметнае?

Запрашаем усіх, хто хоча скласці фоталетапіс пісьменніцкага братэрства дасылаць лісты ў рэдакцыю.

Віктар ПАТАПЕНКА

Хведар ЖЫЧКА

Было і такое

Памаладзелы Крапіва

У 1985 годзе мне давялося рэдагаваць двухтомнік выбраных твораў Кандрата Крапівы, запланаваны да яго 90-годдзя. Мастацкім рэдактарам быў прызначаны вопытны Леанід Прагін, які адразу вызначыў, што кнігу трэба выдаваць у супервокладцы, на якую спатрэбіцца арыгінальны фотапартрэт аўтара. Перагледзелі гару фотаздымкаў— усюды Кандрат Кандратавіч быў афіцыйна суровы. Нарэшце трапіўся адзін партрэт з ледзь прыкметнай усмешкай на твары. Яго і вырашылі даць у юбілейную кнігу. Але Прагін адмоўна крутнуў галавой — не тое. Тады прынеслі яму здымак ужо зусім з вясёлым Крапівой, якім рэдка хто і бачыў вядомага сатырыка.

— Тое, што трэба, — ухваліў Прагін.

Так і ўсміхаецца Крапіва з дзвюх — чырвонай і блакітнай — супервокладак двухтомніка. А на адвароце таго фотапартрэта, на якім Кандрат Кандратавіч усміхаецца ледзь-ледзь, я напісаў верш:

"Я помню Крапіву такога,
шчэ параўнальна маладога,
вясёлага і гаваркога.
Пасля здаваўся ён суровым,

маўчаў і толькі хмурыў бровы,
глядзеў з пагардай навакол,
нібы ў ярмо загнаны вол.
Але скажу пры ўсім пры гэтым:
ён быў прыроджаным паэтам,

душа яго была сагрэта
любоўю шчырай да людзей.
Са спачуваннем ён глядзеў
на беды роднага народа".

Я некалькі разоў быў у гасцях у Крапівы на кватэры. Дома быў ён гаваркі і прыветлівы, шмат расказваў, а больш распытваў.

Дбайнік моўнай чысціні

Ад Яна Скрыгана, цікавага пісьменніка і добрага чалавека, у маім архіве засталіся толькі дзве памяткі: напісаная ягонай рукой "Даведка" і машынапісны зварот "Да ўвагі рэдактара". Прыводжу іх:

"Даведка. Пераклад кнігі К. Федзіна "Сустрэча з мінулым" зроблены па выданні: "Конст. Федин. Собрание сочинений в 9 томах. Художественная литература, М. 1959—1962 гг. Тамы I, III, VI. Ян Скрыган».

Да ўвагі рэдактара.

1. Пераклад патрабуе перадруку, але гэта лепш зрабіць пасля рэдактарскага чытання, бо, безумоўна, будуць праўкі і заўвагі.

2. Будуць пападацца машынапісныя памылкі, іх трэба папраўляць без ніякага вагання, бо пасля сябе я іх проста не бачу.

3. Могуць быць лексічныя і стылістычныя асаблівасці, такія, як "наведнік" замест "наведвальнік", або ў "Нараўчанскай хроніцы" стылізаваныя пад царкоўнаславяншчыну некаторыя асаблівасці аўтарскай (перакладчыцкай) мовы, — да ўсяго гэтага варта паставіцца памяркоўна.

4. Будуць часамі парушэнні супраць унармаванасці: напр., напісанне ў родным склоне "твару", "ганку", бо пісаць іх іначай — "твара", "ганка" — у мяне не падымаецца рука, нідзе ж так не гавораць.

З павагай Ян Скрыган. 16. I. 78".

Усе ягоныя пажаданні я, здаецца, выканаў, бо не помню, каб потым былі якія размовы з ім ці сутычкі. З Іванам Аляксеевічам сустракаліся мы заўсёды паважліва і пашанліва.

Іван Аляксеевіч дужа добра ведаў беларускую народную мову. Яшчэ працуючы ў рэдакцыі часопіса "Полымя", ён раіў нам, маладым: "Ды схадзіце вы на Камароўку, паслухайце, як гавораць вясковыя цёткі".

Не мог цярпець ён газетчыны, узаконеных граматыкамі скажэнняў роднай мовы. І ў гэтым перакладзе К. Федзіна, помню, я здзівіўся ягонаму перакладу драўляных шасцяронак млына — "кулакі". Якраз так і гаварылі ў нас, на Жлобіншчыне, калі былі яшчэ ветракі з вялізнымі гэтымі "кулакамі", што ператваралі гарызантальнае вярчэнне ў вертыкальнае — калі вецер быў моцны, яны страшэнна грукталі, і сяляне вохкалі:

— Каб толькі "кулакоў" не патрушчыла...

Я здзіўляўся, як Скрыган змог праз такія цяжкія для яго гады і бясконцыя дарогі па-за межамі Беларусі зберагчы ў сваёй памяці сялянскую гаворку!?

Ян Скрыган быў не з тых, хто любіў пагаманіць у застоллі, жартаваць абы з чаго. Ён заўсёды меў выгляд заклапочанага чалавека, вечна, як кажуць, кудысьці нетаропка спяшаўся. Такім і застаўся ў памяці.

Паплечнік Янкі Маўра

Сярод нас, маладых дзіцячых пісьменнікаў Пятро Рунец быў самы старэйшы, з даваенным стажам (першую кніжку "Юныя змагары" выдаў у 1940 годзе), працаваў у рэдакцыі часопіса "Бярозка", ганарыўся знаёмствам з Янкам Маўрам, з якім яны выдалі кнігу ўспамінаў дзяцей пра вайну "Ніколі не забудзем". І сапраўды было чым ганарыцца — гэтая кніга абляцела ўвесь свет.

Свае ж апавяданні і аповесці Пятро Рунец пісаў цяжка, марудна. Але пісаў, выдаў кніжкі "У веснавыя дні" (1954), "Бярозавы конь" (1956) "Гіпсавая маска" (1958), "Канец казкі" (1960), "Заламаны ражок" (1961), "Вясёлыя здарэнні" (1962), "Белы васілёк" (1971) і іншыя. Апрача "Гіпсавай маскі" ўсе яго кніжкі прайшлі амаль незаўважанымі, аб чым сведчыць складзеная некім эпіграма:

Піша Пеця Рунец
сумнай казкі канец,
ані конь, ані звер,
шэпча нешта аер,
пабялеў васілёк,
заламаўся ражок...

У 1963 годзе мы разам ездзілі ў Гомель для правядзення "Тыдня дзіцячай кнігі", дзе нас і сфатаграфавалі для абласной газеты. Здымак прыслаў мне Міхась Даніленка, зрабіўшы на адвароце такі надпіс: "Паважанаму Хведару Жычку з пажаданнем заўсёды з форсам насіць "Піфагоравы штаны". На памяць аб выступленнях у Гомелі".

Не хапаючы з неба зорак, Пятро Рунец пражыў доўгае і цікавае жыццё. Яго просценькія апавяданні пра дзяцей уключаюцца і будуць уключацца ў падручнікі, тэматычныя і рэпертуарныя зборнікі, календары.

За адным і тым жа сталом

Гэта вельмі рэдкі выпадак, калі чалавек больш за сорак гадоў прасядзеў за адным і тым жа сталом, а дакументы яго сведчылі, что ён увесь час пераходзіць на працу з установы ва ўстанову. З Сяргеем Апанасавічам Міхальчуком якраз так і здарылася.

У 1951 годзе пасля заканчэння БДУ ён быў накіраваны на працу рэдактарам Дзяржаўнага выдавецтва БССР, якое пазней перайменавалі ў "Беларусь". Неўзабаве ад гэтага выдавецтва аддзялілася "Мастацкая літаратура", куды перайшла і рэдакцыя дзіцячай літаратуры, у якой працаваў Міхальчук. Потым і ад выдавецтва "Мастацкая літаратура" адпачкавалася маладзёжнае выдавецтва "Юнацтва", і зноў Сяргей Апанасавіч пацягнуў свой стол з рукапісамі на другі паверх Дома кнігі, а ў працоўнай кніжцы з'явіўся новы запіс: "залічаны на працу ў выдавецтва "Юнацтва". А Міхальчук, як сядзеў, так і сядзіць за сваім сталом. Праўда, ужо не простым рэдактарам, а загадчыкам рэдакцыі, і яму прысвоена ганаровае званне "Заслужаны работнік культуры БССР" (1972).

Гэта быў вельмі працавіты чалавек, сумленны і добразычлівы. Ён не шкадаваў ні сілы, ні часу каб дапамагчы маладым аўтарам давесці рукапіс да ладу, зрабіць з яго кнігу. Дзякуючы яму ў рэспубліцы вырас цэлы атрад дзіцячых пісьменнікаў.

Нядрэнна пісаў і ён сам, выдаў чатыры кніжкі для дзяцей і многа пераклаў твораў рускіх пісьменнікаў, у тым ліку — Гайдара, Жыткова, Біянкі, Варанкову, Панцялеева і інш.

Сяргей Міхальчук рэдагаваў і мае кніжкі, напісаныя для дзяцей, і я шчыра ўдзячны яму за тую патрабавальнасць, з якой ён вучыў мяне шанаваць роднае слова...

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе
ўзнагароджаны ордэнам
Дружбы народаў

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ,
Леанід ГАЛУБОВІЧ,
Наталля ДЗЯНІСАВА,
Віктар КАВАЛЁЎ,
Вольга КУРТАНІЧ,
Віктар ПАТАПЕНКА — намеснік галоўнага рэдактара

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220005, Мінск,
вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
галоўны рэдактар — 284-66-73
намеснік галоўнага рэдактара — 284-66-73

АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 284-79-65
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-81-53
паэзіі, літаратурнага жыцця, крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы — 284-66-73
музыкі, тэатра, кіно і выяўленчага мастацтва — 284-81-53
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

Электронны адрас:
e-mail: minsk@lim.by

Адрас у Інтэрнеце —
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Ф. Скарыны, 79

Індэкс 63856 Наклад 2386
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 30.06.2004 у 11.00

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва"

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 989

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12